*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Е Т А

**4** ВЕРАСНЯ 2008 г. ЧАЦВЕР № 166 (26279)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

По чутках і аўтарытэтна

## Права на зямельныя ўчасткі:

### хто з членаў садаводчых таварыстваў абавязаны яго зарэгістраваць?..

**У гэтае пытанне ўнесла яснасць Міністэрства эканомікі ў сувязі са шматлікімі зваротамі грамадзян — членаў садаводчых таварыстваў.**

Паводле інфармацыі міністэрства, згодна з Указам Прэзідэнта Беларусі ад 27 снежня 2007 года № 667 «Аб выключэнні і прадастаўленні зямельных участкаў» і Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб зямлі, грамадзяне Беларусі маюць права набываць зямельныя ўчасткі ў садаводчых таварыствах у прыватную ўласнасць альбо пажыццёвае наследнае ўладанне ці ў арэнду. Дакументам, які сведчыць права грамадзяніна на зямельны ўчастак, што прадастаўлены для вядзення калектыўнага садаводства, з'яўляецца Дзяржаўны акт на права пажыццёвага наследнага ўладання зямельным участкам альбо на права прыватнай уласнасці на гэты зямельны ўчастак.

Цяпер пытанні рэгістрацыі нерухомай маёмасці, уключаючы зямельныя ўчасткі, рэгламентуюцца Законам Рэспублікі Беларусь ад 22 ліпеня 2002 года «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй». Згодна з артыкулам 38 гэтага Закона, дакументам, які пацвярджае рэгістрацыю права на зямельны ўчастак, з'яўляецца пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі. Разам з тым, падкрэсліваюць у Мінэканомікі, артыкулам 74 гэтага Закона ўстаноўлена, што дзяржаўная рэгістрацыя нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй, што праводзілася ва ўстаноўленым парадку да ўступлення ў сілу Закона, з'яўляецца юрыдычна сапраўднай. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2007 года № 667 таксама прадугледжвае, што дакументы, якія сведчаць права на зямельныя ўчасткі, выдадзеныя да 1 лютага 2006 года, з'яўляюцца сапраўднымі і маюць аднолькавую юрыдычную сілу з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі.

Як вынікае з гэтага, падкрэсліваюць у Мінэканомікі, да праваўстанаўлiваючых дакументаў на зямельныя ўчасткі, якія прадастаўлены грамадзянам для вядзення калектыўнага садаводства, могуць быць аднесены як пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі, так і Дзяржаўны акт, выдадзены раней. «Зыходзячы з вышэйвыкладзеных нормаў заканадаўства, звярнуцца ў адпаведную арганізацыю па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй для дзяржаўнай рэгістрацыі сваіх правоў на зямельныя ўчасткі ў адпаведнасці з пунктам 4 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 студзеня 2008 года № 50 абавязаны тыя грамадзяне, у якіх адсутнічаюць належна аформленыя дакументы на зямельныя ўчасткі — пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі або Дзяржаўны акт, які сведчыць права грамадзяніна на зямельны ўчастак», — адзначаюць у Мінэканомікі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў ваеннаслужачых краіны медалём «За бездакорную службу» I, II, III ступеняў

За ўзорнае выкананне службовых абавязкаў Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў ваеннаслужачых краіны медалём «За бездакорную службу» I, II, III ступеняў. Адпаведны загад Аляксандр Лукашэнка падпісаў 2 верасня.

У прыватнасці, медалём «За бездакорную службу» I ступені адзначаны генерал-маёры Ігар Азаронак і Валерый Хахлоў, палкоўнікі Алег Балоцька, Міхаіл Высоцкі, Валерый Гальянаў, Аляксандр Грыннік, Мікалай Дзімаў, Сяргей Ласоцкі, Ігар Лаўрыненка, Віктар Левашоў, Юрый Лукашоў, Ігар Паўлаў, Пётр Пінчук, Ігар Пінчукоў, Андрэй Чарнышоў, Мікалай Шмуляеў, Аляксандр Шэцкі, Мікалай Юрчанка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ІНВЕСТЫЦЫІ ЯК З РОГА ДАСТАТКУ?

***Прыток замежных фінансавых уліванняў чакаецца з адкрыццём Прадстаўніцтва Міжнароднай фінансавай карпарацыі ў Беларусі***

У цэнтры палітычнага жыцця краіны сёння, зразумела, выбары дэпутатаў новага склікання. Аднак з пачаткам чарговай восеньскай сесіі ў кастрычніку Авальную залу напоўняць дзеючыя дэпутаты. І сёння ў парламенце ідзе іх няспынная праца. Атрыманы ўжо праект бюджэту-2009 — яго разглядаюць ва ўсіх пастаянных камісіях Палаты прадстаўнікоў. Нагул маецца ўжо каля 50 праектаў законаў, па якіх вядзецца актыўная праца.

Вось і на ўчарашнім пасяджэнні камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД разглядаўся шэраг законапраектаў, у тым ліку аб ратыфікацыі пагаднення паміж беларускім Урадам і Міжнароднай фінансавай карпарацыяй (МФК). У адпаведнасці з дакументам будзе адкрыта Прадстаўніцтва гэтай арганізацыі ў нашай краіне. Як адзначыў намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй Тур, які таксама ўзяў удзел у пасяджэнні, для Беларусі гэта знакавая падзея. Паколькі адкрыццё такога прадстаўніцтва будзе садзейнічаць прыцягненню замежных інвестыцый. «Як толькі МФК кудысьці пайшло, там адразу прыбывае інвестыцый. Гэта як зялёны сігнал для міжнародных фінансавых структур», — сказаў А. Тур.

Дагэтуль супрацоўніцтва з карпарацыяй было ў групе, якая ўключала Беларусь і Расію, а значыць фінансавыя сродкі накіроўваліся ў абодва бакі. З ратыфікацыяй пагаднення тыя сродкі, што будзе прыцягваць Прадстаўніцтва МФК, пойдуць выключна ў айчынную эканоміку. Паўплывае гэта і на прывабнасць Беларусі для патэнцыйных інвестараў.

— Адносіны да нас з пункту гледжання работы на беларускім рынку будуць некалькі іншымі, — заўважыў у размове з журналістамі намеснік міністра, — і ў якасці праектаў, і ў якасці кансультацыйнай дапамогі.

Паводле слоў Андрэя Тура, МФК ужо гатова інвеставаць у Беларусь каля 65 млн еўра. Ён адзначыў, што каля 1,5 млн еўра карпарацыя плануе інвеставаць у стварэнне спецыяльнага банка для развіцця малога і сярэдняга бізнэсу на тэрыторыі Беларусі. Асноўным жа донарам стане Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця. Андрэй Тур нагадаў, што для рэгістрацыі банка ў Беларусі неабходны статутны фонд як мінімум у 10 млн еўра. Пытанне аб стварэнні спецыяльнага банка ўжо прапрацоўваецца — адпаведныя дакументы пададзеныя ў Нацбанк.

Падчас пасяджэння неаднаразова агучвалася, што прыняцце пагаднення будзе садзейнічаць развіццю малога і сярэдняга бізнэсу ў Беларусі. Дарэчы, рашэнне пастаяннай камісіі па разгледжаным дакуменце было станоўчым — Палаце прадстаўнікоў рэкамендуецца прыняць гэты законапраект.

**Ала МАЧАЛАВА.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*г. Віцебск.*

## «Цудоўнае выступленне беларускіх спартсменаў на Алімпійскіх гульнях»

Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Лукашэнку паступілі пасланні ад Прэзідэнта Асацыяцыі еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Патрыка Хікі і Ганаровага прэзідэнта Міжнароднага алімпійскага камітэта Хуана Антоніа Самаранча з віншаваннямі ў сувязі з паспяховым выступленнем беларускай каманды на XXIX Алімпійскіх гульнях у Пекіне.

«Ад імя Асацыяцыі еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў (ЕАК) дазвольце мне выказаць Вам шчырую ўдзячнасць за ўсямерную падтрымку Алімпійскага руху і, у прыватнасці, XXIX Алімпіяды ў Пекіне.

ЕАК высока ацэньвае цудоўнае выступленне беларускіх спартсменаў на Алімпійскіх гульнях. Прыміце нашы віншаванні з выдатным вынікам, якога яны дасягнулі і тым самым унеслі значны ўклад у поспех Еўропы», — гаворыцца ў пасланні Патрыка Хікі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЗНЯЛА ПСОТУ, ДОРАГА

**Махляркі забралі ў даверлівай бабруйчанкі 1,5 тысячы еўра, 5 тысяч долараў і 2,9 мільёна беларускіх рублёў.**

2 верасня ў Бабруйску 60-гадовая жанчына пайшла на рынак. Нехта побач паклікаў: «Ала!» І хоць яна не была Алай, цікаўная пенсіянерка азірнулася і ўбачыла жанчыну ўзростам 45—50 гадоў, якая глядзела прама на яе. Слова за слова — завязалася гутарка.

Неўзабаве новая знаёмая паведаміла, што на жанчыне ляжыць страшная псота. Да першай «лекаркі» далучылася яшчэ адна, маладая — гадоў 25. Яны разам запэўнілі, што грошай за свае паслугі не бяруць, але пажадана было б набыць для іх харчы.

Калі просьба была выканана, махляркі паведамілі, што псота, аказваецца, ляжыць пераважна на грошах жанчыны. Каб зняць яе назаўсёды, трэба прынесці самі купюры. І пенсіянерка, нібыта пад гіпнозам, прынесла ўсю валюту, што мела ў доме, а затым зняла з банкаўскага рахунка беларускія рублі.

Усе наяўныя грошы — сабралася прыстойная сума! — паклалі ў цэлафанавы пакет, і над імі доўга і старанна варажылі ды шапталі. А ўжо дома жанчына ўбачыла, што ў пакеце грошай няма...

У міліцыі прынялі заяву, распачалі крымінальную справу, махлярак шукаюць. У прэс-цэнтры Магілёўскага абласнога УУС расказалі, што падобныя выпадкі, асабліва ў Бабруйску, зусім не рэдкасць, і заклікалі людзей быць пільнымі.

**Алена КАЗЛОВА.**

### ВЫРАТАВАЎ НА ПАЖАРЫ ДЗІЦЯ

**У вёсцы Зазер'е 46-гадовы жыхар Лагойска Сяргей Анцітовіч выратаваў на пажары трохгадовае дзіця.**

Мужчына праязджаў па населеным пункце, калі ўбачыў дым і полымя, што выбівалася з-пад даху аднаго з дамоў. Спыніўшыся, ён выклікаў падраздзяленні МНС. Тым часам у адным з пакояў Сяргей заўважыў дзіця. Выбіўшы шкло ў акне, ён выцягнуў яго і дачакаўся прыезду выратавальнікаў. Паводле слоў маці, яна выйшла па ваду і адсутнічала паўгадзіны. Нягледзячы на тое, што сям'ю нельга назваць няўдалай, цяпер разглядаецца пытанне аб прыняцці мераў да бацькоў, якія пакінулі дзіця адно. Асноўная версія прычыны пажару — дзіцячае свавольства з агнём.

Кіраўніцтвам Мінскага абласнога ўпраўлення МНС прынята рашэнне ўзнагародзіць Сяргея Анцітовіча за мужны ўчынак граматай.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### СМЯРОТНАЯ ПАКРЫШКА

**У Віцебскім раёне загінуў 24-гадовы рабочы, які на тэрыторыі прадпрыемства, дзе працаваў, напампоўваў аўтамабільную пакрышку.**

З-за парушэння тэхнікі бяспекі адбыўся разрыў пакрышкі. Хлопец атрымаў шматлікія раненні і загінуў на месцы здарэння. Раённая пракуратура праводзіць праверку.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ВАКАНСІЙ БОЛЬШ У 6 РАЗОЎ

**Попыт наймальнікаў на рабочую сілу ў 6,6 раза перавышае колькасць беспрацоўных мінчан.**

Як паведаміла намеснік начальніка аддзела арганізацыйна-кадравай работы Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Іна Сямёнава, на першае жніўня ў банку даных службы занятасці налічвалася 23,6 тысячы свабодных працоўных месцаў, з іх 19 тысяч — вакансіі для рабочых. Каля 27 працэнтаў усіх вакансій было заяўлена ў службу занятасці прамысловымі прадпрыемствамі, 18 працэнтаў — будаўнічымі арганізацыямі, больш як 11 працэнтаў — арганізацыямі гандлю і грамадскага харчавання. Кожная дзесятая вакансія мае перадумовай нізкакваліфікаваную працу. Дарэчы, у Мінску сканцэнтравана 34 працэнты вакансій, заяўленых па рэспубліцы.

**Надзея ІЛЬЯШУК, «Мінск—Навіны».**

Дзяржаўны кантроль дзейнічае

## ШЫРОКА ТРАЦІЦЬ НЕ ЗАБАРОНІШ?

***Калегія Камітэта дзяржаўнага кантролю разгледзела вынікі праверкі дзейнасці Беларускага бюро па транспартным страхаванні***

Як адзначыў старшыня калегіі — кіраўнік Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянон ЛОМАЦЬ, неабходнасць гэтага абумоўлена адсутнасцю кантролю з боку Міністэрства фінансаў і Назіральнага савета бюро. Такое становішча і прывяло да «неэфектыўнага і бездаказнага выкарыстання сродкаў гарантыйных фондаў і даходаў ад размяшчэння гэтых сродкаў». Паводле слоў Зянона Ломаця, генеральны дырэктар бюро прадэманстраваў «барскія» замашкі пры выкарыстанні дзяржаўных сродкаў.

Бюро было створана ў 1999 годзе з мэтай абароны маёмасных і іншых інтарэсаў пацярпелых у выніку здарэнняў, здзейсненых транспартнымі сродкамі на тэрыторыі Беларусі або беларускімі транспартнымі сродкамі за мяжой. Структура аб'ядноўвае 6 дзяржаўных страхавых арганізацый і страхавых арганізацый з доляй дзяржавы звыш 50 працэнтаў, якія праводзяць абавязковыя страхаванні грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў. Страхавыя арганізацыі ажыццяўляюць штомесячныя адлічэнні ў бюро для фарміравання гарантыйных фондаў. Сродкі фондаў выкарыстоўваюцца на выплаты пацярпелым. Бюро размяшчае дадзеныя фонды на дэпазітах або ў каштоўных паперах банкаў. Даход ад размяшчэння сродкаў з'яўляецца даходам бюро. Камітэт дзяржкантролю пераканаўся, што гэтыя сродкі бюро траціла нерацыянальна і неабгрунтавана.

Праверкі камітэта паказалі, што за кошт прыбытку былі набыты акустычная сістэма з прайгравальнікам коштам 113,9 млн. рублёў, падлогавы гадзіннік Hermle — 22 млн рублёў, тры сотавыя тэлефоны Nokia — ад 3 да 3,6 млн рублёў, два аўтамабілі «Аўдзі» А6 2007 і 2008 гадоў выпуску коштам 113,9 і 140,3 млн рублёў. Адзначаецца, што ніякіх эканамічных абгрунтаванняў пры правядзенні дадзеных закупак бюро не мела, а тэндары на закупку гэтых тавараў не праводзіла. Як высветлілася, бюро абнаўляла аўтамабілі досыць рэгулярна. Дарэчы, колькасць супрацоўнікаў арганізацыі складае ўсяго 33 чалавекі.

Генеральны дырэктар дазволіў сабе і пэўныя сацыяльныя льготы. За кошт прыбытку гендырэктар устанавіў для сябе і павышаны памер сутачных падчас замежных камандзіровак. Акрамя таго, бюро патраціла 17 млн рублёў на заключэнне дагавора па аказанні медыцынскіх паслуг у Рэспубліканскай бальніцы Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Паслугі атрымлівалі не толькі гендырэктар, але яго жонка і былы намеснік.

У 1999—2000 гадах бюро размясціла сродкі гарантыйных фондаў на дэпазітах у «Беларускім біржавым банку», пасля ліквідацыі якога бюро страціла звыш 700 млн рублёў. У 2003 годзе сродкі гарантыйных фондаў былі размешчаны ў «Мінск Комплекс банку», які таксама ўжо ліквідаваны. Сродкі ў памеры 1,4 млрд рублёў былі атрыманы з банка ў выглядзе банкаўскіх вэксаляў і перададзены прыватнай будаўнічай структуры для будаўніцтва офіснага памяшкання па вул. Інтэрнацыянальная, 3. Перадаплата на будаўніцтва офісаў склала ў 2003 годзе 2,5 млрд рублёў. У 2007-м была заключана яшчэ адна дамоўленасць аб будаўніцтве агульнай плошчай 120 кв. метраў па кошце 3,5 тыс. долараў за кв. метр. Бюро пералічыла ў адпаведнасці з дадзеным дагаворам 900 млн рублёў. Такім чынам, з 2003 года бюро ажыццяўляе будаўніцтва агульнай плошчай звыш 1800 кв. метраў, але апошняе па-ранейшаму знаходзіцца на стадыі нулявога цыкла, а прыватная структура на працягу пяці гадоў выкарыстоўвае грашовыя сродкі па сваім меркаванні. Ніякіх мераў па «заахвочванні» несумленных будаўнікоў бюро не прымала. Між тым пеня, якая магла быць прад'яўлена будаўнічай арганізацыі, складае на сёння 2,4 млрд рублёў.

Таксама праверка выявіла факты неэфектыўнага выкарыстання сродкаў гарантыйных фондаў па абавязковым страхаванні грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў і даходаў ад іх інвеставання.

Сёння памер гарантыйных фондаў дазваляе забяспечыць выплаты пацярпелым (пры існуючых аб'ёмах) на працягу 30 гадоў. Разам з тым дзяржаўныя страхавыя арганізацыі працягваюць штомесяц пералічваць бюро для фарміравання гарантыйных фондаў частку ўзносаў ад абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў. Гэтыя ўзносы да 5,5 раза перавышаюць выплаты, якія робіць бюро пацярпелым. Адлічэнні ў гарантыйныя фонды ў страхавых арганізацый вызвалены ад падаткаабкладання. Прыпыненне дадзеных адлічэнняў дазволіць павялічыць памер паступленняў у бюджэт падаткаў, якія выплачваюць страхавыя арганізацыі, да 2 млрд рублёў у год.

Калегія прапанавала Савету Міністраў разгледзець пытанне аб мэтазгоднасці знаходжання генеральнага дырэктара Беларускага бюро па транспартным страхаванні на гэтай пасадзе, прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці за адсутнасць належнага кантролю за дзейнасцю арганізацыі службовых асобаў Міністэрства фінансаў.

Назіральнаму савету прапанавана забяспечыць кантроль за дзейнасцю бюро, зацвердзіць лакальныя нарматыўныя акты аб умовах і памерах аплаты працы работнікаў, працэдуры набыцця асноўных сродкаў...

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ДА КВАТЭРЫ НЕ ДАЙШОЎ

Позна вечарам на скрыжаванні вуліц Шубітыдзе—Зялёная, што ў Пінску, да 55-гадовага мужчыны падышоў падлетак і гвалтоўна забраў ключы ад кватэры і каля дзесяці тысяч.

Міліцыя рабаўніка, які ўжо паспеў пабываць у турме, затрымала.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**Ждановичский сельский исполнительный комитет Минского района (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Ляховщина:

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минский р-н, д. Ляховщина, 623681706601000147 | 0,2436 га | сети электроснабжения | 12 064 885 | 1 200 000 |
| 2 | Минский р-н, д. Ляховщина, 623681706601000149 | 0,1663 га | сети электроснабжения | 8 303 359 | 830 000 |
| 3 | Минский р-н, д. Ляховщина, 623681706601000146 | 0,1533 га | сети электроснабжения | 7 562 289 | 750 000 |
| 4 | Минский р-н, д. Ляховщина, 623681706601000148 | 0,1414 га | сети электроснабжения | 7 060 102 | 700 000 |

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы в сумме 626 270 бел. рублей, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (по каждому лоту). Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **07.10.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

ISSN 1990 - 763X

08166>

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.09.2008 г. (для б/н разлікаў)***

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 111,00 |
| 1 еўра | 3 041,00 |
| 1 латвійскі лат | 4 323,16 |
| 1 літоўскі літ | 880,79 |
| 1 чэшская крона | 122,34 |
| 1 польскі злоты | 902,21 |
| 1 расійскі рубель | 84,87 |
| 1 украінская грыўня | 443,95 |

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,8739 |
| 10 UAH | 52,2013 |
| 1000 BYR | 11,7774 |
| EUR | 35,9279 |

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 03.09.2008 г.)***

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

Прэм'ера

## ДУДАРАЎ НЕ ХОЧА БЫЦЬ АКУНІНЫМ

*Падзеі ў ягоным дэтэктыве, якія ўвасоблены на сцэне, звяртаюць да таямніц беларускага сярэднявечча і прымушаюць разважаць пра традыцыі Караткевіча*

**У Вялікага князя — вялікі клопат: смута пайшла ў народзе, людзі гінуць і смерць іх здаецца вельмі дзіўнай, беспрычыннай. Што рабіць, каб спыніць злачынцаў, каб настаў спакой? Натуральна, знайсці забойцаў. Напэўна, не так проста гэта зрабіць аднаму герою, нават калі ён выдатны спецыяліст і адчувае, дзе крымінал, варта толькі супаставіць падзеі, прааналізаваць матывы забойцы і зразумець яго логіку. Гэта рабілі ў тэатры імя Янкі Купалы — уся група, якая працавала над спектаклем паводле новай п'есы Аляксея Дударава «Ядзвіга». Прэм'ера лета паказала не толькі тое, якімі былі забойцы 500 гадоў таму і што іх магло прымусіць пайсці на злачынства. Гэты спектакль можа стаць падставай для аналізу: хто ёсць хто ў самім тэатры, у чым яго смутак і сум, дзе збавенне і ў чым радасць. Апошняе асабліва актуальна ўспрымаць на фоне папулярных сёння развяг наконт: хворы, хутчэй, жывы, чым мёртвы, ці наадварот.**

Зрэшты, у дачыненні да Купалаўскага тэатра менавіта апошняе хацелася б прымяраць меней за ўсё: прэм'еры адбываюцца рэгулярна, усе яны становяцца прыкметнымі падзеямі, ахвотнікаў трапіць на іх заўсёды даволі шмат, а спрэчкі наконт спектакляў кіпяць потым не толькі ля тэатральнага гардэроба. Вось як зараз: у той час, як адны гледачы па традыцыі ўтварылі авацыю, іншыя звярталі да іх пытанне: «Як часта вы ходзіце ў тэатр? Што апошняе глядзелі ў гэтага рэжысёра? Што болей за ўсё спадабалася?..»

Справа ў тым, што мастацкі кіраўнік тэатра Валерый Раеўскі ў апошнія гады паставіў тры гістарычныя п'есы Аляксея Дударава. Безумоўна, яны розныя. «Ядзвіга» адрозніваецца ад папярэдніх: усё-такі дэтэктыў. Каб зразумець сутнасць дзеі, давядзецца падчас спектакля самім сядзець і гадаць, хто можа быць забойцам і чаму. Можна нават самому ў працэсе прагляду прыдумваць матывацыю ўчынкам герояў, якая можа адрозніваецца ад аўтарскай. Такім чынам, ёсць магчымасць адчуць сябе такім Пуаро, ці Шэрлакам Холмсам, альбо ў рэшце нейкім Фандорыным. Але тут з'яўляецца наш міленькі, свой падобны герой — суддзя Валькові ч, які даказвае, што вышук у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI стагоддзі працаваў сумленна і прафесійна, нават калі меў асабістую зацікаўленасць у пэўным вырашэнні справы.

З асабістай зацікаўленасцю ўсё зразумела, калі ў цэнтры ўвагі падзеі ў маёнтку, дзе жывуць тры сястры — Марта, Марыля і Ядзвіга з роду Русіноўскіх. Першая шчаслівая — мае мужа і як мінімум траіх дзяцей. Другая — манашка, збегла ў манастыр ад шлюбу з нялюбым састарэлым жаніхом, якога выбраў бацька. Трэцяя пайшла замуж таксама не па сваёй волі, але вельмі нечакана стала ўдавой і жыве ў жалобе па забітым мужы. Бедная, няшчасная, безабаронная жанчына. А часам і не такая ўжо і безабаронная... Можа насамрэч злая і хітрая? Ці ўсё-такі чыстая і сама ахвяра? Валянціне Гарцуевай, якая выконвала гэтую ролю, трэба было вырашыць для сябе, што за жанчыну яна іграе. Як і Андрэй Кавальчук павінен быў вызначыць, у які момант яго герой Валькові ч пакахаў Ядзвігу. Акцёры ўласнай ігрой часам пра сваіх герояў могуць сказаць больш, чым уяўляў гэта рэжысёр. Так здалося. Таму што нейкія эмацыянальныя моманты дасягаліся менавіта акцёрскім майстэрствам, а не пры дапамозе вырашэння пэўных сцэн. А можа, так было задумана і гэта своеасаблівы хітрык, каб пагуляць з гледачом: вы лічыце тэатр акцёрскім мастацтвам ці ўсё-такі рэжысёрскім? З аднаго боку, калі паглядзець на колькасць занятых у спектаклі акцёраў (вялікая частка трупы), то разумееш, што гэта ж рэжысёр вырашыў іх вывесці на сцэну. З другога боку — ад тэатра, які з'яўляецца найперш рэжысёрскім мастацтвам, чакаеш, каб усё было лагічна выбудавана, абгрунтавана і абавязкова арыгінальна (у кожным спектаклі!). Як развіццё падзей, так і знешняе іх афармленне. Магчыма, у некага металічныя бліскучыя ланцугі выклікаюць асацыяцыю са змрочным сярэднявеччам і яго жудаснымі норавамі. Але падобныя гнуткія доўгія прадметы (толькі канаты) я ўжо бачыла на сцэне — у спектаклі паводле Дударава «Палачанка» на сцэне ТЮГа. Што ж, магчыма, нешта ў гэтым ёсць: больш раннія часы — мягкі матэрыял, пазнейшыя часы — чалавецтва ўступіла ў іншую эру. Але вось ну ніяк я не магла зразумець, чаму адна частка герояў выглядае як у XVI стагоддзі, а другая — як у XIX? Чаму скамарохі (ці валачобнікі?) ходзяць нібыта злыя шаманы ці нагадваюць здані, якія палохаюць дзяцей. А вось хто сапраўды пацешыў — дык гэта карчмар-габрэй. Можа таму, што іншых нам зразумець працей, чым саміх сябе, свой уласны народ? Што з ім адбывалася раней, і чаго ён хоча цяпер. У прыватнасці — ад тэатра.

Відавочна, што ў тэатры мусіць быць сучасная беларуская драматургія на гістарычную тэму. Гэта цікава і запатрабавана публікай. Рэальнасць, на жаль, такая, што глытаць у метро палегчаныя гістарычныя дэтэктывы Барыса Акуніна людзям прасцей, чым паглыбляцца ў асаблівы, містычны свет твораў Караткевіча з яго беларускімі характарамі. А вось пайсці ў тэатр і паглядзець штосьці такое, толькі сваё, — іншая справа. Людзі ходзяць у тэатр дзеля свята. І маюць права на тое, каб яно атрымалася не шараговым. Між іншым, давялося чуць, як Аляксея Дударава ў сувязі са з'яўленнем «Ядзвігі» некаторыя назвалі беларускім Акунiным, які ўвёў моду на гістарычныя дэтэктывы.

**Зрэшты, сам Аляксей Ануфрыевіч паставіўся да гэтага са здзіўленнем:**

— Я чалавек не модны ў прамым і пераносным сэнсе. Калі ўсе кідаюцца на нешта, я стаю ўбаку і чакаю, калі ўсё скончыцца. «Ядзвіга» — гэта не даніна модзе яшчэ і таму, што за аснову ўзяты рэальны факт. Наш знакаміты гісторык-пісьменнік Кастусь Тарасаў у летапісах знайшоў запіс пра тое, што недзе на мяжы 1500 года паміж Вільняй і Ашмянамі дзейнічала крывавая банда, якая загубіла 360 чалавек. Атаманам гэтай банды была дзяўчына са шляхетнага роду Русіноўскіх. Я адштурхнуўся ад гэтага, узяў за факт, што яна забіла свайго мужа, якога не кахала. Я не магу апісваць і асуджаць забойцу, тым больш калі гэта жанчына. Але зыходжу з таго, што калі чалавек утварыў зло, то ён абавязкова будзе пакараны — ці то людзьмі, ці то Богам. Бог пакараў Ядзвігу каханнем, а гэта для яе аказалася страшней за смерць, таму што яе сэрца выбрала суддзю Вальковіча, які вядзе следства. Суддзямі ў той час у Вялікім Княстве Літоўскім называлі тых, хто даследаваў справы.

**— Гэта паводле гісторыі, ці ўжо ваш вымысел?**

— Там нешта такое было... Быў суддзя Ваньковіч, які сапраўды займаўся гэтай справай. Я, як аўтар, змяніў адну літару ў яго прозвішчы. Суддзя аддаў дзяўчыну ў рукі Вялікага Князя, на яго волю. Князь Аляксандр — гістарычная асоба, тут не трэба шукаць аніякіх паралеляў. Князь паабяцаў суддзі, што яе не пакараюць смерцю. Яна адмовілася ад такой ласкі і абрала смерць, пазбавіўшыся пакутаў з-за кахання. Трэба разумець, што гістарычная праўда і мастацкая — розныя рэчы. У спектаклі «Чорная панна Нясвіжа», які таксама ідзе ў Купалаўскім тэатры, я распавядаю гісторыю смерці Барбары Радзівіл. Адна з гістарычных версій яе смерці гаворыць пра тое, што Барбару атруціла каралева Бона. А ў маім спектаклі яна атручваецца сама. Нават аднойчы нехта напісаў, што я захацеў апраўдаць Бону Сфорцу. Не ў гэтым справа. Проста на мой погляд, мастацкая праўда існуе не дзеля дакладнасці, яна павінна даваць арыенціры ў бок светлага.

**— Ці з'явяцца іншыя вашы гістарычныя дэтэктывы?**

— Не, пра планы на будучыню не люблю гаварыць. Але, напэўна, не буду пісаць пра сучаснасць. Чым далей, тым яна менш цікавая.

**— Якi з вашых гістарычных спектакляў, якія ішлі ў Купалаўскім, асабліва дарагі?**

— Я ніколі не працую з халодным сэрцам. Заўсёды пакутую, калі пішу. Вылучыць нейкі адзін — складана. У адным кроў, боль і каханне, у другім — боль, кроў і каханне, і ў трэцім. Цяжка сказаць, дзе гэтага ўсяго больш, а дзе менш. Цяжка сказаць, дзе больш мяне самога.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# Вучаць у школе, вучаць у школе... І на міністраў!



Фота Аляксандра АЛПАТАВА

51 год таму цяперашні міністр гандлю Аляксандр Іванкоў упершыню пераступіў парог Раваніцкай школы Чэрвеньскага раёна. Праўда, месцілася яна тады ў будынку мясцовага палацава-паркавага комплексу.

За мінулыя гады, натуральна, усё змянілася, што і адзначыў на сустрэчы з ужо цяперашнім пакаленнем школьнікаў, іх бацькоў і настаўнікаў міністр. Сёлета Раванічы атрымалі статус аграгарадка. Да канца года плануецца адкрыць комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання і прадуктовы магазін.

А на сустрэчу ў родную школу Аляксандр Іванавіч прыехаў не з пустымі рукамі: установе адукацыі ён уручыў камп'ютар, а першакласнікам — ранцы з усім неабходным для вучобы.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*К сведению акционеров*
*ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»*

В соответствии с решением Общего собрания акционеров (протокол № 15 от 27 марта 2008 года) произведена выплата дивидендов акционерам ОАО по результатам работы за 2007 год через филиалы ОАО «АСБ «Беларусбанк» и ОАО «Белагропромбанк» по Республике Беларусь, а также почтовыми переводами.

**Справки по тел. (8 01795) 45 3 28.**

**Дирекция, Наблюдательный совет**
**ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».** УНН 600075003

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже, обращенного в доход государства здания производственного цеха (швейный цех), об. пл. 130,1 кв.м, расположенного по адресу: Минская область, Любанский район, г.п. Уречье-2. Начальная цена (снижена на 10 %) – 13 500 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,0303 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.06.2008 г. Аукцион состоится **19.09.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.09.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Наш сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости». УНП 690324015.*

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенного в доход государства здания заправочной, об. пл. 79,1 кв.м, расположенного по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 292. Начальная цена (снижена на 10 %) — 43 200 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.07.2008 г. Аукцион состоится **19.09.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 , к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.09.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны (8017) 224 61 34.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

**Калектыў Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» смуткуе ў сувязі са смерцю Уладзіміра Антонавіча ЯСКЕВІЧА, сведкі трагедыі вёскі Хатынь 22 сакавіка 1943 года, і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

# ДЫПМІСІЮ ВЫСОКА АЦАНІЛІ

*Вадзім Папоў адзначыў актыўны ўдзел кітайскага пасла ў жыцці Беларусі*

Такое меркаванне Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны агучыў падчас сустрэчы з паслом Кітая ў Беларусі У Хунбінем з нагоды завяршэння яго дыпламатычнай місіі ў нашай краіне. На такой пасадзе спадар У Хунбінь працаваў амаль тры гады. Ён прызнаўся, што гэты час прайшоў для яго вельмі хутка: «Калі жыццё поўнае работы, а тым больш прыемнай работы, яно праходзіць незаўважна». Ацэнку ж яго працы даў спікер ніжняй палаты беларускага парламента Вадзім Папоў, ён адзначыў высокую эфектыўнасць удзелу кітайскага пасла ва ўсіх працэсах, што адбываюцца ў дзяржаве.

— Размаўляючы з вашым папярэднікам, мы абмяркоўвалі тэму росту ўзаемных гандлёвых адносінаў і ставілі задачу выйсці на мільярд долараў ЗША, — прыгадаў спікер. — Гэта лічба рэалізавана з вашым актыўным удзелам. Упэўнены, што на сёння мы ўжо перасягнулі мільярд долараў, і недзе блізка да двух мільярдаў будзем па выніках гэтага года. Тое, што ваша грашовая адзінка — юань — уключаецца ў сістэму нашай грашова-крэдытнай палітыкі, у гэтым таксама ёсць вялікая ваша заслуга. Гэтаму садзейнічае выдзяленне крэдытаў на мадэрнізацыю асобных аб'ектаў нашай вытворчасці, а таксама ўзаемныя візіты дзяржаўных дзеячаў, парламенцкіх дэлегацый. Тая прававая база, што створана і ствараецца, дазваляе мець аптымістычны погляд у будучыню на нашы двухбаковыя адносіны.

Вадзім Папоў падкрэсліў, што адносіны з КНР — прыярытэт у знешняй палітыцы Беларусі. «І гэта не проста словы», — дадаў ён. Не абмінуў спікер і ўзаемныя стасункі на міжнароднай арэне. Старшыня Палаты прадстаўнікоў з задавальненнем адзначыў, што Беларусь заўсёды адчувае падтрымку кітайскага боку ва ўсіх міжнародных структурах. «КНР выступае супраць аднапалярнага свету, гэта адпавядае нашай палітыцы», — заключыў Вадзім Папоў.

Спадар пасол быў салідарны: «Ваша краіна праводзіць знешнюю палітыку, што супадае з нашай стратэгіяй знешняй палітыкі. Тут мы заўсёды знаходзім агульную мову і трывала супрацоўнічаем». Ён пазітыўна ацаніў шляхі развіцця Беларусі і дадатна згадаў, што, па яго разуменні, у краіне апошнім часам былі распрацаваны розныя нарматыўныя акты, якія садзейнічаюць паляпшэнню ўмоў для развіцця эканомікі, прыцягнення замежных інвестыцый.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## ЗАБЫЎ КАРТКУ Ў БАНКАМАЦЕ

Віцебскі рабочы забыў дастаць сваю банкаўскую картку з банкамата «Беларусбанка», што стаіць на вуліцы Берасценя, і невядомы зняў з рахунка больш за 1,2 мільёна беларускіх рублёў. Узбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОЧЕРЕДНОЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже, обращенных в доход государства:

| № лота | Объект | Общая площадь (кв.м) | Адрес | Начальная цена (снижена на 10 % бел. руб.) | Задаток (от нач. цены) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Уречский цех** | 1746,3 | Минская область, Любанский район, г.п. Уречье, ул. Коммунальная, 9 | 624 240 000 | 5 % |
| | **Цех огнетушителей, склад сои** | 1962,4 | | | |
| | **Котельная** | 200,5 | | | |
| | **Проходная** | 15,2 | | | |
| 2 | **Здание гаража – мастерской** | 1117,8 | г. Слуцк, ул. Ленина, 292 | 237 600 000 | 10 % |

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.06.2008 г. Аукцион состоится **19.09.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.09.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Наш сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости»,УНП 690324015.*

*Установа адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ НАСТУПНЫХ ПАСАД:**

■ кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый: **загадчык кафедры;**
■ кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы: **загадчык кафедры;**
■ кафедра харавога і вакальнага мастацтва: **загадчык кафедры.**

*Пры падачы заяў на замяшчэнне пасад загадчыкаў кафедраў наяўнасць вучонай ступені і вучонага звання абавязкова.*

■ Кафедра філасофіі: **прафесар, дацэнт;**
■ кафедра замежных моў: **старшы выкладчык;**
■ кафедра народна-інструментальнай творчасці: **дацэнт;**
■ кафедра тэорыі музыкі і музычнай адукацыі: **дацэнт (2).**

УНН 100286677

# ПРАВА НА ЗАБЕСПЯЧЭННЕ




**Я з'яўляюся апекуном няпоўнагадовага хлопчыка. Згодна з артыкулам 9 Закона ад 21.12.2005 г., мне павінны выплачваць дзяржаўнае забеспячэнне ў выглядзе штомесячных грашовых выплат. Мне выплачваюць 192 000 рублёў, гэтая сума ў адпаведнасці з рашэннем суда спаганяецца з маці хлопчыка. Таксама штогод для яго выдзяляецца пуцёўка ў летні лагер, а на школьныя абеды я даю яму грошы. Ці павінны мне выплачваць дзяржаўныя сродкі на ўтрыманне хлопчыка?**

**Н.М.**, Мінская вобласць

Законам Рэспублікі Беларусь ад 21.12.2005 г. «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асобаў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў» гарантуецца права вышэйназваных дзяцей на дзяржаўнае забеспячэнне. Дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў і знаходзяцца ў апякунскіх сем'ях, дзяржаўнае забеспячэнне прадастаўляецца шляхам штомесячных грашовых выплат іх апекунам на падставе рашэння органа апекі і папячыцельства з дня ўладкавання ў апякунскую сям'ю.

Згодна з часткай другой артыкула 9 Закона штомесячныя грашовыя выплаты прадугледжваюць, згодна з устаноўленымі нормамі расходы на харчаванне гэтых дзяцей, забеспячэнне іх адзеннем, абуткам, мяккім інвентаром і абсталяваннем, падручнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі і прыладамі, прадметамі асабістай гігіены, іншымі прадметамі першай неабходнасці, а таксама па дасягненні імі ўзросту 7 гадоў — штомесяц грашовымі сродкамі на асабістыя расходы па ўстаноўленых нормах.

Нормы расходаў на ўсе пералічаныя патрэбнасці дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і знаходзяцца ў апякунскіх сем'ях, а таксама ў дзіцячых вёсках (гарадках), прыёмных сем'ях, зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 06.07.2006 г. № 840 са змяненнямі і дапаўненнямі, і складаюць у месяц для дзяцей ва ўзросце да 6 гадоў — 173 000 рублёў, а для дзяцей ад 6 гадоў і старэйшых — 192 000 рублёў. Умовы і парадак прадастаўлення дзяржаўнага забеспячэння ўстаноўлены Палажэннем, зацверджаным вышэйназванай пастановай Савета Міністраў.

Як вы пішаце, 192 000 рублёў вы і атрымліваеце. Такім чынам, гэта і ёсць дзяржаўнае забеспячэнне на ўтрыманне вашага падапечнага. Тое, што такая ж сума спаганяецца па рашэнні суда з маці хлопчыка, магчыма, азначае, што маці адносіцца да катэгорыі бацькоў, якія, згодна з артыкулам 93 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і, павінны кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей за ўвесь перыяд іх знаходжання на дзяржаўным забеспячэнні, у тым ліку і ў апякунскіх сем'ях. Указаныя расходы кампенсуюцца дзяржаве і спагнаныя з бацькоў сродкі пералічваюцца ў даход бюджэту, з якога ажыццяўляецца фінансаванне апякунскай сям'і.

## Па чутках і аўтарытэтна

# Ціхан і Дзевятоўскі: допінг ці паклёп?

У Беларусі могуць адняць два алімпійскія медалі? У інтэрнэце з'явілася навіна ад крыніцы Агенцтва спартыўнай інфармацыі «Увесь спорт», быццам бы ў знакамітых кідальнікаў молата Івана Ціхана і Вадзіма Дзевятоўскага знайшлі забаронены прэпарат тэстастэрон, які быў ужыты ў выглядзе мазі ці гелю. Допінг-пробы былі ўзятыя ў сярэбранага і бронзавага прызёраў Гульняў-2008 адразу пасля алімпійскага фіналу. Калі гэта інфармацыя не газетная «качка», то Міжнародны алімпійскі камітэт і Міжнародная федэрацыя лёгкай атлетыкі павінны неўзабаве аб'явіць аб выніках даследавання і прыняць меры пакарання.

Дзевятоўскі ўжо быў дыскваліфікаваны за выкарыстанне допінгу. Адлучаны ад спорту ён быў на тэрмін з 2000 па 2002 год. Улічваючы гэта, Вадзіма могуць дыскваліфікаваць пажыццёва? Што ж датычыцца трохразовага чэмпіёна свету, то на мінулай Алімпіядзе допінг Ціхану дапамог у прамым сэнсе гэтага слова. У 2004-м Іван заваяваў «бронзу», але раптам памяняў медаль на серабро з-за дыскваліфікацыі саперніка, які заняў у Афінах другое месца.

**— У Беларускую федэрацыю лёгкай атлетыкі не паступала ніякіх афіцыйных дакументаў ад Міжнароднага алімпійскага камітэта і Міжнароднай федэрацыі лёгкай атлетыкі, якія пацвердзілі б інфармацыю аб дыскваліфікацыі спартсменаў, — паведаміла ўчора карэспандэнту «Звязды» прэс-аташэ БФЛА Настасся МАРЫНІНА.**

**Ірына ПРЫМАК.**

## Доктар адкажа

# Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

Да канца тыдня дзяжурыць на «гарачай лініі» Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

**3 верасня** — галоўны ўрач Мінскай гарадской інфекцыйнай клінічнай бальніцы Мікалай Мікалаевіч ЮРОЎСКІ.

**4 верасня** — галоўны ўрач Мінскага гарадскога цэнтра медыцынскай рэабілітацыі дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі Аляксандр Мікалаевіч ЯКАЎЛЕЎ.

**5 верасня** — галоўны ўрач 15-й сталічнай паліклінікі Віялета Браніславаўна ШУРЫГІНА.

## Абзац

■ У Беларусі павышаны закупачныя цэны на буйную рагатую жывёлу і свіней. Цэны выраслі на БРЖ ў сярэднім — на 10 працэнтаў, на свіней — на 5 працэнтаў. У Мінсельгасхарчы тлумачаць такі крок неабходнасцю кампенсацыі затрат на вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі, узросшымі цэнамі на матэрыяльныя рэсурсы, у т.л. на паліва і ўгнаенні і выроўнівання цэнаў на аналагічную прадукцыю з суседнімі краінамі.

**■ «Белнафтахім» не выключае павышэння цэнаў на нафтапрадукты на ўнутраным рынку, паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік начальніка канцэрна Уладзімір Волкаў. Ён патлумачыў, што летнія павышэнні кошту нафтапрадуктаў былі выкліканы аб'ектыўнымі прычынамі — ростам кошту нафты і нафтапрадуктаў на сусветным рынку. Ён нагадаў, што летась тона нафты каштавала крыху больш за $200, а цяпер яе цана павялічылася да $600 і больш. «Тое, што нафтапрадукты ў Беларусі каштавалі менш, чым у нафтаздабываючай Расіі — гэта нонсэнс», падкрэсліў У. Волкаў.**

■ «Жыхарка Туніса нарадзіла шасцярых блізнят — тры хлопчыкі і тры дзяўчынкі. Гэта першы выпадак у гісторыі Туніса, да гэтага мясцовым рэкордам было нараджэнне пяці блізнят. Маці было зроблена кесарава сячэнне, яна і пяцёра дзяцей адчуваюць сябе добра, але адзін нованароджаны пакутуе ад задышкі.

**■ Урад Сербіі мае намер імпартаваць 250 тыс. нявестаў для сваіх халастых вясковых жыхароў. Сацыяльныя службы краіны ўжо вядуць перамовы з такімі краінамі-суседзямі, як Украіна, Малдова і Расія, а таксама больш аддаленымі Бірмай, В'етнамам і Камбоджай. Па словах міністра па пытаннях сацыяльнай палітыкі дзяржавы Зэліка Васільевіка, ён ужо вёў перамовы са сваімі ўкраінскімі калегамі і высветліў, што ў некаторых рэгіёнах Украіны колькасць жанчын намнога перавышае лік мужчын, і пытанне можа вырашыцца ў інтарэсах абедзвюх краін. Такім чынам Сербія спрабуе вырашыць праблему вяртання да жыцця аддаленых і вымiраючых сёлаў.**

■ Жыхарка Масквы збіла на пешаходным пераходзе школьніка і знікла. Віноўніцай ДТЗ стала супрацоўніца Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта РФ. ДТЗ адбылося раніцай у сераду. 45-гадовая жанчына ехала на чырвонай Toyota Corolla, а 10-гадовы хлопчык стаяў на пешаходным пераходзе ў чаканні, калі загарыцца зялёнае святло. Калі яно загарэлася, усе машыны спыніліся перад пераходам, акрамя Toyota. Яна збіла школьніка, які пераляцеў праз капот і ўпаў на бардзюр, і на вялікай хуткасці паехала далей. Прахожыя запомнілі нумар машыны, і ў хуткім часе яна была выяўленая на адной з паркоўак. Віноўніца ДТЗ патлумачыла супрацоўнікам міліцыі, што яна спяшалася на працу ў адказнае месца і таму не спынілася. Хлопчык са страсеннем мозга дастаўлены ў НДІ неадкладнай дзіцячай хірургіі.

## Поўны абзац

**■ Новы сэксшоп, што адчыніўся ў адным з жылых масіваў польскага гарадка Ракіборц, раздзяліў яго насельнікаў на два супрацьлеглыя лагеры. Моладзь, асабліва маладыя бацькі, актыўна выступаюць за закрыццё магазіна, у той час як сталыя людзі гэтак жа актыўна абараняюць яго. Як тлумачаць прадаўцы магазіна, большасцю пакупнікоў з'яўляюцца людзі ва ўзросце пасля 60 гадоў. Яны купляюць прэпараты для павышэння патэнцыі. Сярод сталых жанчын вялізнай папулярнасцю карыстаецца інтымная ніжняя бялізна.**

■ У афрыканскім каралеўстве Свазіленд 2 верасня прайшоў мясцовы «кірмаш нявестаў». Чарговую, 14-ю жонку выбіраў манарх Мсваці Трэці. Па старажытнай традыцыі, 70 тысяч паўраспранутых цнатлівак выканалі для караля рытуальны «трысняговы танец». Самым малодшым з прэтэндэнтак было 6 гадоў, а самым старэйшым — каля 25. Такія цырымоніі адбываюцца ў краіне штогод. Шанцуе толькі адзінкам, і дзяўчаты з году ў год ходзяць на кірмашы.

**■ Пракуратура ў Ніжнім Ноўгарадзе ўзбудзіла крымінальную справу ў дачыненні да жанчыны, якая аддубасіла супрацоўніка ДІБДР (служба бяспекі руху) яго ж міліцэйскім жэзлам. Па звестках следства, у той дзень інспектар дарожнапатрульнай службы затрымаў вадзіцеля і выпісваў яму пратакол аб парушэнні. Гэта ўбачыла жанчына, якой здалося, што інспектар прыцягвае да адказнасці яе сына. Яна накінулася на інспектара, выхапіла з яго рук жэзл і нанесла вартавому парадку некалькі ўдараў па галаве. Пазней яна высветліла, што абараняла не свайго сына, аднак прызнанне памылкі не змякчыла абвінаваўчага заключэння. Ёй пагражае да 5 гадоў пазбаўлення волі.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Узденском районе:

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка, га | Кадастровый номер | Начальная цена (рублей) | Расходы, связанные с подготовкой документации | Наличие коммуникаций |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Хотлянский с/с, пос. Плитница | 0,2500 | 625681714101000009 | 65 220 | 726 744 | Сети водоснабжения, электроснабжения |
| 2 | Хотлянский с/с, д. Хотляны | 0,1500 | 625681718601000137 | 78 260 | 722 270 | Сети водоснабжения, электроснабжения |
| 3 | Лошанский с/с, д. Сеножатки, ул. Садовая, 8 | 0,1500 | 625681312101000072 | 32 670 | 746 032 | Сети электроснабжения, имеется возможность подключения к водоснабжению |
| 4 | Лошанский с/с, пос. Верх-Неман, 17 | 0,1000 | 625681301601000008 | 47 300 | 944 415 | Сети электроснабжения |
| 5 | Лошанский с/с, пос. Верх-Неман, 19 | 0,1000 | 625681301601000007 | 47 300 | 944 415 | Сети электроснабжения |
| 6 | Неманский с/с, д. Могильно, ул. Комсомольская, 65 | 0,1500 | 625682106601000159 | 70 240 | 712 902 | Сети электроснабжения |
| 7 | Неманский с/с, д. Могильно, ул. Садовая, 31 | 0,2489 | 625682106601000161 | 348 360 | 651 633 | Сети водоснабжения |
| 8 | г. Узда, ул. Цветочная | 0,1093 | 625650100001000447 | 1 439 350 | 636 096 | Сети водоснабжения, газоснабжения |
| 9 | г. Узда, ул. К. Маркса, уч. 2 | 0,0949 | 625650100003001359 | 1 995 519 | 651 002 | Сети водоснабжения, газоснабжения |
| 10 | г. Узда, ул. К. Маркса, уч. 1 | 0,0950 | 625650100003001358 | 1 997 622 | 658 738 | Сети водоснабжения, газоснабжения |

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **08.10.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

на право заключения договора аренды земельных участков сроком на 99 (девяносто девять лет):

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка, га | Кадастровый номер | Начальная цена (рублей) | Расходы, связанные с подготовкой документации | Наличие коммуникаций | Целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Узда, ул. Высоцкого | 0,0776 | 625650100003001355 | 2 837 615 | 733 290 | Сети водоснабжения, газоснабжения, канализации | Для строительства и обслуживания здания под офис |
| 2 | г. Узда, ул. Степанова | 0,0376 | 625650100003001354 | 3 306 303 | 721 068 | Сети водоснабжения, газоснабжения, канализации | Для установки и обслуживания торгового павильона розничной торговли |
| 3 | Узденский р-н, Лошанский с/с, д. Лоша | 0,0196 | 625681309101000104 | 19 052 | 2 092 754 | Сети электроснабжения | Для установки и обслуживания торгового павильона розничной торговли |

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **08.10.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

# ЯК ЗАХАВАЦЬ КАДРАВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ АДУКАЦЫЙНАЙ ГАЛІНЫ?

**Новы навучальны год стартаваў. Трэба прызнаць, што педагагічная грамадскасць чакала яго з вялікай трывогай. Зніжэнне вучэбнай нагрузкі і, адпаведна, заробкаў, пагроза скарачэння і неабходнасць змагацца за напаўняльнасць факультатыва — вось далёка не поўны пералік праблем, якія мог пацягнуць за сабой пераход школы на 11-гадовае навучанне.**

— У няпростай сітуацыі, калі яшчэ не былі расстаўлены ўсе кропкі над «і», прафсаюз заняў адзіна магчымую для сябе пазіцыю: мы звярнуліся да старшыні міжведамаснай камісіі па аналізе сістэмы адукацыі, першага намесніка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Анатоля Рубінава, і агучылі дакладную характарыстыку тэндэнцый у нашай галіне, — расказаў журналісту «Звязды» **старшыня Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА.** — Засяродзілі ўвагу на ўсіх магчымых наступствах пераходу да адзінаццацігадовага тэрміну навучання ва ўмовах неадназначнай сітуацыі ў галіне аплаты працы педагагічных работнікаў. Мы прапанавалі два шляхі вырашэння праблемы: першы — гэта зніжэнне тыднёвай вучэбнай нагрузкі і другі — удасканаленне формаў аплаты працы. У выніку быў абраны другі шлях, што, як мы спадзяёмся, дазволіць захаваць кадравы патэнцыял агульнаадукацыйных устаноў.

Былі пачутыя і нашы прапановы ў галіне аплаты працы. Так, з 1 студзеня 2009 года мы чакаем павышэння тарыфных акладаў (ставак) педагагічным работнікам агульнаадукацыйных устаноў, спецыяльных устаноў адукацыі, устаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія фінансуюцца з бюджэту. У прыватнасці, будуць устаноўлены штомесячныя даплаты маладым спецыялістам з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у памеры 1 тарыфнай стаўкі першага разраду, а таксама надбаўкі за наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі кіраўнікам навучальных устаноў і іх намеснікам па асноўнай дзейнасці. Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі» значна палепшыў становішча кіраўнікоў навучальных устаноў, таму што раней настаўнік вышэйшай катэгорыі пры прызначэнні яго на пасаду дырэктара школы пераставаў атрымліваць надбаўку за сваю катэгорыю. Цяпер вядзецца работа над падрыхтоўкай нарматыўных прававых актаў, якія дазволяць увасобіць дадзеныя рашэнні ў жыццё і зрабіць так, каб педработнікі і сапраўды адчулі на сабе іх эфектыўнасць. Мяркуецца, што аклады педагогаў ўзрастуць прыкладна на 25 працэнтаў.

**— А як галіна адукацыі па ўзроўні сярэдніх заробкаў выглядае сёння на фоне іншых галін бюджэтнай сферы?**

— У аплаце працы прасочваюцца вельмі супрацьлеглыя тэндэнцыі. Так, з аднаго боку, у першым паўгоддзі гэтага года сярэднямесячная заработная плата работнікаў нашай галіны склала 608,8 тысячы рублёў і павялічылася з пачатку года на 11,8 працэнта. Але, з іншага боку, суадносіны рэальнай заработнай платы за студзень — май 2008 года да аналагічнага перыяду мінулага года склалі 99,6 працэнта. Гэта значыць, што рост даходаў работнікаў галіны не паспявае за інфляцыйнымі працэсамі.

Між іншым, сярэднямесячная заработная плата педагогаў павінна быць не меншай за заробкі ў прамысловасці, а прафесарска-выкладчыцкага складу — перавышаць іх не менш чым у 1,5 раза. Гэта мера прадэкларавана ў Законе «Аб адукацыі Рэспублікі Беларусь». А што мы назіраем у рэчаіснасці? Суадносіны сярэднямесячнай заработнай платы педагагічных работнікаў і работнікаў прамысловасці склалі ў 2006 годзе — 86,1 працэнта, у 2007 годзе — 78,9 працэнта, а ў першым паўгоддзі 2008 года — 72,5 працэнта.

Сярод бюджэтных галінаў па ўзроўні заробкаў адукацыя займае толькі пятую пазіцыю. Хоць яшчэ да красавіка 2007 года мы знаходзіліся па гэтым паказчыку на чацвёртым месцы. Нас апярэджваюць навука і навуковае абслугоўванне (1155,6 тыс. рублёў), фізкультура і спорт (925,0 тыс. рублёў), ахова здароўя (658 тыс. рублёў), а таксама культура і мастацтва (627,9 тыс). Гэта ўсё сведчыць аб тым, што павышэнне заробкаў работнікаў адукацыі, як, дарэчы, і бюджэтнай сферы ўвогуле, мера вострa неабходная.

**— Аляксандр Аляксандравіч, а чаму вы не згадваеце работнікаў дашкольных устаноў?**

— Тут сітуацыя ўвогуле крытычная. Сацыяльны статус работнікаў дашкольнай адукацыі абсалютна не адпавядае характару іх дзейнасці. Педагагічная нагрузка на выхавальнікаў удвая перавышае нагрузку на школьных настаўнікаў, і ўсе нашы прапановы па яе зніжэнні так і не былі пачутыя. Плюс нельга скідваць з рахунку і наяўнасць шэрагу прафесійных стрэсавых фактараў: адказнасць за жыццё і здароўе дзяцей, неабходнасць працаваць у перапоўненых групах (з перавышэннем напаўняльнасці ў нас працуюць 44 працэнты дашкольных устаноў). Ступень эмацыянальнага выгарання ў іх — надзвычай высокая. А заробкі — не вытрымліваюць аніякай крытыкі — ад 290 да 350 тысяч рублёў. Істотна пагоршыла сацыяльны статус гэтай катэгорыі педработнікаў скарачэнне ў 2008 годзе працягласці працоўнага водпуску з 42 да 30 дзён. Ці варта здзіўляцца, што ў дашкольных установах па краіне налічваецца больш за тысячу вакансій педагагічных работнікаў? Нядаўна, праўда, Урадам была прынята Праграма развіцця дашкольнай сістэмы адукацыі, у якой, у прыватнасці, прадугледжваецца і павышэнне заработнай платы педагагічным работнікам. Таму цяпер мы ўсе знаходзімся ў чаканні праанансаванага павышэння тарыфных ставак гэтым работнікам на 25 працэнтаў. Праўда, нас цікавіць методыка гэтага павышэння, ад якой таксама будзе залежаць дабрабыт членаў нашага прафсаюза.

Прынцыповай застаецца і пазіцыя прафсаюза ў сувязі са скарачэннем працягласці водпускаў у шэрагу катэгорый педагагічных работнікаў. Цэнтральны камітэт ставіў гэту праблему ў сваіх зваротах ва Урад і Адміністрацыю Прэзідэнта. Работнікам дашкольных устаноў афіцыйна паабяцана вярнуць ранейшую працягласць водпускаў, засталося толькі дачакацца ўнясення змяненняў у адпаведную пастанову Савета Міністраў. А вось педагагічных работнікаў пазашкольных устаноў і ўстаноў павышэння кваліфікацыі, якіх таксама закранула скарачэнне водпускаў, на жаль, парадаваць пакуль няма чым.

**— А як пераход на 11-годку адбіўся на кадравым складзе агульнаадукацыйных устаноў? Ці спраўдзіліся апасенні наконт масавага скарачэння настаўнікаў?**

— Зразумела, што замоўчваць праблему скарачэння штатаў нельга. Мы ўсе разам спрабавалі яго не дапусціць, але ў шэрагу выпадкаў пазбегнуць яго не ўдасца. Хоць бы таму, што настаўнік, заробкі якога залежаць ад аб'ёму педагагічнай нагрузкі, можа звольніцца сам, таму што яму элементарна не будзе хапаць гадзін на стаўку. Вельмі многае будзе залежаць ад маштабнага бачання кіраўнікамі навучальных устаноў праблем кадравага забеспячэння, ад іх умення ўбачыць доўгатэрміновую перспектыву. Цэнтральны камітэт прафсаюза не застаўся ўбаку і размясціў на сваім сайце рэкамендацыі па пытаннях скарачэння штатаў. Мы лічым, што першачарговая задача — захаваць на рабочых месцах тых педагогаў, якія з'яўляюцца скарбніцай педагагічнага вопыту, хто сваёй шматгадовай дзейнасцю на ніве адукацыі заслужыў права не толькі працаваць у новых умовах, але і ўтрымліваць нас ад непрадуманых крокаў, папярэджваць магчымыя наступствы, падказваць аптымальныя шляхі вырашэння праблем. Не сакрэт, што паказчык сярэднямесячнай заработнай платы педагагічных работнікаў ужо ў бліжэйшыя месяцы стане роўны нагрузцы на стаўку. Гэта не проста чарговая графа афіцыйнай статыстыкі, а рэальны ўзровень жыцця нашых работнікаў. Бо сярэдняя па краіне нагрузка на настаўнікаў складзе 1,1 стаўкі. Таму сёння вельмі важна, каб кіраўнікамі факультатываў і гурткоў сталі найбольш адукаваныя педагогі. Гэта не толькі магчымасць для іх хоць крышку падзарабіць (факультатывы будуць аплачвацца па тарыфнай стаўцы, як і абавязковыя ўрокі), а магчымасць для ўсіх нас утрымаць у галіне высокакваліфікаваныя кадры. Менавіта ад кіраўнікоў навучальных устаноў і іх сацыяльных партнёраў у асобе прафсаюзных камітэтаў будзе залежаць кадравае забеспячэнне галіны не толькі ў гэтым навучальным годзе, але і ў перспектыве. Чакаем ад іх кампетэнтных і дальнабачных кадравых рашэнняў.

Да таго ж кадравыя пытанні будуць знаходзіцца ў цэнтры ўвагі пры правядзенні нашых традыцыйных праверак выканання заканадаўства аб працы. Толькі за першае паўгоддзе 2008 года прававымі інспектарамі прафсаюза было прадухілена звальненне 22 работнікаў і выяўлена 9619 парушэнняў заканадаўства аб працы. Нашы праверкі заўсёды суправаджаюцца правядзеннем семінараў па найбольш праблемных пытаннях прымянення заканадаўства аб працы і ахове працы, таму што наша задача не знайсці парушэнне, а яго прадухіліць, навучыць наймальнікаў дзейнічаць у сучасным прававым полі.

Мы не сумняваемся, што наперадзе і Міністэрства адукацыі, і галіновы прафсаюз чакае вялікая работа ў галіне нармавання працы педагагічных работнікаў, таму што цэлы шэраг функцый і абавязкаў педагагічных работнікаў не нармуюцца і, адпаведна, не аплачваюцца. А аднаразовае прэміяванне ці дэпрэміяванне толькі павялічваюць колькасць зваротаў у прафсаюзныя органы...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Зваротная сувязь

# У Магілёве — пераходны перыяд

**У карэспандэнцкі пункт «Звязды» звярнуўся жыхар Магілёва з прэтэнзіяй да гарадскіх уладаў. Аўтаўладальнік паскардзіўся на праблемны рух у цэнтры горада ў сувязі з будаўніцтвам падземнага перахода на скрыжаванні вуліцы Ленінскай і праспекта Міра.**

Магілёўчанін нагадаў, што менавіта 1 верасня будаўнікі абяцалі завяршыць надземную частку работ і пусціць транспарт. Аднак гэтага, на жаль, не адбылося. Калі ж адкрыецца для руху важнае скрыжаванне каля галоўнай плошчы горада?

Што ж, рух у цэнтры Магілёва стаў апошнімі месяцамі гарачай тэмай для абмеркавання гараджан. Аўтамабілісты скардзяцца на аб'езды і заторы. Прычым гэта даўно датычыцца не толькі часу пік: затрымкі ў руху пачынаюцца яшчэ напярэдадні абеду. Здараюцца і аварыі: усе спяшаюцца, нервуюцца і хочуць хутчэй праскочыць у патрэбным кірунку. Гэта не ўсім удаецца.

Бывалыя вадзіцелі кажуць, што гэта, маўляў, не Масква — там можна стаяць гадзінамі, а тут давядзецца патрываць толькі дзесятак хвілін. Але гэта не суцяшае магілёўчан, якія спяшаюцца на працу, а цяпер яшчэ — вучняў і студэнтаў, якія спазняюцца на заняткі.

Праўда, многія аўтаўладальнікі зразумелі, што ў цэнтры цяпер прасцей перамяшчацца не на колах, а на сваіх нагах. Аднак і пешаходы абураюцца малой колькасцю пераходаў праз рэзервовыя аўташляхі, пракладзеныя для аб'езду закрытага скрыжавання.

У яшчэ больш складаным становішчы апынуліся жыхары дамоў, каля якіх ідзе будаўніцтва. Пад вокнамі штодня да позняга вечара шуміць будоўля. Па адным з двароў цяпер транзітам ездзяць аўтамабілі, па другім — шчыльным патокам ідуць людзі, якія пераходзяць з адной вуліцы на іншую прама праз пад'езд.

Нязручнасці зразумелыя, але яны часовыя. Гарадскія ўлады просяць усіх яшчэ крыху патрываць.

— Гэты падземны пераход патрэбен гораду, — запэўніў **намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір ЦІТОК**. — Ён дасць палягчэнне экалагічнай сітуацыі ў цэнтры горада: ліквідуюцца заторы на гэтым скрыжаванні, бо пешаходы будуць вольна пераходзіць дарогі пад зямлёй. У самім пераходзе зробім грамадскія прыбіральні.

Магілёўская Дзяржаўтаінспекцыя звярнулася з заклікам да незадаволеных вадзіцеляў, якія часам тэлефануюць з прэтэнзіямі і ў ДАІ, з разуменнем паставіцца да сітуацыі, быць цярплівымі і выбіраць, па магчымасці, аб'язныя маршруты.

Цяпер што датычыцца тэрмінаў аднаўлення руху.

— Графік будоўлі выконваецца, — заявіў Уладзімір Ціток. — Пусціць транспарт да 1 верасня — такое было пажаданне. Але, на жаль, не атрымалася. Гэта звязана са складанай тэхналогіяй, наборам трываласці бетону. Мы і так плануем пабудаваць падземны пераход хутчэй за нарматыў аж у 3 разы! Будаўнікі працуюць у дзве змены без выхадных дзён. Аднак яны «пойдуць пад зямлю» толькі ў другой палове верасня. Тады і адновіцца аўтамабільны рух.



Трэба адзначыць, што тэмпы работ на будоўлі перахода заўважна паскорыліся апошнімі днямі. Прыцягнуты дадатковыя сілы. Будаўнікі працавалі ўсю ноч з 2 на 3 верасня. Увесці ў дзеянне падземны пераход у Магілёве плануецца да Новага года.

**Ілона ІВАНОВА.**

# Расплаціліся за ласаванне грыбамі...

**З пачатку года ахвярамі грыбоў сталі ўжо больш як 60 жыхароў нашай краіны. Для трох чалавек частаванне грыбамі завяршылася лятальным вынікам. У адрозненне ад папярэдніх гадоў сёлета сумнае лідарства па колькасці пацярпелых трымае сталіца (48 чалавек і адзін смяротны выпадак).**

— Галоўнай прычынай атручэння людзей грыбамі становяцца зусім не ядавітыя грыбы (мухамор ці бледная паганка), а так званыя несапраўдныя грыбы ці грыбы-двайнікі, — тлумачыць загадчык аддзялення гігіены харчавання Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Анжэла Скурановіч. — Так, напрыклад, несапраўдныя лісічкі вельмі падобныя на ядомыя, але шляпкі ў іх роўныя, чырвона-аранжавыя, а не светла-жоўтыя. Акрамя таго, з надломленай шляпкі несапраўднай лісічкі выдзяляецца белы сок.

Вялікая колькасць аматараў грыбных страў атручваюцца ўмоўна ядомымі грыбамі: свінушкамі, сыраежкамі, ваўнянкамі, таму што не захоўваюць правілы іх кулінарнай апрацоўкі. Варта мець на ўвазе, што грыбы ўсмоктваюць усе шкодныя рэчывы з атмасферы, у выніку чаго нават ядомыя грыбы, сабраныя побач з аўтатрасамі, чыгункай ці вакол аэрадромаў, там, дзе ў глебе ўтрымліваецца вялікая колькасць таксічных адходаў, могуць стаць прычынай сур'ёзнага атручэння. Атруціцца можна і старымі грыбамі, у якіх пачаўся працэс распаду бялку.

Ні ў якім разе нельга частаваць грыбамі дзяцей да 8 гадоў, а таксама людзей немаладога ўзросту. Грыбы ўтрымліваюць бялок, які вельмі цяжка засвойваецца арганізмам. Асабліва цяжка пераносяць атручэнні грыбамі дзеці і немаладыя людзі.

Дарэчы, сярод смяротных ахвяраў гэтага года — дзве жанчыны пенсійнага ўзросту. І першая, і другая, як высветлілі медыкі, спажывалі грыбны супчык...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**




Слуцкі раён.

# Для вострых кішэчных інфекцый — раздолле...

Сезонны ўздым захваральнасці на вострыя кішэчныя інфекцыі распачаўся ў Мінску са жніўня. Кожны тыдзень у горадзе рэгіструецца ад 254 да 319 выпадкаў з папярэднім дыягназам «вострае кішэчнае захворванне». Сярод захварэлых традыцыйна пераважаюць дзеці ва ўзросце да 14 гадоў (60 працэнтаў ад агульнай колькасці зваротаў). Найбольшы прырост захваральнасці адзначаецца ў кантынгенце дзяцей да аднаго года, а таксама сярод дзяцей, якія не наведваюць дзіцячыя садкі ва ўзросце да 6 гадоў. Спецыялісты тлумачаць гэта асаблівасцямі фарміравання імунітэту.

Нарастанне інтэнсіўнасці сезоннага ўздыму захваральнасці на вострыя кішэчныя інфекцыі, як тлумачаць спецыялісты, звязана з цыркуляцыяй сярод жыхароў сталіцы ўзбуджальнікаў віруснай этыялогіі (норавірусаў і энтэравірусаў). Для гэтых вірусаў уласцівая ўстойлівасць у знешнім асяроддзі і актыўная перадача пры кантакце з хворым чалавекам, у тым ліку і паветрана-кропельным шляхам. Вірусы могуць доўгі час захоўвацца на паверхні прадметаў, у тым ліку і на прадуктах харчавання, напрыклад, на лупінні садавіны і ягад.

Цяпер больш як трэцяя частка захварэлых прызнаюцца, што перад хваробай спажывалі ў ежу дрэнна памытую садавіну і ягады, ці набытыя на рынку надрэзаныя кавуны. Разам з тым **нарэзка пладоў і продаж іх па частках катэгарычна забароненыя санітарнымі нормамі**.

Для таго, каб не стаць лёгкай ахвярай вострай кішэчнай інфекцыі, спецыялісты Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі раяць мінчанам старанна мыць садавіну, агародніну і зеляніну перад ужываннем, часцей мыць рукі, асабліва маленькім дзецям, сачыць за чысцінёй дзіцячых цацак і прадметаў, з якімі кантактуюць дзеці, а таксама за ручкамі дзвярэй, спускавымі кранамі ўнітаза і кранамі ўмывальніка. Калі садавіна прызначана для дзяцей, яе абавязкова трэба абдаць кіпнем. А вось ваду лепш за ўсё спажываць бутыляваную ці кіпячоную...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# У Мінску пройдзе чэмпіянат па спартыўнай арніталогіі

**Пяты чэмпіянат па спартыўнай арніталогіі правядзе ў гэту суботу грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны».**

Узяць удзел могуць усе ахвотныя мінчане. Спартыўная арніталогія — унікальны від палявання, дзе трэба толькі назіраць за птушкамі і рэгістраваць усе ўбачаныя віды.

«Паляванне за відамі птушак ужо даўно стала адным з самых папулярных захапленняў у краінах Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі», — расказаў спецыяліст па экалагічнай адукацыі «Аховы птушак Бацькаўшчыны» Руслан Шайкін. — Спартыўная арніталогія паступова заваёўвае папулярнасць і ў нашай краіне. Нездарма ў мінулагоднім чэмпіянаце ўзялі ўдзел 13 камандаў, у склад якіх увайшлі не толькі беларускія арнітолагі, але і аматары птушак са Швецыі, Вялікабрытаніі і Літвы. Сёлета спецыяльна на чэмпіянат прыехалі госці з Вялікабрытаніі, Швецыі і Фінляндыі. Умовы для ўдзелу ў чэмпіянаце простыя. Неабходна сабраць каманду з чатырох чалавек, самастойна распрацаваць маршрут і ў шэсць раніцы ўжо быць на старце. Перамяшчацца паміж наглядальнымі пунктамі можна на аўтамабілі, дазволена выкарыстоўваць біноклі, падзорныя трубы. Ацэньваць вынікі будзе кампетэнтнае журы — прафесійныя арнітолагі, супрацоўнікі Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах і актывісты «Аховы птушак Бацькаўшчыны».

**Вольга ШАЎЧУК, «Мінск—Навіны».**

# 4 самагубствы за дзень

**Усяго толькі за адзін дзень у Віцебскай вобласці зарэгістраваны чатыры факты самагубства.**

У Оршы павесілася 94-гадовая пенсіянерка. У Лёзненскім раёне — 52-гадовы беспрацоўны, У Віцебску на тэхнічным паверсе жылога дома павесіўся 55-гадовы беспрацоўны. Таксама ў абласным цэнтры ў нумары гасцініцы сябе зарэзаў яшчэ адзін беспрацоўны — 26-гадовы госць горада з другога абласнога цэнтра. Ён, дарэчы, пакінуў перадсмяротную запіску.

Няўжо не было іншага выхаду? Няўжо не змаглі б хоць бы патэлефанаваць у спецыяльную службу даверу, што працуе на базе абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра? Віцебшчына, дарэчы, мае сумную славу лідара па колькасці самагубстваў у краіне. Калі б не названая служба, колькасць фактаў самагубства магла б быць большай.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Інфарм-укол

# Вырвацца з палону свабодных радыкалаў

**Свабодныя радыкалы — гэта хімічны фактар паскоранага старэння, разбурэння нашага арганізма. Пад уздзеяннем неспрыяльных фактараў навакольнага асяроддзя і проста ў працэсе жыццядзейнасці арганізма ўтвараюцца вельмі актыўныя часціцы. Узаемадзеянне іх з малекуламі нашых клетак прыводзіць да згубнай ланцуговай рэакцыі, дзе кожная нармальная малекула, якая ўступіла ва ўзаемадзеянне, у сваю чаргу з'яўляецца свабодным радыкалам, ператвараецца ў пагрозу здароўя клеткі і ўсяго арганізма у цэлым. Менавіта такія рэакцыі ў многіх выпадках з'яўляюцца асноўнай прычынай захворванняў. Астма, артрыт, варыкоз, атэрасклероз, дыябет і яшчэ безліч хваробаў так ці інакш — вынік дзеяння свабодных радыкалаў супраць чалавека.**

Кожная наша клетка тысячы і тысячы разоў падвяргаецца ўздзеянню гэтых агрэсараў. А прагрэс і наш нездаровы лад жыцця толькі спрыяюць павелічэнню іх колькасці ў навакольным асяроддзі і ўнутры арганізма. У выніку нарастаюць працэсы паскоранага старэння, правакуюцца запаленчыя працэсы ў тканках, парушаецца функцыянаванне сістэм крова- і лімфазабеспячэння, перыферычнай і цэнтральнай нервовай сістэм, аслабляецца імунітэт. Усе гэтыя працэсы — вынік пашкоджання клетачных мембран. Акрамя таго, свабодныя радыкалы валодаюць і мутагеннымі вартасцямі, здольныя правакаваць развіццё анкалагічных і спадчынных хваробаў.

Аднак калі ёсць «шкодныя» аксіданты, значыць, існуюць і карысныя антыаксіданты, якія дапамагаюць процістаяць разбуральнаму ўздзеянню свабодных радыкалаў. Найбольш актыўныя антыаксіданты — караціноіды (вітамін А), аскарбінавая кіслата (вітамін С), такаферолы (вітамін Е) і мікраэлемент селен. Яны спыняюць ланцуговую рэакцыю, выкліканую шкоднымі радыкаламі, зніжаюць узровень пашкоджання тканак, дапамагаюць процістаяць інфекцыям, паскараюць працэсы выздараўлення. Іншымі словамі, антыаксіданты запавольваюць працэс старэння арганізма і павялічваюць працягласць жыцця чалавека.

Сучасныя ўмовы жыцця, да якіх у тым ліку адносіцца і недахоп карысных рэчываў у прадуктах харчавання, дазваляюць сказаць аб неабходнасці ўжывання вітамінных комплексаў. Іх цяпер — вялікае мноства. Мяняйце іх, і гэта дазволіць забяспечыць арганізм не толькі вышэйзгаданымі антыаксідантамі, але і многімі іншымі патрэбнымі нам мікраэлементамі і вітамінамі. Ужывайце таблеткі ці капсулы не штодня, а, як раяць спецыялісты, з лёгкай забыўлівасцю.

# Для чаго прыдуманы прышчэпкі?

**Імунапрафілактыка (прышчэпкі) налічвае звыш 200 гадоў, і дагэтуль няма ніводнага больш эфектыўнага метаду абароны ад інфекцый. Імунізацыя ажыццяўляецца да найбольш цяжкіх інфекцый, якія даюць высокую інвалідызацыю і лятальнасць.**

Работа на садовым участку, рамонт машыны, уборка кватэры, аўтааварыя — любое пашкоджанне скуры можа прывесці да слупняку. Абарона ж вельмі простая — адна прышчэпка кожныя 10 гадоў. Гэтаксама можна пазбегнуць такога цяжкага захворвання, як дыфтэрыя. Што датычыцца шырока распаўсюджанага віруса гепатыту В, то, як вядома, хворы і вірусаносьбіт вылучаюць узбуджальнік з усімі вадкасцямі арганізма (сліна, сляза, пот, мача, сперма і інш.). Таму шляхі заражэння — самыя розныя. Ад палавога кантакту і пацалунку да ўвядзення нестэрыльным шпрыцам прэпарата. Любыя медыцынскія маніпуляцыі — пераліванне крыві, роды, стаматалагічная дапамога або звычайны пірсінг могуць быць прычынай заражэння вірусам гепатыту В. У носьбіта віруса праз пэўны час можа развіцца цыроз печані або рак. Імунапрафілактыка абараняе і ад гэтых цяжкіх станаў.

Жанчыны, якія плануюць цяжарнасць, павінны атрымаць вакцынацыю ад краснухі, калі не хварэлі на яе. Калі вірус краснухі паражае плод на ранніх стадыях цяжарнасці, то гэта прыводзіць да выкідышу, калі ў перыяд закладкі органаў, то паражае органы слыху, зроку і сэрца. Адна прышчэпка стварае імунітэт на 20—25 гадоў. Неабходна памятаць, што на працягу нейкага часу пасля вакцынацыі нельга планаваць цяжарнасць.

Не грэбуйце кансультацыяй кампетэнтных спецыялістаў адносна прышчэпак. І не бойцеся рабіць прышчэпкі!

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

Транспартная філасофія

# САКРЭТ ВАДЗІЦЕЛЬСКАЙ САЛІДАРНАСЦІ

**Мне было 9 гадоў, калі я адкрыла сакрэт вадзіцельскай салідарнасці**

Мы едзем з татам на машыне ў Брэст, гэта больш за паўсотні кіламетраў ад дому.

— Скінь хуткасць: схаваліся недзе, — кажа дзядзя Валодзя, які едзе з намі.

Хто схаваўся? Адкуль ён ведае?

— Што, падміргнуў? — падтрымлівае размову бацька. — А я і не заўважыў.

Дык і я нічога не заўважыла. Хто там каму падміргнуў? Але хуткасць тата збавіў.

— Гэта мы пра даішнікаў, — заўважыўшы маю збянтэжанасць, тлумачыць бацька. — А вось і яны. Бачыла, машына насустрач ехала? Яе вадзіцель міргнуў фарамі — значыць, папярэдзіў, што хутка будзе патрульная машына ДАІ.

— Адкуль ты яго ведаеш? — усё яшчэ не разумею я.

— Даішніка? Дык яго і не ведаю.

— Ды не, вадзіцеля, што падміргнуў.

— І яго не ведаю.

— Як не ведаеш, ён жа папярэдзіў цябе!

Бацька расказаў мне, што ўсе вадзіцелі аднойчы дамовіліся дапамагаць адзін аднаму. З тых часоў і папярэджваюць, падміргваючы фарамі. А я, маленькая, наіўная, ніяк не магла паверыць, што дарослы незнаёмы дзядзька, які ніколі да гэтага не бачыў нас і, хутчэй за ўсё, не ўбачыць, вырашыў нам дапамагчы. Я ж добра ведала, якія прагматычныя і карыслівыя дарослыя. Але нават у іх бывае вадзіцельская салідарнасць!

**У 17 гадоў я расчаравалася ў вадзіцельскай салідарнасці**

Мы каталіся з сябрам на машыне. І не разлічылі: за горадам скончыўся бензін. Уключылі «аварыйку», выйшлі з машыны і чакаем дапамогі. Праехала адна машына, другая, трэцяя... На дварэ сцямнела. Стала страшна і холадна. Маці дома хвалюецца. А мы сядзім ля нерухомай машыны і нічога зрабіць не можам.

У лесе ля дарогі пачуўся смех, завіднелася вогнішча — нехта прыехаў на шашлыкі. Сябар узяў каністру і пайшоў на разведку. А я зачынілася на ўсе замкі, сяджу ў цёмнай машыне і чакаю. Прыйшоў ні з чым. Кажа, толькі адмахнуліся: самім мала.

Прайшло гадзіны паўтары, і мы спынілі першую машыну.

— Не, — кажуць, — бензіну ў нас няма раздаваць, і цягнуць да горада вас не можам. Можам толькі дзяўчыну падкінуць дадому...

Дапамог нам толькі знаёмы матацыкліст, калі раніцай ехаў па грыбы і знайшоў нас на ўзбочыне з уключанай «аварыйкай».

**У 22 гады я пераканалася, што на дарозе салідарнасці не бывае**

Мы ехалі ў машыне «Хуткай дапамогі». Мы стаялі на кожным светлафоры, бо не маглі выехаць з агульнага патоку. Ніводзін вадзіцель не дазваляў нам абагнаць яго. А калі спрабавалі, то несусветная лаянка сыпалася ў наш бок. Добра, што не кожнае слова можна прачытаць па вуснах праз шкло другога аўтамабіля.

Мы паспелі. Але я больш ніколі не паверу, што бываюць салідарныя вадзіцелі. Можаце пераканаць мяне ў іншым? Паспрабуйце! Сустрэнемся на дарогах!

**Таццяна САЛДАЦЕНКА.**



**ХТО НА РАБЧЫКА?**

З 6 верасня ў краіне будзе дазволены сезон палявання на рабчыка і шэрую курапатку. На працягу светлага часу сутак можна будзе паляваць на птушак з падыходу, з засады, з падманьваннем.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Простыя рэчы




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Не ведаю, як у вас, а для мяне пры слове возера — адразу ў памяці паўстае наша Нарач, караль, які скінуў на Беларусь Бог са сваёй ласкі на здзіўленне і замілаванне людзей. Некалі, калі я быў маладзейшы гадоў на трыццаць, праводзіў належных 24 дні ў доме адпачынку на Нарачы. А да гэтага ад аднаго з беларускіх паэтаў чуў, што яны ўдвух абышлі возера пехам, пабачылі ўсе яго берагі. А чаму б і не паўтарыць такі «хадж» (слова мусульманскае, азначае наведванне Меккі). Але ж наша Нарач па вартасці ці не роўная Мецце? Дамовіліся з доктарам, які жыў у адным пакоі са мной. Ён, шчыры беларус, таксама загарэўся гэтай ідэяй. Сабраліся ў дарогу. Назапасілі прадуктаў, сітра (тады яшчэ не было тых разнастайных ахаладжальных напояў, што прапануюць сённяшнія крамы). Але памылкай нашай было тое, што з сабою запрасілі дзвюх знаёмых з дома адпачынку. Яны даволі бадзёра дайшлі з намі амаль што да Занарачы. Але тут запратэставалі, стаміліся, хаця сцяжынка ўжо ў тыя гады была досыць роўная, вытаптаная. Давялося ў Занарачы пасадзіць іх на аўтобус для вяртання назад. А мы з Мікалаем усё-такі прадоўжылі. Каля Гатавіч сустрэліся з платамі, якія агароджвалі тагачасныя ўрадавыя дачы. А ў Мікольцах вырашылі прыпыніць сваё пешае падарожжа і мы. Тут, па беразе возера, практычна над самай вадою, ішла шаша. Цяпер, наколькі ведаю, гэтай дарогі ўжо няма. А тады мы вырашылі за лепшае проста праехаць некалькі кіламетраў на спадарожнай машыне. Але кругаля вакол Нарачы зрабілі. І былі гэтым вельмі задаволеныя, нават расчуленыя. Яна, Нарач, мае вялікую сілу прыцягнення.

Ды што казаць, паводле археалагічных звестак, першы чалавек у наваколлі возера з'явіўся каля 11 тысяч гадоў таму, пра што сведчыць выяўленая стаянка канца палеаліту ва ўрочышчы Сцюдзянец, каля вёскі Занарач. Возера і паіла, і карміла чалавека. У кнізе Аркадзя Смоліча «Геаграфія Беларусі» чытаем:

«Воз. Нарач вельмі багатае на рыбу; у часе бураў вада выкідае на бераг шмат рыбы; існуе нават легенда аб тым, як у адзін неўраджайны год возера выкінула на бераг шмат рыбы, выратавала акалічнае насельніцтва ад голаду».

Між іншым, у час той не зусім удалай вандроўкі па беразе Нарачы праходзілі мы і каля домікаў, якія называліся «звяздоўскімі», — там адпачывалі супрацоўнікі газеты «Звязда». І каля дачы Максіма Танка. А ў яго ж ёсць паэма, якая так і называецца — «Нарач». Напісана яна ў далёкім 1937-м годзе:

*Гэта было ў тую ноч,*
*Як расцвілі верасы,*
*Як расцвілі у бары*
*Ў ззянні асенняй расы.*
*Сетку Таццяна пляла.*
*Нарачы хвалі гулі.*
*Пад аднастайны іх спеў*
*Сумныя думы плылі.*
*«Бацька рыбачыць даўно.*
*Можа, навеяла што*
*З ветрам у човен яго*
*Чорная Нарачы тонь?*

Нарач — унікальнае, але не адно возера ў гэтым рэгіёне Беларусі. Існуюць групы азёраў: Нарачанская, Мядзельская, Балдуцкая, Свірская. І кожнае з азёраў непаўторнае. Усяго ў нарачанскім краі іх каля паўсотні. І кожнае своеасаблівае, з уласцівымі толькі яму геаграфіяй, гісторыяй. Гэта і скарб духоўны, нібы ў чароўным куфэрку тут назапашаны чалавечай памяццю паданні, легенды, прыказкі і прымаўкі. Каб азёры маглі гаварыць — яны б расказалі нам шмат цікавых апавяданняў пра вадзянікоў і русалак, рыбакоў і аматараў вандровак, птушак і звяроў.

Нездарма створана тут дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова «Нацыянальны парк «Нарачанскі». Некалькі гадоў таму нацыянальным паркам была выдадзена серыя фотаздымкаў менавіта аб азёрах. Паэты прыклалі свае намаганні таксама. Зразумела, не можна было абысціся без вершаў Максіма Танка:

*Люблю твае, Нарач,*
*затокі і тоні,*
*Як вецер густыя туманы*
*развесіць.*
*Ці снежная пена*
*на хвалях зазвоніць,*
*Цалуючы зоры,*
*калышачы месяц.*

Вось як пра возера Мёртвае, ёсць і такое невялікае возера ў гэтым рэгіёне, напісаў Ігар Пракаповіч:

*Шаптаў замову варажбіт,*
*Сарока ў вербах сакатала.*
*І ў возеры застыў блакіт,*
*І яно Мёртвым раптам стала..»*

Знайшлі ўкладальнікі выдання і вершы Уладзіміра Дубоўкі пра возера Мястра:

*Ля Мядзела ёсць возера адно.*
*Над ім дубы шумяць,*
*гамоняць сосны.*
*У ім, як у празрыстай кроплі*
*роснай,*
*Для воч ніколі не закрыта дно.*

А вось як пра возера Глубелька напісала Т. Малышава:

*Але тут кажуць людзі, на ранку*
*Сонца плёснецца*
*з неба заранкай —*
*І вада стане зразу пунсовай,*
*Іншым здасца, як ружа ружовай.*

Быў аказаны давер напісаць пра некаторыя азёры нарачанскага краю і мне. Прывяду адзін верш, пра возера Белае, яго яшчэ ў мясцовых гаворках называюць Бледнае, Бляда.

*Як люстраное, самлелае,*
*Нібы дзяўчына нясмелая —*
*Стрэціцца возера Белае.*
*Наша, славянскае, цэлае.*
*Возерам гэтым наш прашчур*
*Дзетак-малеч сваіх лашчыў.*

Як бачыце, пачаў ад Нарачы — і затанцаваў. А між іншым на поўнач ад маіх родных Пастаў ляжыць Браслаўская група азёр, якія па сваёй прыгажосці, чысціні зусім не саступаюць нарачанскім. Нездарма і тут створаны Браслаўскі нацыянальны парк, дзе найперш шануюць і ахоўваюць менавіта азёры.

Наколькі ведаю, сярод старых пастаўчан існуе, магчыма, справядлівае, а магчыма і не, меркаванне, што нарачанскія азёры «сцягваюць» ад нас дажджы. І сапраўды, ужо шмат гадоў наша мясцовасць пакутуе ад недахопу дажджоў. Да нас дажджы ідуць, як правіла, з Літвы. І вось ужо хмары насоўваюцца, але раптам іх пачынае цягнуць альбо на Браслаўшчыну, альбо на Мядзельшчыну — там літаральна залівае, а ў нас толькі калі-нікалі кропелька праслізне. Думаю, што тут ёсць нейкая рацыя. Вялікія водныя масівы павінны мець нейкія прыцягальныя сілы.

У той жа час і Пастаўскі раён не абдзелены азёрамі. Праўда, невялікімі. Падлічыў: у межах нашага райцэнтра і на яго ўскраінах невялікіх азёр цэлы дзясятак.

Ёсць за кіламетр ад горада азярына (такое слова ў нашай мясцовасці ўжываецца) Камарок. Невялічкае, круглае, кругом суцэльна лес. У сваім дзяцінстве мы яго, як кажуць, апаролі. І знайшлі ў гэтым азярцы мноства люстраных карпаў, кожны пад кілаграм вагі. Лавілі іх на чарвяка, нават на хлеб. Помню, прывёз на гэта азярцо мінскіх паэтаў. Яны былі літаральна зачараваныя некранутасцю наваколля. І ўсяго за кіламетр ад горада.

А вось хто з іх усклікнуў:

*Я даю сабе зарок —*
*Не хадзіць на Камарок!..*

— ужо і не помню. Сапраўды, і гэта возера мае незвычайную прыцягальную сілу. Там не пакупаешся — пляжаў і нават звычайных падыходаў няма. Дрыгва. У возеры шмат карчоў, дно непрыдатнае. Нават лодку спусціць цяжка. І разам з тым вада празрыстая, вабіць — і ўсё тут.

Прачытаў, што расіяне ўсур'ёз вырашылі заняцца вывучэннем свайго возера Байкал — найбуйнейшага ў свеце рэзервуара прэснай вады. Для гэтага будуць выкарыстоўваць самую сучасную глыбінную тэхніку. Шмат таямніц адкрыюць, безумоўна. Але ж у нас таксама на азёрах ёсць свае таямніцы. Узяць Балдук, што на мяжы Пастаўскага і Мядзельскага раёнаў. Сцвярджаюць і нават арганізуюцца экспедыцыі па адшуканню пачвары, якая нібыта знаходзіцца ў гэтым возеры. Ці возера Доўжа ў Пастаўскім раёне, глыбіня якога яшчэ дастаткова і не прамерана, якое вузкай расшчылінай на восем кіламетраў цягнецца між крутых схілаў. Ці возера Шо ў Глыбоцкім раёне, дзе на дне ў яснае надвор'е можна разгледзець нешта рукатворнае...

Ёсць у мяне адзін успамін, звязаны з возерам, праўда, не зусім прыемны. Але прайшло з таго часу больш за трыццаць гадоў. Можна і ўспомніць. Прычым з пакаяннем. Прыехалі да мяне госці з Мінска. Чым пачаставаць-здзівіць? А якраз у авіяцыйнай часці ўмельцы вырабілі першыя электравуды, паводле прынцыпу электратралаў, якія тады яшчэ шырока выкарыстоўваліся ў прамысловай здабычы рыбы. Вось і паехалі мы на азярцо, якое таксама недалёка ад Пастаў, кіламетр нейкі. Прывезлі лодку і гэту самую электравуду. Азярцо па сваёй акрузе нейкіх два кіламетры. Аб'ехалі мы яго за гадзіну. Але злавілі трыццаць вугроў. Перад мінчукамі быў я горды. А назаўтра — так атрымалася — прыехаў у рэдакцыю раённай газеты супрацоўнік з часопіса «Прырода Беларусі». І пачаў расказваць мне пра шкоднасць, якую наносяць рыбе гэтыя самыя электравуды. Прызнаюся, згараў ад сораму. Пасля гэтага зарокся, ні ў якіх падобных мерапрыемствах удзелу не прымаў.

А чым жа закончыць свой аповед пра адносіны з возерам? Не, ёсць жа мой любімы Пімен Панчанка. І яго верш «Дзеці над возерам»:

*Гуляюць дзеці каля возера,*
*А неба з сонцам — у вадзе.*
*Дзяцей шматвопытныя позіркі*
*Заваражыў пагодны дзень.*
*Яны прыехалі ўсе з горада*
*І ўпершыню пад птушак спеў*
*Накінуліся, нібы з голаду,*
*На дзіўны свет і траў і дрэў..»*

**Алесь КАСЦЕНЬ.**

*г. Паставы.*

## Банкаўскія ўклады — у каштоўных металах і камянях

**Пералік банкаўскіх аперацый ААТ «ААБ Беларусбанк» і «Пріорбанк» ААТ пашырыўся.**

ААТ «ААБ Беларусбанк» атрымаў права на правядзенне куплі-продажу каштоўных камянёў, а «Пріорбанк» ААТ — на адкрыццё і вядзенне рахункаў у каштоўных металах, ажыццяўленне куплі-продажу каштоўных металаў і камянёў у выпадках, прадугледжаных беларускім заканадаўствам, а таксама на прыцягненне і размяшчэнне каштоўных металаў і камянёў ва ўклады (дэпазіты).

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Нумізматаў — з «прыбаўленнем»

**Нацыянальны банк вырашыў адчаканіць дадаткова шэраг памятных манет, якія не планаваліся да выпуску ў гэтым годзе, паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнай банкаўскай установы краіны Міхаіл Журавовіч.**

У прыватнасці, сёлета мяркуецца ў рамках міжнародных манетных праграм адкрыць дзве новыя серыі: «Праваслаўныя святыя» і «Парусныя караблі». Так, у серыі «Праваслаўныя святыя» свет пабачаць памятныя манеты, якія будуць прысвечаны Серафіму Сароўскаму, Сергію Раданежскаму, Мікалаю Цудатворцу, Панцеляймону, Ефрасінні Полацкай, а ў серыі «Памятныя караблі» — паруснiку «Сядоў».

Выпуск залатых памятных манет з устаўкамі з брыльянтаў працягне манета «Рысь». Да таго ж у Нацыянальным банку пры распрацоўцы дадатковага пераліку манет на гэты год улічылі і апошнія тэндэнцыі на еўрапейскім рынку, а менавіта — узрослы попыт на сярэбраныя манеты з устаўкамі з камянёў «Сваroўскі». А таму зараз рыхтуюцца да чаканкі дзве памятныя манеты «Рысь» (з эскізам ідэнтычным залатой памятнай манеце «Рысь»), а таксама — «Рысі». Акрамя таго, у абарачэнне выйдуць манеты «Давыд Гаврадзенскі» серыі «Умацаванне і абарона дзяржавы», «Дзяды» серыі «Святы і абрады беларусаў» і «Заказнік «Ліпічанская пушча» серыі «Заказнікі», а ў рамках міжнародных манетных праграм — «Алімпійскія гульні 2010. Фігурнае катанне» і серыі «Казкі народаў свету» — «Турандот». А манеты «Мінск. Сталіцы краін ЕўрАзЭС» будуць выпушчаны ў рамках манетнай праграмы цэнтральных (нацыянальных) банкаў дзяржаў — удзельніц ЕўрАзЭС.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# Ту Цзын Цзын — ЦЁЗКА «ЗВЯЗДЫ» З КІТАЯ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**З Лерай мы пазнаёміліся выпадкова, хоць, як мне здаецца, быў у гэтай выпадковасці і нейкі элемент заканамернасці, пра што я раскажу крыху ніжэй. Карацей, па волі лёсу мы аказаліся спадарожнікамі ў набітай пасажырамі звыш меры маршрутцы на Смілавічы. Адзін з хлопцаў папрасіў перадаць вадзіцелю грошы на адзін білет «да Турцыі», г.зн. да вёскі Турэц, якая знаходзіцца крыху далей за пасёлкам. Тут бы і недасведчаны суайчыннік сумеўся, таму я цалкам зразумеў разгубленасць у вачах спадарожніцы і двойчы адказаў на яе нерашучаздзіўленае пытанне: куды, як правільна? Акцэнт мяне (Лера сама спытала), у сваю чаргу, таксама не здзівіў: раней у Смілавічах вучыліся в'етнамцы, афганцы, прадстаўнікі сярэднеазіяцкіх рэспублік. Але спадарожніца аказалася кітаянкай. Яна ехала ў госці да сяброў на дачу, якая знаходзілася за некалькі соцень метраў ад хаты маіх бацькоў, побач з домам аднакласніцы. Так жа выпадкова мы маглі сустрэцца і ў Заслаўлі, дзе бывала Лера і дзе дом цесця. Мы шмат гадоў сябруем з Інэсай Плескачэўскай, якая даўно жыве ў Пекіне і з чыіх рэпартажаў большасць беларусаў даведваюцца пра жыццё ў Кітаі і саміх кітайцаў. У рэшце рэшт сапраўднае кітайскае імя Леры — Ту Цзын Цзын — перакладаецца як назва нашай газеты. Лера, у адрозненне ад рускай, не вельмі ведае беларускую, таму на слых, як мы сумесна жартам вырашылі, будзем лічыць яе поўнай цёзкай нашага выдання (сапраўды, ці вялікая розніца паміж рускай зоркай і беларускай «Звяздой», асабліва ў «кітайскім» кантэксце)...**

### РАДЗІМА

Нарадзілася Ту Цзын Цзын у горадзе Ян Чжоў правінцыі Дыян Су. Гэта поўдзень Кітая. У адрозненне ад індустрыяльнай поўначы, у гэтай частцы краіны пераважае сельская гаспадарка. Кліматычныя ўмовы на «поўдні поўдня» дазваляюць здымаць больш за чатыры ўраджаі за год. Праўда, у мясцовасці, дзе нарадзілася суразмоўца — толькі два.

Горад Ян Чжоў — невялікі. Натуральна, па кітайскіх мерках: у ім пражывае «ўсяго» 1,5 мільёна чалавек. Больш-менш буйны горад, кажа Лера, гэта недзе 2 мільёны жыхароў. Дарэчы, кітайцы, калі трапляюць у Беларусь, па першым часе пытаюцца: а дзе ў вас людзі? Як дзе, вось жа ідуць па вуліцы! Не, мы бачым, а дзе ўсе астатнія?.. Па гэтай жа прычыне кітайцы могуць падацца нам крыклівымі, хоць па сваёй сутнасці яны зусім іншыя. Проста, каб быць пачутым сярод мноства людзей, яны вымушаны гаварыць гучней і гэта звычка пэўны час спрацоўвае і за межамі роднай краіны. Затое калі самі кітайцы вяртаюцца з той жа Беларусі дадому, яны па першым часе пакутуюць ад... моцнага шуму навокал, маўляў, як вы ў ім можаце жыць.

### БАЦЬКІ

Сям'я Леры жыве ў гарадской кватэры, яна — адзінае дзіця ў сям'і. Чытачы, напэўна ж, ведаюць пра ўстаноўку кітайскіх уладаў: адна сям'я — адно дзіця, якая дзейнічае апошнія дзесяцігоддзі ў мэтах кантролю за прыростам насельніцтва і без таго шматмільённай краіны. Хоць у сям'і бабулі, маці бацькі, было восем дзяцей. Лера кажа, што, магчыма, гэтую ўстаноўку на адно дзіця ўлады адменяць: у краіне шмат пенсіянераў, колькасць якіх павялічваецца, і, каб іх утрымліваць, патрэбна шматлікае маладое пакаленне.

Бацьку Леры 50 гадоў, ён працуе ў банку, маці — 45 гадоў, яна прадавец у магазіне. Ёй самой — 23, зноў жа, па кітайскіх мерках, а па нашых — 22. У кітайцаў прынята адлічваць узрост не з моманту нараджэння, а з моманту зачацця.

Лера кажа, што ў іх, калі ствараецца маладая сям'я, дык яна імкнецца жыць асобна, хоць бывае дастаткова часта, што мусіць і з бацькамі. Апошнія падтрымліваюць дзяцей калі трэба, у тым ліку і матэрыяльна (кітайцы доўга вучацца, пра што мы раскажам асобна). Прынамсі, Ту Цзын Цзын дагэтуль застаецца для сваіх маці і бацькі дзіцем, смяецца, што застанецца ім і ў больш сталым узросце. Аднак ніякага ціску з іх боку не адчувае, вольная сама прымаць рашэнні ў жыцці, вызначаць свой лёс.

### АДУКАЦЫЯ

Школьная адукацыя ў Кітаі складаецца з пачатковай (шэсць гадоў), сярэдняй (тры гады) і вышэйшай (таксама тры гады). Абавязковай з'яўляюцца дзве першыя ступені — пачатковая і сярэдняя (г.зн. дзевяць гадоў вучобы). Пасля можна пайсці ў навучальныя ўстановы кшталту нашых колішніх тэхнікумаў — цяперашніх каледжаў. Вучацца там, як і пры вышэйшай ступені школьнай адукацыі, таксама тры гады, але паралельна малады чалавек набывае нейкую пэўную спецыяльнасць, прафесію. У школу звычайна ідуць у восем гадоў, хоць сама Лера пайшла ў сем («настаўнікі спыталі, ці хачу вучыцца, я адказала, што так»).

Усе ступені адукацыі — платныя і цана за навучанне, як зазначыла Лера, увесь час павялічваецца. «Калі я вучылася ў школе, плата была больш танная». Да прыкладу, за месяц знаходжання хлопчыка ці дзяўчынкі ў дзіцячым садку трэба заплаціць 200 долараў, што даволі шмат па тамтэйшых мерках. Так, за такую цану, як кажуць, дзіцяці будзе аказаны «поўны комплекс паслуг» — яно будзе накормлена, дагледжана і г.д., але ж і ў сям'і яго трэба карміць, набываць адзенне, цацкі.

Ва ўніверсітэтах (акрамя медыцынскіх) звычайна вучацца чатыры гады, таксама на платнай аснове. Безумоўна, калі сям'я не можа сабе дазволіць аплаціць навучанне, яе падтрымліваюць: студэнт можа вучыцца або за значна меншую суму, або бясплатна — за кошт навучальнай установы. Аднак потым такі чалавек можа быць размеркаваны ўніверсітэтам на канкрэтнае працоўнае месца і будзе абавязаны адпрацаваць на ім вызначаны тэрмін.

### ПАРТЫЯ

Лера — камуністка. Гэта без жартачкаў, хоць, гаворачы пра сябе такія словы, напэўна, ужо не першы раз, яна прызвычаілася і да зваротнай рэакцыі. Але для яе самой тут усё сур'ёзна: сама хацела ўступіць у Камуністычную партыю і калі гэтая мара (без перабольшвання) збылася, адчула вялікі гонар. Гаворыць, што калі паступала ва ўніверсітэт, бацькі ёй далі такую ўстаноўку, загад, смеючыся адзначыла дзяўчына: па-першае, атрымаць стыпендыю (а выдатнікі, аплачваючы вучобу, разам з тым могуць атрымліваць і стыпендыю); па-другое, абавязкова ўступіць у партыю; па-трэцяе, з хлопцамі не сябраваць (пра гэта мы раскажам асобна ніжэй). Уступіць у партыю, дарэчы, не так проста: такое права ёсць толькі ў выдатнікаў вучобы і ва ўніверсітэце такіх студэнтаў было няшмат. Убачыўшы такое сур'ёзнае стаўленне да гэтага факта з боку суразмоўцы, свае жарты я па большасці пакінуў пры сабе, хоць, адчувалася, не я першым спрабаваў з гэтай нагоды «падкалоць» Леру.

### МОЛАДЗЬ

Паступіць у ВНУ ў Кітаі даволі складана: надзвычай вялікая канкурэнцыя. Таму тыя, каму пашчасціла, увесь час аддаюць вучобе. Студэнцкі гарадок — гэта сапраўды нібы горад у горадзе, дзе для вучобы і жыцця ёсць усё. Але я так і не зразумеў, як адпачываюць кітайскія студэнты, ды і сама Лера некалькі разоў заўважала, што кітайцы не ўмеюць адпачываць (прынамсі, у нашым разуменні). Спытаў пра нейкія забавы, дыскатэкі. «Так, ёсць, але ходзяць туды пераважна школьнікі». Ну, а што з узаемаадносінамі паміж паламі? Паводле слоў Леры, ва ўніверсітэце нельга ўзяць шлюб — адразу выганяюць (дарэчы, камуністам тут таксама няма ніякіх паслабленняў). Ім выкладчыкі так і кажуць: раз вы хочаце вучыцца, уступаць у шлюб нельга. Тыя, хто хоча аформіць сямейныя адносіны ў дастаткова раннім узросце, могуць зрабіць гэта падчас вучобы ў магістратуры ці аспірантуры — тады ўжо дазваляецца. Дарэчы, мне здаўся цікавым наступны факт: жыць разам неафіцыйна (без рэгістрацыі шлюбу) хлопцу з дзяўчынай можна. Як я пажартаваў, каб не псаваць статыстыку?

Звычайна ж кітайцы ствараюць сем'і ва ўзросце 34—35 гадоў, калі і адукацыя ўжо атрымана, і месца працы з неблагім заробкам ёсць. Атрымаць крэдыт на жыллё, як сказала Лера, у іх можна даволі лёгка. Перад вяселлем бацькі і родныя з двух бакоў звычайна вырашаюць: хто і што будзе з мэблі, бытавой тэхнікі і інш. дарыць маладым для іх сумеснага жыцця. Аўтамабілі ў краіне дарагія, наяўнасць машыны ў сям'і — першая прыкмета заможнасці, у пэўным сэнсе статусная рэч.

### МОВА

Чаму Ту Цзын Цзын пачала вывучаць менавіта рускую мову? Яна і сама зараз дакладна не ведае. У школе восем гадоў вывучала англійскую, яна крыху надакучыла. Ва ўніверсітэце таму адмовілася ад яе, не падышла ёй і японская (трэба ведаць стаўленне кітайцаў да заваёўніцы Японіі). Узялася за вывучэнне рускай мовы (дагэтуль не ведала ніводнага слова па-руску). Кажа, напачатку было цяжкавата, а потым пакрысе неяк уцягнулася, захацела ведаць і больш, і лепш. Дарэчы, гэтая цяга дагэтуль не прайшла, толькі ўмацавалася (памятаеце пра збянтэжанасць і «білет да Турцыі»?).

Там жа, ва ўніверсітэце, ад рускай выкладчыцы яна і атрымала імя Лера. Цяпер ужо прызвычаілася да яго, а напачатку было неяк некамфортна. Ды і напачатку вывучэння мовы ёй вельмі цяжка давалася вымаўленне гуку «р». І Лера вельмі шкадавала, што яна не Аксана, дзе няма «р».

Ва ўніверсітэце на поўначы сваёй правінцыі Ту Цзын Цзын правучылася чатыры гады, скончыла яго ў 2007 годзе, атрымала прафесію лінгвіста з правам выкладання рускай мовы і літаратуры. Ведала рускую мову лепш за ўсіх, чым на абароне дыплома літаральна шакіравала іншых студэнтаў. А выкладчыкі не хацелі яе адпускаць, жадалі, каб яна засталася ў навучальнай установе, выкладала. А дабіцца такіх поспехаў Леры дапамагла моўная практыка.

### СЯБРЫ

Калі яна адвучылася ва ўніверсітэце два гады, аднойчы была ў магазіне з маці. Сюды зайшлі рускія (насамрэч яны аказаліся беларусамі-мінчанамі) нешта купіць. Без перакладчыка. Лера кажа, што адразу, ледзь пачуўшы рускую мову, практычна «ўпала ў ступар», але выгляду не падала. Як я пажартаваў, ад шоку, што яшчэ нехта акрамя яе ведае рускую мову. Яна проста спужалася, ці будзе дастаткова яе ведаў пры магчымых зносінах. І толькі ў апошні момант, калі пакупнікі ўжо практычна выйшлі з магазіна, маці здагадалася спытаць у дачкі: а на якой мове яны размаўлялі, часам не на рускай?

Вось так пазнаёміліся з мінчанамі, пасябравалі. Потым яны ўзялі да сябе Леру перакладчыцай (вельмі дапамаглі з моўнай практыкай). Таму калі з'явілася жаданне прадоўжыць адукацыю, выбар, можна сказаць, быў наканаваны — Беларусь. Ужо тут Лера прадоўжыла супрацоўніцтва са сваімі беларускімі сябрамі, нават жыве ў сям'і іх сваякоў.

### БЕЛАРУСЬ

Трэба сказаць, што шмат добрых слоў пра нашу краіну, людзей, магчымасці навучання Лера чула і раней, прычым ад свайго дзядзькі. Ён скончыў Гомельскі медуніверсітэт, пэўны час працаваў у горадзе, быў вядомым чалавекам, расказала дзяўчына. Цяпер ён, дарэчы, працуе ў Кітаі ў тым самым універсітэце, які скончыла Лера. Пасля такой рэкамендацыі яна практычна не сумнявалася, што абавязкова паедзе толькі ў Гомель. Аднак новыя сябры сказалі: тады ўжо лепш у сталіцу. І дапамаглі ажыццявіць мару.

Лера ў захапленні ад многіх рэчаў у нашай краіне, ад стасункаў з людзьмі. Цяпер сама пры выпадку кажа іншым кітайцам тое, што некалі гаварыў ёй дзядзька.

Пакуль яна мала яшчэ дзе паспела пабываць, але дакладна ведае, што хоча наведаць Гомель, Віцебск, убачыць Брэсцкую крэпасць. Магчыма, з цягам часу патрапіць і ў суседнія Украіну і Расію (у Маскве была толькі праездам).

З захапленнем гаворыць пра нашу прыроду, краявіды. Кітайцы ўвогуле, паводле слоў Леры, называюць Мінск горадам у лесе. У Кітаі любы куточак з расліннасцю абносяць агароджай і робяць паркам. У нас у гэтым сэнсе — сапраўды рай.

### КЛІМАТ

У мясцінах, дзе нарадзілася Ту Цзын Цзын, раней улетку спёка магла даходзіць да 33 градусаў і гэта лічылася вялікай гарачынёй. Зараз часам бывае і плюс 38 градусаў і нічога, кажа, ужо прызвычаіліся. Хоць там у іх без кандыцыянераў летам жыць немагчыма. Цікавая дэталь: кватэры ў шматпавярховіках у яе родным горадзе не маюць цэнтральнага ацяплення. Але зімой у жыллі ўсё ж бывае халаднавата і даводзіцца хутацца. Дарэчы, там зімой максімальна можа быць мінус 10 градусаў і гэта лічыцца дастаткова вялікім холадам. Клімат у родных мясцінах яшчэ і вільготны, дзьмуць вятры, таму асабліва зімой надвор'е не песціць.

Як прызналася Лера, тут у сэнсе надвор'я яна адчувае сябе больш прыемна. Хоць яна чула, што зімой у Беларусі бываюць моцныя маразы. Пасмяялася, прыгадаўшы, як прыехала да нас летам у цёплых зімовых ботах. Хоць пра Беларусь у яе было дастаткова аб'ектыўнай інфармацыі, вядома ж, не абышлося і без некаторых перадузятых апасенняў.

Лера сказала, што ў кітайцаў не прынята распранацца нават у самую спёку, прынамсі, да такой ступені, як часам можна ўбачыць, асабліва ў дачыненні да дзяўчат, на мінскіх вуліцах. Калі па кітайскай вуліцы ідзе такі паўаголены чалавек — гэта стопрацэнтна іншаземец. Тамтэйшыя жыхары ў такой сітуацыі могуць нават адвярнуцца ўбок — ад уласнай сарамлівасці.

Міні-спаднічкі кітайскім дзяўчатам насіць нельга. Лера сказала, што нават у Беларусі, удалечыні ад радзімы, ніколі іх не насіла, што нават у спадніцы вышэй калена адчувае сябе часам не вельмі камфортна. У Кітаі на пляжы ўсе дзяўчаты будуць абавязкова ў закрытых купальніках. Са смехам вызначылі, што хлопцам дазволена крыху больш — можна быць у плаўках.

### НАРОДЫ

Але самае галоўнае, безумоўна, гэта стасункі з людзьмі. Мы паспрабавалі ў агульных рысах параўнаць менталітэт, характар беларусаў і кітайцаў.

Па назіраннях Леры, кітайцы больш маўклівыя, носяць усё ў сабе, у беларусаў жа што на сэрцы, тое і на языку. Мы больш адкрытыя, ніводнага разу дзяўчыне не адмовілі ў дапамозе. На кітайцаў моцна паўплывалі ідэі Канфуцыя, а ён ставіў мужчыну — у грамадстве, у сям'і — на першае месца. У старажытныя часы дзяўчына павінна была знаходзіцца толькі ў сваім пакоі. ёй забаранялася гучна смяяцца, гаварыць, паказваць пры гэтым навакольным свае зубы і інш. Вядома ж, гэтага ўжо няма, але кітайскі мужчына па-ранейшаму галоўны ў сям'і.

Леру здзіўляе, колькі беларусы могуць выпіваць. Для кітайцаў п'янства — рэдкасць. І калі кітаец усё ж выпіў, ён абавязкова будзе сядзець дома, каб ніхто не ўбачыў.

### КУЛІНАРЫЯ

На маё жартоўнае пытанне пра бульбу, відавочна, не жадаючы нічым пакрыўдзіць, Лера адказала ў тым сэнсе, што, маўляў, бульба паўсюдна аднолькавая — у Беларусі, і ў Кітаі. Зразумела, кітайцы аддаюць перавагу рысу.

Некаторых звыклых для нас прадуктаў харчавання ў Кітаі няма. Прыгадваю, як Інэса Плескачэўская расказвала неаднойчы, што ў якасці жаданага пачастунку з радзімы чакае заўсёды чорны хлеб, селядзец і салёнае сала. Лера неяк чорны хлеб выпадкова пакаштавала яшчэ дома. Не спадабалася, ці не з жахам падумала: і гэта я буду ўвесь час есці ў Беларусі?! А зараз нічога — прызвычаілася. Падабаецца ёй і наша салёнае сала. Кітайцы яго гатуюць інакш — адварваюць (не салёнае, зразумела) з соевым соусам і спецыямі. Няма ў Кітаі і смятаны з маянэзам. Ту Цзын Цзын, калі прыехала да нас, напачатку ела смятану з баначкі як ёгурт. Палюбіла салаты з маянэзам, спадабаліся ёй і марынаваныя гуркі. Любіць супы: рыбны, грыбны, з капусты. Любімай стравай называе салату з кальмарамі і яблыкамі і аліў'е. А пра шашлыкі сказала, што беларускія значна большыя за кітайскія.

Прызналася, што гатаваць сама яшчэ не вельмі ўмее. І што пытанне, якое я тут жа ёй задаў — а як яна збіраецца карміць будучага мужа — чула ад сяброў ужо неаднойчы. Кажа, што ў Кітаі зараз моладзь не вельмі імкнецца асвойваць кулінарнае майстэрства для сям'і. Па-першае, з-за занятасці (вучобы), па-другое, з-за развітой сеткі грамадскага харчавання, дзе ўсё хутка, смачна і па кішэні. На долар можна няблага пад'есці.

### АЛІМПІЯДА

Гэтаму пытанню Лера ўзрадавалася неяк па-асабліваму. Кажа, што адчувае гонар за Кітай, за свой народ за тое, што ім выпаў лёс сустракаць Алімпійскія гульні. («Вы не можаце сабе ўявіць, што гэта для нас азначае».) Калі б зараз была на радзіме, абавязкова пайшла б у валанцёры. Гэта людзі, якія аказваюць падтрымку і дапамогу спартсменам, балельшчыкам у незнаёмай ім краіне — падказваюць, перакладаюць. Яна моцна плакала падчас эстафеты алімпійскага агню, калі ў некаторых краінах адбываліся інцыдэнты і не разумела — чаму? Ад стрэсу нават па целе пайшлі нейкія плямы. У думках было некалі наведаць Францыю, але цяпер, кажа, пасля такіх здарэнняў, калі перашкаджалі эстафеце, жаданне тое знікла.

Самой паехаць дадому на час Гульняў не выпала: і дарагавата, і пра гасцініцы, білеты трэба было паклапаціцца загадзя. «Хварэла» па тэлевізару. Вядома ж, за кітайскіх спартсменаў. Але гаворыць, што і за прадстаўнікоў іншых краін, у тым ліку і за нашых, хвалявалася. Леры падабаюцца многія віды спорту, але найбольш — настольны і вялікі тэніс, бег і бег з перашкодамі. Сама, дарэчы, некалі займалася менавіта бегам.

### БУДУЧЫНЯ

Спытаў, ці дапускае яна магчымасць, што можа ўступіць у шлюб з беларусам. Засмяялася, адказала, што некалі нават тэарытычна гэтага не ўяўляла, зараз ставіцца больш памяркоўна, маўляў, калі так складзецца лёс. Праўда, пры гэтым усё ж асцярожна згадвае пра розныя нацыянальныя асаблівасці кітайцаў і беларусаў, розныя звычкі.

Дарэчы, бацькі па гэтым пытанні на Леру не «ціснуць», сваю волю не навязваюць і жаніха ў Кітаі не падбіраюць. Калі будзе наканавана лёсам і выбарам дачкі, прымуць у сям'ю і зяця-беларуса. Для іх галоўнае — быць упэўненым, што Леры ад гэтага будзе добра. Для яе самой у такім выпадку галоўным будзе знайсці з выбраннікам агульную мову (не абавязкова кітайскую), каб ён цікавіўся Кітаем. Хоць, заўважыла Лера, «я пакуль не думаю пра жаніхоў».

Ту Цзын Цзын шмат хваліла Беларусь, аднак прызналася, што пакуль наша краіна падыходзіць для яе, хутчэй, як месца працы і адпачынку. Пастаянна жыць яна хацела б у Кітаі, прыязджаючы да нас на пэўны тэрмін на працу. Так, як мы ўжо гаварылі, яна шмат дзе хацела б пабываць у Беларусі, але і па роднай краіне ў яе ёсць жаданне падарожнічаць. У Пекіне яна была толькі аднойчы, хацела б зноў патрапіць у сталіцу, наведаць Шанхай, пабываць на поўдні краіны.

Паколькі практычна ўвесь час Лера праводзіць у рускамоўным асяроддзі, прызналася, што ёй не хапае зносінаў з суайчыннікамі на роднай мове.

...А пакуль Ту Цзын Цзын вучыцца на філалагічным факультэце ў магістратуры БДУ (адвучылася ўжо год з двух), прагна «ўсмоктвае» веды і з аптымізмам і надзеяй на спаўненне ўласных мараў і памкненняў пазірае на будучыню.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# САЦЫЯЛЬНЫ ІМУНІТЭТ

**1 верасня школьны званок прагучаў для больш чым 172,5 тысячы юных жыхароў сталіцы. Трэба прызнаць, што папярэдні навучальны год завяршаўся для ўсіх трывожна — мэтазгоднасць 12-годкі была пастаўлена пад сумненне, што аўтаматычна цягнула шмат пытанняў, адказы на якія даў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі». Аб тым, як будзе ўвасабляцца на практыцы пераход агульнаадукацыйнай школы на 11-гадовае навучанне, ці не пацерпяць школьнікі ў выніку адмовы ад профільнай дыферэнцыяцыі, што давядзецца зрабіць, каб пераходны перыяд аказаўся і для дзяцей, і для педагогаў найменш «хваравітым», ішла размова на гарадской жнівеньскай педагагічнай канферэнцыі «Адукацыя — устойліваму развіццю сталіцы».**

Не сакрэт, што згубіць арыенціры ў сучасным імклівым свеце, калі інфармацыйныя нагрузкі пастаянна растуць, зусім нескладана. Чаму, як і для чаго трэба вучыцца — адказаў на гэтыя пытанні нярэдка няма не толькі ў бацькоў, але і ў педагогаў. Між іншым, XXI стагоддзе прад'яўляе вельмі жорсткія патрабаванні да выпускнікоў, якія да таго ж пастаянна змяняюцца.

— Рызыкну выказаць меркаванне, што якасць адукацыі не з'яўляецца надзвычай сур'ёзнай праблемай для сталічнай сістэмы адукацыі, — падзяліўся сваімі меркаваннямі з калегамі *старшыня Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Уладзімір Шчэрба*. — Па выніках года рэйтынг вучэбных дасягненняў навучэнцаў сталічных школ застаецца дастаткова высокім. Пры гэтым на працягу апошніх чатырох гадоў назіраецца няхай і не вельмі істотная, але стабільная станоўчая дынаміка росту сярэдняга бала: ад 6,7 да 7,7 бала на розных ступенях навучання. У пачатковай школе найбольш высокія вынікі — ад 8,0 і вышэй балаў маюць 24 навучальныя ўстановы, сярод іх 16 гімназій і 8 школ. У базавай школе выніку ад 7,5 балаў і больш дасягнулі 12 гімназій і ніводнай школы. На старшай ступені навучання такіх вынікаў дасягнулі 35 устаноў адукацыі, сярод якіх 28 гімназій і 7 школ. Як бачна, гімназічная адукацыя з'яўляецца найбольш выніковай і апраўдвае сябе ў поўнай меры. Аднак, хачу заўважыць, што з гэтага навучальнага года патрабаванні да гімназій істотна павысяцца...

Пра эфектыўнасць сталічнай сістэмы адукацыі могуць сведчыць і наступныя факты: 74,4 працэнта выпускнікоў мінскіх школ паступілі сёлета ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. На працягу 8 апошніх гадоў каманда сталічных школьнікаў стабільна лідзіруе на рэспубліканскіх прадметных алімпіядах, павялічылася таксама прадстаўніцтва мінскіх школьнікаў у нацыянальных зборных, якія абараняюць гонар беларускай школы на міжнародных алімпіядах. Аднак з кола ўсіх пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд амаль 32 працэнты з'яўляюцца прадстаўнікамі толькі двух сталічных школ: 41-й і 51-й. Гэтыя ж школы далі і 77 працэнтаў ад агульнай колькасці мінчан-пераможцаў міжнародных школьных алімпіяд. А чаму ніяк не праяўляюць сябе іншыя навучальныя ўстановы? Тут ёсць над чым задумацца...

Цэнтралізаванае тэсціраванне прайшлі сёлета 90 працэнтаў выпускнікоў агульнаадукацыйных школ. Усяго па краіне 100 балаў атрымалі 77 удзельнікаў ЦТ, з іх 48 працэнтаў з'яўляюцца выпускнікамі сталічных гімназій, ліцэяў і школ. А выпускнік фізіка-матэматычнага класа СШ № 196 Дзяніс Верамейчык атрымаў вышэйшы бал адразу па двух прадметах: фізіцы і матэматыцы. Вельмі высокі вынік у яго і ў сертыфікаце па рускай мове — 84 балы. Дарэчы, па словах выпускніка, паслугамі рэпетытараў ён не карыстаўся, але заўсёды прытрымліваўся парад сваіх настаўнікаў фізікі і матэматыкі, Бутнік Алены Васільеўны і Кавалеўскай Людмілы Міхайлаўны, якія навучылі яго сістэмнай працы.

Аналіз вынікаў тэсціравання таксама паказаў, што сярэдні бал ад 50 да 78 (гэта добры вынік) па матэматыцы, рускай і беларускай мовах атрымалі 68 працэнтаў выпускнікоў гімназій. Не менш высокія вынікі дэманструюць таксама выпускнікі сталічных школ №№ 154, 87, 73, 19, 64, 65, 51, 166, 132 і 32. Але дастаткова вялікая колькасць абітурыентаў-мінчан атрымалі на тэсціраванні ад 10 да 40 балаў.

— Мы добра разумеем, што ў новых умовах (маецца на ўвазе змяненне тэрмінаў навучання і карэкціроўка яго зместу) забяспечыць неабходны ўзровень падрыхтоўкі будзе няпроста, асабліва ў класах з пераходнымі вучэбнымі планамі. Лічу, што гэтыя класы павінны стаць не толькі аб'ектам самай пільнай увагі, але і клопату з боку кіраўнікоў і педагогаў, — падкрэсліў Уладзімір Шчэрба. — Сюды трэба будзе накіраваць самых вопытных, прафесійных мабільных настаўнікаў, стварыць найбольш спрыяльныя ўмовы і псіхалагічную атмасферу для навучання. Немалаважна папярэдзіць напружанасць сярод бацькоў, зрабіўшы іх сваімі саюзнікамі.

**ШКОЛЫ ЗМОГУЦЬ САМАСТОЙНА МАДЭЛЯВАЦЬ ВУЧЭБНЫ ПРАЦЭС І РАСПРАЦОЎВАЦЬ ДЛЯ НАВУЧЭНЦАЎ НЕЛІНЕЙНЫЯ ТРАЕКТОРЫІ НАВУЧАННЯ.**

Кіраўнік сталічнай сістэмы адукацыі перакананы, што патэнцыял новых вучэбных планаў не зніжае для школьнікаў даступнасці адукацыі павышанага ўзроўню, эстэтычнай ці іншай накіраванасці.

— Новыя вучэбныя планы дазваляюць сёння ў кожнай агульнаадукацыйнай школе набліжаць якасць адукацыі да гімназічнага ўзроўню. Пагадзіцеся, што не кожнае дзіця, залічанае, да прыкладу, у першы музычны клас, захоўвае жаданне займацца музычнымі дысцыплінамі на працягу 9—10 гадоў. Тое ж можна сказаць і пра класы з паглыбленым і павышаным вывучэннем іншых прадметаў. Цяпер жа кожны школьнік атрымаў магчымасць на любым этапе свайго навучання займацца тым, да чаго праяўляе інтарэс, — патлумачыў сваю думку Уладзімір Шчэрба. — Лічу, што перавод у статус факультатываў вучэбных гадзін, прызначаных для задавальнення індывідуальных адукацыйных запытаў, зробіць выбар навучэнцаў і бацькоў больш матываваным.

Школы змогуць самастойна мадэляваць вучэбны працэс, распрацоўваць для навучэнцаў нелінейныя траекторыі навучання, эфектыўна выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі і рэсурсы, як унутраныя, так і знешнія. Для прыкладу, яшчэ год таму міжшкольныя факультатывы былі для нас новай адукацыйнай практыкай (іх налічвалася толькі 69), а ў мінулым навучальным годзе дзейнічала ўжо 130 міжшкольных факультатываў. Такая міжшкольная кааперацыя матэрыяльных і кадравых рэсурсаў дае школьнікам магчымасць атрымліваць дадатковыя веды ў найбольш вопытных настаўнікаў і выкладчыкаў раёна і горада.

*Дырэктар мінскай сярэдняй школы № 158 Марына Мушніцкая* выказала свой погляд на адмену дыферэнцыяцыі навучання: «Нацыянальная школа — гэта не толькі кузня інтэлектуальнай эліты краіны: гімназістаў і ліцэістаў. Насамрэч місія школы — значна шырэйшая. І не варта забываць, што побач з дзецьмі, якія маюць высокія дасягненні ў вучобе, вучацца дзеці, якія папоўняць вострадэфіцытныя для краіны рабочыя кадры. І яны не павінны быць другасным дадаткам да так званых адораных дзяцей, вакол якіх вельмі часта і будуецца ўвесь адукацыйны працэс».

*Пераможца гарадскога конкурсу прафесійнага майстэрства «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі» ў намінацыі «Настаўнік года» Тэрэса Мятліцкая*, якая выкладае хімію ў мінскай гімназіі № 14, засяродзіла ўвагу педагагічнага форуму на праблеме аснашчэння школ вучэбным абсталяваннем.

— Мы разважаем аб развіцці асобы, але натуральнае жаданне дзяцей памацаць усё сваімі рукамі, зрабіць самастойна тое, аб чым напісана ў падручніку, задаволіць не можам. Немагчыма даць сучасную адукацыю па фізіцы, хіміі, біялогіі, маючы матэрыяльную базу на ўзроўні мінулага стагоддзя. Беларускія школьнікі дэманструюць на міжнародных школьных алімпіядах бліскучыя веды на тэарэтычных турах, але, на жаль, губляюць балы ў практычных турах. Тэорыя ніколі не зможа замяніць практыку і эксперымент, — падкрэсліла вопытны педагог. — Нам вельмі б хацелася, каб на сістэму адукацыі звярнулі ўвагу айчынныя прамысловыя прадпрыемствы, таму што кошт нескладанага абсталявання, зробленага ў краінах СНД, вельмі аддалены ад рэальнасці. Мяркуйце самі: *лабараторны штатыў каштуе больш як 100 тысяч беларускіх рублёў, шкляная спіртоўка для лабараторных заняткаў — 31 тысячу рублёў. Адкуль такія цэны, калі звычайны літровы слоік для марынавання агуркоў каштуе ўсяго 1,5 тысячы рублёў?* Не сумняваюся, што грошы, укладзеныя ў адукацыю, прынясуць усім добрыя дывідэнды.

Яшчэ адна важная праблема, пра якую вялася гаворка, — гэта сацыялізацыя моладзі.

— Школьная паспяховасць — зусім не галоўная гарантыя паспяховай адаптацыі і сацыялізацыі падлетка, — падкрэсліў Уладзімір Шчэрба. — У арганізацыі выхаваўчай работы мы часцей за ўсё арыентуемся на ідэю абароны дзяцей: ад вуліцы, ад бацькоў, ад хваробаў, ад сяброў, якія аказваюць шкодны ўплыў, ад гульнявой залежнасці, наркотыкаў, СНІДу і г.д. Але падысці да вырашэння гэтых праблем можна і іншым чынам — навучыць нашых дзяцей абараняцца самім. У гэтым разе падлетак сам зможа процістаяць жыццёвым цяжкасцям, спакусам, дэструктыўнаму ўплыву, будзе разумець, «што добра, а што дрэнна». Адсюль выцякае новая для нас задача, новая па сваёй сутнасці — умацаванне сацыяльнага імунітэту моладзі. Неабходная ўмова пры гэтым — глыбокае разуменне маладзёжных праблем, расстаноўка сілаў такім чынам, калі педагог знаходзіцца не «над», а побач, разам з падлеткам.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Усе павінны зразумець, што дзяржава не можа дазволіць сабе працяглы перыяд сацыялізацыі моладзі. Скарачэнне тэрмінаў навучання ні ў якім разе не з'яўляецца адступленнем назад, а наадварот, павінна паскорыць грамадзянскае станаўленне і сацыяльнае самавызначэнне школьніка. Каб выканаць гэты грамадскі заказ, перад кожным педагогам і кожнай установай адукацыі стаіць генеральная задача: стварыць максімальна спрыяльныя ўмовы для таго, каб выпускнікі сталі сацыяльна паспяховымі, маглі самастойна прымаць адказныя рашэнні, быць людзьмі дзеяння, адданымі сваёй краіне, умелі і хацелі навучацца ўсё жыццё. Менавіта гэты накірунак і быў вызначаны для сталічнай сістэмы адукацыі сёлета як прыярытэтны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б: «РАСПУСЦІЦЬ ПЯРВІЧНУЮ ПАРТЫЙНУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ «ЗВЯЗДЫ» ЗА АСЛАБЛЕННЕ АНТЫТРАЦКІСЦКАГА ПАЧУЦЦЯ...»



**БУДЗІНСКІ**
**Станіслаў Янавіч**
**(1894—1937)**



**ГАРЫН**
**Міхаіл Давыдавіч**
**(1900—1980)**



**БРАГІНСКІ**
**Рыгор Навумавіч**
**(1891—1938)**



**ЛЕНЦНЕР**
**Навум Міхайлавіч**
**(1902—1936)**



**СЦЕРНІН**
**Мікалай Клеафасавіч**
**(1900— лёс да канца не вызначаны)**



**ДЖАЛЮК**
**Аляксандр Паўлавіч**
**(1905—1944)**

**Мы працягваем друкаваць архіўныя матэрыялы па гісторыі найстарэйшай беларускай газеты.**

**Гісторыю нельга кланіраваць. Аднаўляць яе можна толькі на падставе архіўных крыніц. Гэта поўнасцю адносіцца і да пройдзенага «Звяздою» ў трыццатыя гады. На жаль, тамтэйшая гісторыя мае як светлыя, так і чорныя колеры.**

## Светлае і чорнае

У той жа час перад намі панарама магутных змяненняў. Колькасць фабрычна-заводскіх труб з 1927 па 1939 г. ад Мінска да Урала падвоілася. За гэтым хаваліся дзве вялікія рэвалюцыі: індустрыялізацыя эканомікі і масавая калектывізацыя сельскай гаспадаркі.

У 30-я гады праблемы тыражу, падпіскі, распаўсюджвання ўжо не хвалявалі рэдакцыю. Перад ёю сталі задачы якасці і, у першую чаргу, ідэалагічнай. Рабілася ўсё гэта на фоне стварэння адзінай у СССР ідэалагічнай сістэмы. У канцы 20-х — пачатку 30-х у яе ўваходзілі сетка інстытутаў гісторыі партыі (Масква, сталіцы рэспублік, шэрагу абласных цэнтраў), адзіны для ўсяго СССР партархіў (цэнтральны ў Маскве), Інстытут чырвонай прафесуры, інстытуты журналістыкі, камуністычныя ўніверсітэты, партыйныя і савецка-партыйныя школы, камуністычныя сельскагаспадарчыя школы, рабочыя факультэты для паступлення ў ВНУ, перыядычны друк, у якім цэнтральным тэарэтычным органам у СССР з'яўлялася газета «Правда». У Беларусі такая роля, пачынаючы з 1917 г., ускладалася на «Звязду». 1 лютага 1931 г. бюро ЦК КП(б)Б прызнала неабходным лічыць «Звязду» органам ЦК КП(б)Б і Мінскага гаркама КП(б)Б. З дадзенымі рэквізітамі яна ўпершыню ўбачыла свет 07.02.1931 г. 15.04.1933 г. у лік выдаўцоў увайшлі ЦВК і СНК БССР. У сувязі з рэформай беларускага правапісу назва «Зьвязда» 16.09.1933 г. заменена на «Звязда».

У 30-я гады рэдагавалі «Звязду» Арон Мітлін (06.1930—10.1930), Станіслаў Будзінскі (10.1930—11.1931), Міхаіл Гарын (11.1931—08.1932), Рыгор Брагінскі (09.1932—05.1934), Навум Ленцнер (06.1934—01.1935), Мікалай Сцернін (01.1935—08.1936), Аляксандр Джэлюк (08.1936—10.1936), Дзмітрый Юркоў (10.1936—10.1937), Ізраіль Афенгеім (10.1937—07.1938), Дзям'ян Лебедзеў (08.1938—08.1939), Цімафей Гарбуноў (08.1939—03.1941), Міхаіл Астапенка (03.1941—08.1941).

Значнымі па падзеях сталі 1931—1933 гады. У лютым 1932 г. у склад рэдакцыі «Звязды» ўваходзілі: М.Д. Гарын — адк. рэдактар, А.Д. Мітлін — нам. адк. рэдактара, А.Л. Іофе — заг. рэдакцыі, А.П. Джэлюк — адк. сакратар рэд., М.Я. Лаўкет — заг. сектару сац. земляробства, М.Р. Лявоненка — заг. сектара ўдарных брыгад, П.П. Жарскі — стыльрэдактар, С.П. Галкін, М. Мэркін, В.Р. Фрыдлін, А.М. Манькоў — літработнікі, І.В. Шклярнік-Праўдзін — нам. заг. прамысловага сектара, Р.С. Додзін — заг. транспартнага сектара, Ю.Л. Татарчук — заг. сектара агляду друку, В.А. Самуцін — заг. гандлёва-каапературнага сектара. Усяго 15 чалавек. З іх мелі вышэйшую адукацыю 6 чалавек, сярэднюю — 6, ніжэйшую — 3, з'яўляліся членамі партыі — 8. Нацыянальны склад: беларусаў — 5 чал., рускіх — 1, украінцаў — 1, яўрэяў — 8. Прыпісаны да вайсковай часці — 7, не прыпісаны — 8.

Структура, штатны расклад газеты не з'яўляліся велічынёй пастаяннай. Гэта залежала ад памераў тэрыторыі рэспублікі, колькасці газет, задач сацыялістычнага будаўніцтва. У міжваенны перыяд важная роля адводзілася аддзелам: партыйнага жыцця, сельскагаспадарчаму, рабселькораўскаму, нацыянальна-культурнаму і інш. Ажыўленню газеты спрыяў яе пераход у другой палове 1927 г. на беларускую мову. З таго моманту на старонках «Звязды» пачалі рэгулярна друкавацца Янка Купала, Якуб Колас, Пятрусь Броўка, Міхась Лынькоў, Кузьма Чорны, Змітрок Бядуля, Андрэй Александровіч, Пятро Глебка і інш. У 1932 г. пры рэдакцыі друкаванага органа было адчынена газетнае аддзяленне. Але да пачатку 3-й пяцігодкі (1938) кадры для «Звязды» рэкруціраваліся галоўным чынам з раённых газет, з ліку журналістаў іншых рэспублік, некаторая частка — з аўдыторыяў мінскіх камуністычнага ўніверсітэта, інстытута журналістыкі.

Масква, не шкадуючы фінансавых сродкаў, спадзявалася, што працавіты беларускі народ за кароткі час пераўтворыць БССР у візітную картку сацыялістычнай сістэмы. На гэты давер рэдакцыя «Звязды» адказвала ўзмацненнем арганізацыйнай працы. Толькі з 01.01.1931 па 01.12.1934 г. яна правяла больш як 30, як сёння сказалі б, акцый эканамічнага характару. Безумоўна, усе яны арганізоўваліся і ажыццяўляліся з удзелам прадстаўнікоў партыйных і дзяржаўных органаў улады, вучоных. Сведчыць сам пералік здзейсненага газетай: выдадзена брашура «Звязда» — у калгасы», праведзены нарады аб крэдытнай рэформе і пераводу на гаспадарчы разлік, аб супрацоўніцтве з дарожнікамі Чувашскай АССР, аб удзеле пісьменнікаў БССР у пасяўной кампаніі, аб афармленні сталіцы БССР у пралетарскія святы, аб выданні стабільных падручнікаў для масавых школ, аб папулярызацыі пастаноў урада аб хлебе і сельскагаспадарчым падатку; зроблены заклік да болей поўнага і своечасовага асвятлення сацыялістычнага спаборніцтва на старонках «Звязды»; разам з прадстаўнікамі Украіны праведзена вярбоўка рабочай сілы на шахты Данбаса (завербавана 9035 чал. пры плане 9000); падтрыманы зварот Гомельшчыны аб пабудове эскадрыллі імя Л. Кагановіча, унесены на яе разлік 1000 руб.; арганізаваны спецыяльны маршрутны цягнік імя «Звязды» для паскоранай дастаўкі бульбы ў г. Ленінград; установлены пераходны сцяг імя газеты «Звязда» для лепшага льнаводнага калгаса; створаны штаб садзейнічання камунальнаму будаўніцтву, паляпшэнню рабочага забеспячэння; шэрагу калгасаў аказана дапамога па стварэнні ў Мінску ўласнага гандлю; уручаны грашовыя прэміі 34 насценным газетам БССР; 05.07.1932 выязная рэдакцыя «Звязды» ў тэрміновай тэлеграме паведаміла аб паспяховым завяршэнні будаўніцтва шашы «Мінск—Магілёў» і інш.

Бытавыя ж умовы жыцця супрацоўнікаў «Звязды», іх працы вымушалі жадаць лепшага. Упершыню паведаміў аб гэтым кіраўнікам БССР рэдактар Будзінскі. Ён ураджэнец Варшавы, базавая адукацыя — Варшаўскія вышэйшыя камерцыйныя курсы. З васямнаццаці гадоў у сацыял-дэмакратычным руху Польшчы, Літвы, Расіі. Адзін са стваральнікаў кампартыі Польшчы і кампартыі Заходняй Беларусі. Будучы рэдактарам «Звязды», у артыкулах у часопісах «Полымя», «Бальшавік Беларусі» беспадстаўна абвінавачваў шэраг беларускіх літаратараў, грамадскіх дзеячаў у адсутнасці навуковых поглядаў на гістарычныя рэаліі. У 1931 г. апісаў кватэрныя праблемы «звяздоўцаў», якія вялі да захворвання на сухоты, іх невялікія заробкі, дрэнныя ўмовы для належнага адпачынку, шалёную перагрузку. Ход лісту быў дадзены ўжо пасля яго ад'езду ў Маскву, на працу ў Выканкам камітэрна. Лёс аўтара звароту трагічны: 22.08.1937 ён загінуў, будучы незаконна асуджаным за антысавецкую дзейнасць. Рэабілітаваны.

У лютым 1933 г. Цэнтральная кантрольная камісія КП(б)Б абвінаваціла загадчыка сельскагаспадарчага сектара рэдакцыі Воінава, загадчыка культурна-нацыянальнага сектара Мяжэвіча, іншых супрацоўнікаў у тым, што яны, «групіруючыся пачаткова на глебе незадавальнення матэрыяльным забеспячэннем, featured розных роду абывацельскіх гутарак, прыйшлі да антыпартыйнай групіроўкі і антыпартыйнай дзейнасці». Доказамі служылі галоўным чынам іх вусныя крытычныя выказванні аб кадравай палітыцы, матэрыяльным становішчы, калгасным будаўніцтве. Бюро ЦК КП(б)Б 29.03.1933 г. пагадзілася з прапановай ЦК аб выключэнні Воінава з членаў КП(б)Б як «арганізатара групоўкі». Эканамічны стан «звяздоўцаў» зноў паўстаў у сувязі са спаўненнем у 1937 г. 20-й гадавіны з дня выхаду першага нумара газеты. У склад спецыяльнай камісіі ўваходзілі рэдактар Юркоў, пісьменнікі Александровіч, Лынькоў, Хадасевіч, дырэктар Гістпартас Пасэ. Сярод розных мерапрыемстваў, якія ажыццяўляліся пад кантролем камісіі, выдзяляецца пастанова ЦК КП(б)Б аб пабудове для «Звязды» новай друкарні.

Духоўнаму ўзбагачэнню служылі сустрэчы рэдакцыі з працоўнымі калектывамі РСФСР, яе аўтаномных рэспублік — Башкірыі, Татарстана, Украінскай ССР, закаўказскіх і сярэднеазіяцкіх саюзных савецкіх рэспублік. На адным з цэнтральных месцаў 15.10.1932 г. у газеце надрукавана падзяка Максіма Горкага Беларускай акадэміі навук за выбранне яго ганаровым акадэмікам. У чэрвені таго ж года супрацоўнікі «Звязды» разам з пісьменнікамі, тэатральнымі дзеячамі БССР сустракаліся з калектывам Украінскага дзяржаўнага тэатра. Адказны рэдактар «Звязды» Г.І. Брагінскі 29.09.1933 г. выступіў з дакладам у Казані на ўсетатарскім з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў. Амаль з усіх канцоў СССР ішлі віншаванні ў сувязі з выхадам 30.07.1934 г. 5-тысячнага нумара газеты. У рэспубліцы ў гонар гэтай даты кампазітары Самохін і Любан стварылі песенныя творы, першы — на словы Я. Купалы, другі — на словы П. Броўкі. Каб быць на ўзроўні пры сустрэчах з чытачамі, «Звязда» напярэдадні юбілейных урачыстасцяў аб'явіла аб сваім рашэнні напісаць «мастацкую чырвоную кнігу аб калгасах Беларусі», разам з пісьменнікамі М. Лыньковым, К. Крапівой, А. Куляшовым, К. Чорным, З. Бядулем, П. Броўкам, П. Глебкам.

У канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў лозунг беларусізацыі — «У бой супраць вялікадзяржаўнага шавінізму» — быў заменены на заклік «Усе на вайну супраць мясцовага нацыяналізму». Шэрагу былых дзеячаў БНР (Беларуская Народная Рэспубліка), якія вярнуліся на радзіму, супрацоўнікам былога Інстытута беларускай культуры, Акадэміі навук БССР, наркаматаў земляробства і асветы, ВНУ, якія актыўна заявілі аб сабе ў час беларусізацыі, органамі ўлады БССР інкрымініравалася «адарванасць ад мас і абывацельская псіхалогія», «імкненне да адраджэння буржуазна-дэмакратычнай дзяржаўнасці», «вырошчванне нацыянальнай формы культуры на шкоду яе зместу», «падмена класавай барацьбы нацыянальнай», стварэнне «нацдэмаўскай, контррэвалюцыйнай, антысавецкай арганізацыі» пад кодавай назвай «Саюз вызвалення Беларусі» («СВБ»).

У «Звяздзе» выйшлі галоўныя матэрыялы па справе «СВБ». Тут быў надрукаваны і ліст першага прэзідэнта АН БССР І.М. Ігнатоўскага ў адказ на рашэнні ЦКК КП(б)Б і ЦК КП(б)Б аб яго выключэнні з радоў партыі «як чуждага элемента, адыграўшага на руку нацдэмаўскай контррэвалюцыі». Лёс гэтага выдатнага беларускага вучонага аказаўся трагічным. Ён не змог да канца выстаяць і пераадолець несправядлівыя да сябе адносіны. 04.02.1931 г., пасля чарговага допыту ў АДПУ, І.М. Ігнатоўскі скончыў сваё жыццё стрэлам з рэвальверу.

Месцамі высылкі многіх асуджаных былі Кіраўская вобласць (А.А. Бабарэка), Саратаўская вобласць (В.У. Ластоўскі, І.Ю. Лесік), Вятка (М.І. Гарэцкі), Мамлык (М.А. Гурскі), Оса (А.А. Смоліч), Перм (В.Л. Дыла, А.І. Цвікевіч, У.М. Пракулевіч), Башкірстан (М.М. Шчакаціхін), Татарстан (Ф.І. Забэла), Новасібірск (М.І. Каспяровіч), Самара (А.К. Гурло, М.В. Мялешка), Налінск (М.В. Азбукін), Сарапул (С.М. Некрашэвіч), Шадрынск (Я. Пушча). Для адных гэтыя назвы на карце сталі апошнімі прытулкамі, для другіх — толькі перасыльнымі пунктамі. Усе яны ў пасляваенны перыяд рэабілітаваны, а «СВБ» прызнана штучна прыдуманай арганізацыяй.

Узначальвалі рэдакцыю ў той цяжкі час Мітлін, Будзінскі, Гарын, Брагінскі. Гарыну належыць серыя артыкулаў у «Звяздзе» пад назвай «У барацьбе з класавым ворагам і апартуністамі пабудуем бяскласавае грамадства» (сакавік 1932 г.). У 1937 і 1948 ён арыштоўваўся па падазрэнні ў антысавецкай дзейнасці. Памёр у 1980 г.

## «Клеветники из газеты «Звязда»

Шэраг драматычных старонак звязаны з барацьбой супраць трацкізму. У сярэдзіне 30-х гадоў яна з буйных палітычных цэнтраў — Масквы, Ленінграда — перакідваецца ў нацыянальныя савецкія рэспублікі. Рэдактар «Звязды» Навум Ленцнер аказаўся ў гэтай сітуацыі адной з першых ахвяраў. 16.01.1935 г. ён вызваляецца з займаемай пасады «з прычыны пераходу на іншую работу». Але шлейф «трацкіста» за ім застаецца. Яшчэ ў 20-я гады, будучы рэдактарам поўнага збору твораў Троцкага, ён у шэрагу каментарыяў адстойваў аўтэнтычнасць поглядаў Троцкага і Леніна на Кастрычніцкую рэвалюцыю. 01.04.1936 г. яго арыштоўваюць як члена «контррэвалюцыйнай трацкісцкай тэрарыстычнай арганізацыі». 02.10.1936 г. Ленцнера прыгаворваюць да вышэйшай меры пакарання. Прыгавор здзейснены ў той жа дзень. Рэабілітаваны ў 1956 г. «за адсутнасцю ў дзеяннях складу злачынства». У сувязі са справай Ленцнера ў 1935—1936 гг. з работы ў «Звяздзе» звольнены каля 30 чалавек. Загадчыкі аддзелаў рэдакцыі П.М. Салтаноўскі і Р.С. Гінзбург прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Летам 1936 г. пярвічная партыйная арганізацыя «Звязды» пастановай ЦК КП(б)Б распускаецца «за аслабленне антытрацкісцкага пачуцця». Страты «Звязды» ў час барацьбы з трацкізмам былі самыя вялікія сярод усіх рэспубліканскіх газет СССР.

Не пазбег палітычных рэпрэсій і пераемнік Ленцнера — Мікалай Сцернін. Ён ураджэнец Магілёва, з сям'і чыгуначнікаў. Працоўную дзейнасць пачаў у 1913 г. карэктарам Магілёўскай земскай друкарні. Перад прыходам у «Звязду» працаваў у газетах «Соха и молот», «Известия Оршанского Совета». 02.08.1936 г. Сцернін вызваляецца з пасады рэдактара «за страту рэвалюцыйнай пільнасці і дапушчэнне засмечанасці апарату рэдакцыі газеты «Звязда» чужымі людзьмі». 11.06.1938 г. ён арыштоўваецца органамі НКУС, а 11.07.1939 г. пасля ліста Сталіну «Партыя павінна ведаць усё» вызваляецца з турмы. Лёс гэтага неардынарнага чалавека, на жаль, з-за адсутнасці некаторых дакументальных крыніц, не да канца вывучаны. З імёнамі Аляксандра Джэлюка, Мікалая Сцерніна, Дзмітрыя Юркова звязана паступовае вяртанне ў «Звязду» былой стабільнасці.

Змяншэнне чорнага колеру ў гісторыі 30-х адбылося ў 1938 г. Штуршок яму зноў дала Масква, надрукаваўшая ў газеце «Известия депутатов трудящихся СССР» артыкул «Клеветники из газеты «Звязда» (01.02.1938 г.). Праз 2 тыдні рэдакцыя беларускага друкаванага органа не толькі публічна прызнала дапушчаныя ёю памылкі, але і пачала абнародаваць прабачэнні і імёны не заслужана пацярпелых ад яе дзейнасці. Сярод такіх асобаў значацца дырэктар інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР В.В. Барысенка, начальнік лячэбна-прафілактычнага ўпраўлення Наркамздрава БССР Л.Г. Гракаў, загадчык аддзела культпрапаганды Жлобінскага райкама КП(б)Б Каган, начальнік забеспячэння ўпраўлення дома ўрада В.М. Вінаградаў, сакратар Бярэзінскага райкама КП(б)Б Сосінаў і інш. Упершыню на свет з'явіўся матэрыял аб вяртанні добрага імя шэрагу грамадзян нашай краіны.

**(Заканчэнне будзе.)**

**Яўген БАРАНОЎСКІ,**
**кандыдат гістарычных навук.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

**на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства**

| Наименование предмета аукциона | Право заключения договора аренды земельного участка для строительства базы отдыха на 18 мест | Право заключения договора аренды земельного участка для строительства площадки отдыха |
|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 |
| Арендодатель земельного участка | Малоритский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Малорита, ул. Красноармейская, д. 1. Тел. 8(01651) 2 30 17 | Пружанский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Пружаны, ул. Г. Ширмы, д. 17. Тел. 8(01632) 7 10 93 |
| Адрес земельного участка/ Кадастровый номер земельного участка | Брестская область, Малоритский район, 0,3 км. северо-восточнее д. Луково на озере Луковское/№ 125200000001000445 | Брестская область, Пружанский район, на 7 км справа автомобильной дороги Р-101 Пружаны—Береза/№ 125600000001000452 |
| Размер (площадь) земельного участка, га | 0,9600 | 0,1298 |
| Срок аренды земельного участка, лет | 50 | 20 |
| Целевое назначение земельного участка | для строительства базы отдыха на 18 мест на озере Луковском | для строительства площадки отдыха |
| Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | Территория участка на 0,29 га покрыта лесом, 0,40 га – пески, 0,27 га – древесно-кустарниковая растительность. Участок расположен в водоохраной зоне и прибрежной полосе оз. Луковского и имеет ограничения в использовании земель: в водоохранной зоне на площади 0,61 га, прибрежной полосе на 0,35 га, санитарно-защитной полосе водоотвода на площади 0,10 га соответственно. Подъезд к участку с автодороги Луково—Заболотье (участок находится в придорожной полосе автодороги Н-745 Луково (от а/д М-12)—Новое Заболотье (4 категория). | Участок покрыт лесом. Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи на площади 0,026 га. |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 12 502 230 | 4 106 580 |
| Размер задатка, руб. | 1 250 220 | 410 660 |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: | - внесения победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;<br>- возмещения победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношения создания земельного участка;<br>- заключения победителем аукциона с Малоритским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.<br>Победителю аукциона строительство необходимо осуществлять на условиях:<br>- строительство базы выполнить на расстоянии не менее 50,0 м от бровки земляного полотна автодороги до линии застройки;<br>- съезд к застройке выполнить согласно ТКП 45-3.03-19-2006 (02250) «Автомобильные дороги» раздел 6 с устройством покрытия согласно п. 6.1.14. (как для главной дороги 4 тех. категории);<br>- при необходимости снабжения базы отдыха электричеством и связью строительство воздушной линии электроснабжения выполнить согласно ТКП 45-3.03-19-2006 «Автомобильные дороги» п. 6.4., при переходе автодороги учесть дополнительную высоту насыпи 0,5 м и прокладку кабеля связи вдоль дорог производить за пределами полосы отвода на расстоянии не менее 14,0 м от оси а/д 4 категории; в населенных пунктах не менее 1.0 м от наружной бровки кювета, подошвы насыпи дороги или, в случае, когда отсутствует земляное полотно, тротуары – не менее 1,5 м от бортового камня улицы, дороги (укрепленные полосы обочины, кромки проезжай части) (согласно таб. 9.1 СНБ 3.03.02-97 «Улицы и дороги городов, поселков и сельских населенных пунктов»), переходы через а/д выполнять закрытым способом с устройством защитного футляра на глубину не менее 1,4 м от верха покрытия проезжей части до верхней образующей футляра;<br>- проект в обязательном порядке согласовать с ДРСУ № 179;<br>- места производства работ оградить дорожными знаками и схему их расстановки согласовать с ГАИ Малоритского РОВД;<br>- за три дня до начала работ письменно известить ДРСУ № 179 (г. Малорита, ул. Советская, д. 134, тел/ф. 2 02 71, 2 36 02) о дате начала и окончания работ;<br>- после окончания работ в течение 1-го дня привести в порядок придорожную полосу и сдать по акту ДРСУ № 179. | - право вырубки древесно-кустарниковой растительности и реализацией древесины, получаемой от вырубки, ГЛУ «Пружанский лесхоз» в установленном порядке;<br>- внесение победителем аукциона платы за право заключение договора аренды земельного участка;<br>- возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;<br>- заключения победителем аукциона с Пружанским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;<br>- получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проектной документации на строительство объекта в срок не превышающий 2-х лет;<br>- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11. Тел.: (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85. www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by* | |

Повторный аукцион состоится **19 сентября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество». **Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома;

индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представитель индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

представитель или уполномоченное должностное лицо юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представитель или уполномоченное должностное лицо иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представитель иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Осмотр земельных участков на местности осуществляет арендодатель.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

**Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан:** подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

***Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, по рабочим дням с 4 сентября 2008 года по 15 сентября 2008 года включительно.***



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь извещает о проведении открытого аукциона по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций Горецкого открытого акционерного общества «Типография БГСХА».

**Аукцион состоится 27 ноября 2008 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.**

Продавец — Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Для участия в аукционе в срок до 16.00 4 ноября 2008 г. по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный,12 предоставляются следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическими лицами — резидентами Республики Беларусь — нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенная копия выданной Министерством финансов Республики Беларусь лицензии на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности на рынке ценных бумаг (профессиональными участниками рынка ценных бумаг);

представителями физических лиц — резидентов Республики Беларусь — нотариально заверенная доверенность;

юридическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не более чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

представителями физических лиц — нерезидентов Республики Беларусь — легализованная в установленном порядке доверенность;

представителями юридических лиц — нерезидентов Республики Беларусь — легализованная в установленном порядке доверенность или иные легализованные в установленном порядке документы, подтверждающие полномочия представителя;

документ, подтверждающий согласие антимонопольного органа на совершение сделки, в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц представляют копию паспорта или иного документа, удостоверяющего личность, и предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для заверения его копии лицом, принимающим документы.

Не допускается одновременное участие в аукционе заинтересованных лиц: физических лиц, состоящих в родственных отношениях или браке; юридических лиц, участниками которых выступают одни и те же физические и (или) юридические лица; юридических лиц, в уставном фонде которых одно и то же юридическое или физическое лицо имеет долю в размере двадцати и более процентов; юридических лиц, одно из которых в соответствии с законодательством признается дочерним или зависимым по отношению к другому.

Для участия в аукционе уплачивается задаток в сумме 13 832 000 (тринадцать миллионов восемьсот тридцать две тысячи) белорусских рублей на счет № 3642974000028 в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Задаток уплачивается в срок до 19 ноября 2008 г. согласно договору о задатке, заключаемому с Фондом государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь при регистрации заявления на участие в аукционе.

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее за пакет акций (лот) наиболее высокую цену.

Договор купли-продажи акций заключается с участником аукциона, выигравшим торги, в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Участники аукциона оплачивают фактические затраты на подготовку и проведение аукциона согласно выписанному каждому счету-фактуре в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Участник аукциона, выигравший торги, дополнительно оплачивает затраты на проведение рыночной оценки акций согласно счету-фактуре в течение 3 рабочих дней со дня его получения.

Получить более подробную информацию о Горецком ОАО «Типография БГСХА», ознакомиться с проспектом эмиссии и годовой бухгалтерской отчетностью акционерного общества по состоянию на 1 января 2008 г., проектом договора купли-продажи акций можно по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 401.

Контактные телефоны:

Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь.

Тел.: (017) 284 89 36, 284 85 62.

Департамент ценовой политики Министерства экономики: (017) 200 68 45, 222 67 17, 222 67 72.

| Полное и сокращенное наименование открытого акционерного общества, его адрес | Уставный фонд, шт. акций | Номинальная стоимость акции, рублей | Доля государства в уставном фонде по состоянию на 01.08.2008 г. | | Предлагается для реализации | | Начальная цена | | Лот № 1 | | Информация о владельцах крупных пакетов акций |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | кол-во акций, шт. | в % к УФ | кол-во акций, шт. | в % к УФ | акции, рублей | пакета акций, рублей | количество акций в лоте, штук | начальная цена лота, рублей | |
| Горецкое открытое акционерное общество «Типография БГСХА» (Горецкое ОАО «Типография БГСХА»), Могилевская обл., г. Горки, ул. Тимирязева, 10 | 6204 | 1200 | 2819 | 45,44 | 2355 | 37,96 | 58 735 | 138 320 925 | 2355 | 138 320 925 | Три физических лица (11,11 % УФ; 6,91 % УФ; 5,85 % УФ) |

За Горецким ОАО «Типография БГСХА» зарегистрирован земельный участок 0,1999 га в г. Горки.

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

## Кетліч

***У залатым полі ўнізе драбіны чырвоныя наўкос, за імі — паў-казла ў натуральны колер.***



Гербам карысталіся: Райскі, Студзінскі.

## Дзях

***У блакітным полі залатое кола ад воза, над ім залатая шасцікутная зорка, пад ім — залаты паўмесяц рогамі дагары.***



Герб роду Стрыпулкоўскіх.

## Шашкевіч

***У чырвоным полі срэбная літара М, на ёй срэбны крыж чатырохканцовы з перакладзінай наўкос.***




Гербам карысталіся: Савінскі, Шашкевіч.

## Булат

***У блакітным полі чорны меч з залатым тронкам лязом уніз, на ім два залатыя паўмесяцы, адзін над адным, рогамі адзін да аднаго.***



Герб роду Булгарынаў.

**Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.**

# КАБ НЕ ПЛАКАЦЬ ГОРКА СЕДЗЯЧЫ НА ГОРЦЫ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**За апошнія гады зафіксаваны факты абрушэння атракцыёнаў ў Горках, Гомелі, Полацку, Мінску. Асноўная прычына — няправільная іх эксплуатацыя. Напрыклад, прычынай паломкі «ланцужковай» каруселі ў мінскім парку Чалюскінцаў, якая звалілася 7 ліпеня, стала старэнне металу на вузкім участку цэнтральнай стойкі (атракцыён быў выраблены ў 1989 годзе ў Чэхаславакіі і некалькі гадоў таму ўвезены ў Мінск).**

У сувязі з гэтым Генеральная пракуратура краіны ўзмацніла кантроль за бяспечнай эксплуатацыяй атракцыёнаў.

— Падчас праверкі была ўстаноўлена практычна поўная адсутнасць нарматыўнай базы, на падставе якой адбываецца эксплуатацыя атракцыёнаў, — **паведаміла начальнік аддзела па наглядзе за выкананнем правоў і свабод грамадзян Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь Марына ПАПОВА.** — Многія атракцыёны працягваюць працаваць, нягледзячы на сканчэнне тэрмінаў эксплуатацыі. Атракцыёны ж, якія прыязджаюць да нас на гастролі з замежных краін, як правіла, наогул не маюць дакументаў, якія сведчаць аб правамернасці іх выкарыстання. Гэта стварае пагрозу бяспецы жыцця і здароўя грамадзян нашай краіны, у першую чаргу, дзяцей. Згодна з існуючымі правіламі, якія ў 2006 годзе прыняты Міністэрствам культуры, неабходна праводзіць сістэматычныя (штодзённыя, штогадовыя і пазапланавыя) агляды атракцыёнаў. Паводле дакументаў, атракцыён, які зваліўся ў парку Чалюскінцаў, напярэдадні быў правераны спецыялістамі, якія пацвердзілі яго дзеяздольнасць... Справа ў тым, што для праверкі магчымасці далейшай эксплуатацыі атракцыёнаў уладальнікі прыцягваюць розныя арганізацыі, часта камерцыйныя, якія, здараецца, не маюць кваліфікаваных работнікаў. Таму, як бачыце, дзеючыя правіла па ахове працы пры эксплуатацыі атракцыёнаў патрабуюць дапрацоўкі.

У сувязі з гэтым Генеральная пракуратура Беларусі накіравала ў Савет Міністраў ліст з прапановай разгледзець пытанне аб прыняцці правілаў аб бяспечнай эксплуатацыі атракцыёнаў і аб стварэнні адзінага дзяржаўнага органа, які будзе займацца дыягностыкай і праверкай атракцыёнаў на прадмет магчымасці іх далейшага выкарыстання, паколькі любы атракцыён мае свой тэрмін дзеяння. Таксама пракурор прапанавала разгледзець пытанне аб стварэнні адзінага органа па кантролі за бяспечнай работай атракцыёнаў.

Акрамя таго, органы пракуратуры правялі праверку каруселяў і горак, якія размешчаны ў дварах жылых дамоў гарадоў рэспублікі.

— Падчас праверкі таксама было ўстаноўлена, што пытанні бяспечнай эксплуатацыі забаўляльных аб'ектаў знаходзяцца на нізкім узроўні. Многія арэлі, каруселі маюць выступаючыя вострыя вуглы, не маюць сядзенняў, трывалых апор... У выніку дзеці атрымліваюць цялесныя пашкоджанні, што з'яўляецца недапушчальным. Мы, у сваю чаргу, звярнуліся з просьбай да міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі надаць увагу інвентарызацыі ўсіх дзіцячых пляцовак, якія размешчаны ў дварах жылых дамоў. А таксама падумаць над прыняццем нарматыўных актаў, якімі будуць рэгламентаваны пытанні парадку ўводу ў эксплуатацыю арэляў, каруселяў, горак, іх абследавання, рамонту і далейшага дэмантажу.

— Ці зафіксаваны выпадкі няшчаснага здарэння па віне дарослых, якія недагледзелі за сваім падапечным?..

— Так, летась уступіў у сілу прыгавор адносна кіраўніка летніка, які прывёў дзяцей у дзіцячы парк, што ў Горках. Выхавальнік не прыкмеціў, як дзеці праніклі на тэрыторыю атракцыёнаў, якія ў той час былі на рамонце. У выніку няшчаснага здарэння дзіця атрымала цялесныя пашкоджанні, а выхавальнік прыцягнуты да крымінальнай адказнасці.

**Надзея ДРЫЛА.**

Zамор'е

# Стыльныя цацкі для сучасных жанчын

**У маленстве дзеці навыперадкі пахваляюцца, у каго цацка лепшая — машынка або лялька, канструктар або плюшавы леў, не вельмі істотна. У дарослых жаданне мерацца цацкамі таксама нікуды не знікае, яно проста прымае іншыя формы. Мужчыны, напрыклад, набываюць вялікія «наварочаныя» аўто або малыя, не менш «наварочаныя», кішэнныя камп'ютары. Жанчыны таксама не адстаюць, хіба што саступаюць у практычнасці. Замест карысных рэчаў набываюць усё тыя ж цацкі, толькі высокатэхналагічныя, так званыя гаджэты.**

Слова «гаджэт», па адной версіі, мае французскае паходжанне, перакладацца можа як «тэхналагічная навінка», «забаўная цацка», «аксесуар». Па другой — перакладаецца з англійскай як «прыстасаванне», тэхнічная прылада з мноствам функцый, але абмежаванымі магчымасцямі. Словам, гэткая ўмоўна карысная штука, без якой цалкам можна пражыць, але з ёй — значна цікавей...

Часта кажуць, што жанчынам падабаюцца гаджэты чырвонага і ружовага колеру, але гэта не так. У кожнай з нас свае перавагі. Але ўсіх нас аб'ядноўвае адна рыса: як правіла, мы любім гаджэты. Калі не набываць, то хоць бы разглядаць і выбіраць «на будучыню». Тым больш, у наш час выбраць ёсць з чаго. Нейкія з гэтых прылад існуюць яшчэ толькі ў праекце, нейкія можна набыць ужо цяпер. Прычым прыглядзецца да 9 стыльных штучак не перашкодзіць і мужчынам — іх жа можна прапанаваць у якасці падарунка!

**1.** Не проста сімпатычнае ўпрыгажэнне — гэта камп'ютар



Momenta PC. Ён працуе, фіксуючы паказчыкі жыццядзейнасці карыстальніка, а менавіта сэрцабіццё, тэмпературу, пераахаладжэнне. Часам гэта вельмі важна для кантролю жаночага здароўя. Пры дапамозе ўбудаванай камеры камп'ютар можа запісваць тыя важныя моманты жыцця жанчыны, якія яна захоча запомніць: усмешку дзіцяці, прызнанне ў каханні (хоць у апошнім выпадку і цяжка ўявіць, які мужчына на гэта пагодзіцца).

Камера можа працаваць бесперапынна на працягу 5 хвілін. Калі нейкія сцэны вы не захочаце фіксаваць — дастаткова проста сказаць «стоп» — і можна рабіць, што захочацца, без асцярогі быць «злоўленай на месцы злачынства». З дапамогай Wi-Fi інфармацыя можа быць перададзеная на дыск. Праўда, уся гэта цудоўная карціна — пакуль у стадыі распрацоўкі.

**2.** А гэтая туш ужо хутка паступіць у продаж. Адразу дзве фірмы — Lancome і Estee Lauder



— здагадаліся, што жанчынам часта проста бракуе часу на тое, каб падкрэсліць прыгажосць сваіх веек. Таму ў свет выпускаецца туш з адмысловым пэндзлікам, які вібрыруе: 7000 ваганняў у хвіліну. Цяпер нават самым патрабавальным прыгажуням, каб «навесці марафет», спатрэбіцца ўсяго некалькі секундаў. Навінкі носяць назвы Lancome Oscillation Mascara і TurboLash All-Effects Motion Mascara.

**3.** Электрамасажныя шлёпанцы Feet Welax маюць 10 розных ступеняў інтэнсіўнасці. Іх вусцілкі, зробленыя з сіліконавага матэрыялу з вугальным пакрыццём, што праводзіць ток, маюць тэрапеўтычныя масажныя грудкі, якія стымулююць акупунктурныя кропкі на ступні. Шэсць праграм масажу, сеанс якога вы можаце праводзіць як седзячы, так і падчас хады, чытання і нават лежачы.




**4.** Марыце, каб вашу хаду навакольныя мужчыны называлі, як у песні Антонава, «лятучай»? Магчыма, у клопаце пра свае ножкі не будзе лішнім набыць і жаночы абутак вытворчасці «Defyer» , падэшва якога зробленая з адмысловага палімера.



Ідэя выпускаць такі абутак прыйшла вытворцу ў галаву, калі ён азнаёміўся з матэрыялам, які меркавалася выкарыстаць у аўтамабільнай прамысловасці для змякчэння сілы ўдару падчас аварыі. Менавіта з яго цяпер і робяць падноскі для абутку «Defyer», таму сіла аддачы пры хадзе ў гэтым абутку зменшаная. Гэта значыць, вы будзеце менш стамляцца, і ў вас будзе менш шанцаў атрымаць траўму. Кошт на абутак — прыкладна 120—140 долараў, пры гэтым вытворца сцвярджае, што сіла прыцягнення Зямлі вашым нагам здасца ў два разы меншай, і, калі гэта не так, вы зможаце вярнуць абутак праз 30 дзён без тлумачэння прычын.

**5.** Перад вамі мужчына вашай мары, а вы не ўпэўненыя ў




свежасці вашага дыхання? Гэты практычна ідэальны (і практычна безадмоўны) рэкламны слоган зрабіў папулярным партатыўны дэтэктар свежасці дыхання Tanita Fresskiss. Цяпер не трэба ўпотай лізаць сваю далонь, чакаць пару секундаў і правяраць, чым усё ж павее ў вас з рота. Стары «дзедаўскі метад» саступае ў дакладнасці маленькаму прыбору вагой у 45 грамаў і даўжынёй 9 см. Ён вокамгненна вызначае колькасць прымешак сярністых злучэнняў, якія з'яўляюцца прычынай непрыемнага паху з рота, і дапаможа вырашыць, ці варта ў гэты момант звяртаць на сябе ўвагу ўпадабанага мужчыны.

**6.** Калі ж з дыханнем усё ў парадку і знаёмства адбылося, у вас ёсць шанц пакінуць сур'ёзнае ўражанне, выявіўшы неардынарныя здольнасці знаўцы вінаў. Для гэтага не давядзецца наведваць курсы самелье. Дапаможа зноў жа адмысловы гаджэт: Bluetooth — сканер — Intelliscanner Collector. Прыборчык па штрых-кодзе на этыкетцы можа апазнаць назву віна, гатунак вінаграду, з якога яно было выраблена, назву завода-вытворцы, рэгіён, краіну паходжання і нават адценні густу, якія ўмеюць вызначаць выключна знаўцы. Ёсць, праўда, у гэтай заманлівай прапанове адно «але»: бутэльку без штрых-кода сканер не зможа апазнаць. Затое, калі ў базе даных сканера няма патрэбнай інфармацыі аб нейкім віне, вы можаце ўвесці яе дадаткова ўручную.




**7.** Не сакрэт, што часам у жанчын з рук вырываюць мабільныя тэлефоны. Што рабіць — бегчы даганяць злодзея, або крычаць уголас, спадзеючыся, што нехта прыйдзе вам на дапамогу? А мо не тое і не другое, бо цяпер пакрычаць за сябе зможа... сам тэлефон. Кампанія Doberman, якая выпускае аўтамабільныя сігналізацыі, падбала і пра жанчын, выпусціўшы сэнсарную сігналізацыю Doberman Mini Mobile Alert. Калі хтосьці асмеліцца вырваць у вас тэлефон з рук, прыбор пачне выдаваць сігнал гучнасцю 95 дэцыбел, адключыць які здолее толькі вы, але не зладзюжка.

Дарэчы, у скарбонцы сігналізацый у вытворцы маецца і сігналізацыя для ноўтбукаў. Калі вы ведаеце, што можаце выпусціць



яго з увагі, націскаеце на кнопачку, і любы, хто асмеліцца крануць ваш ноўтбук, пачуе сігнал у 100 дэцыбел. Гэтая ж прылада можа выкарыстоўвацца, да прыкладу, у распранальні басейна, дзе вы пакідаеце сумачку з дакументамі і грашыма.

**8.** Аднак пагроза для мабільніка — нішто ў параўнанні з па-



грозай для вашай асабістай бяспекі. Амерыканская кампанія Taser International ужо з сярэдзіны гэтага года запусціла ў продаж электрашокеры Taser C2 — гэта так званая «грамадская версія» Taser.

Пры націску на «курок» шокера зменны патрон выпусціць сціснуты азот, пры гэтым з так званага «дула» выскачаць два правады. Той, хто асмеліцца спалохаць нас уначы, рызыкуе атрымаць 50 тысяч вольт. Радыус дзеяння шокера — 4,5 метра. Колер можна выбраць па сваім жаданні, у тым ліку і ружовы — ну хто западозрыць у такой смешнай малютцы небяспеку? Кошт прылады — 300—350 долараў.

**9.** Часта бывае: побач з вамі няма дужай мужчынскай рукі, а вам трэба зацягнуць гайку. Бо, паводле статыстыкі, на дзесяць



дзяўчат прыпадае ўсё менш хлапцоў... Не вызываць жа дзеля такой дробнай справы майстра з ЖЭС або «мужа на гадзіну». Давайце разам будзем верыць, што распрацоўка дызайнера з Мічыгана Пола Джуліуса Мартуса будзе ў хуткім часе ўвасобленая ў гаджэт. Тады вы зможаце купіць сабе дужую бронзавую мужчынскую руку — развадны ключ. Шкада толькі, што больш нічога карыснага гэтымі рукамі зрабіць не атрымаецца...

**Ліна МАЛІНІНА.**

Тэлесеткі

# Гульні на полі і танцы на лёдзе

**6 верасня тэлеканал АНТ парадуе і аматараў футбола, і актыўных прыхільнікаў шоу «Ледавіковы перыяд».**

Першым адрасавана прамая трансляцыя адборачнага матча Чэмпіянату свету-2010 — сустрэча зборных Украіны і Беларусі. Трансляцыя пачнецца ў 19.50, у перапынку — «Навіны спорту».

Другія ж адразу пасля футболу, а 22 гадзіне ўбачаць уласна прэм'еру новага сезона — дарэчы, у нас яна пачнецца адначасова з Расіяй. Імёны ўдзельнікаў-непрафесіяналаў — папулярных акцёраў, тэлевядучых, спевакоў — да апошняга моманту трымаліся ў сакрэце. І тым не менш, сапраўдным фанатам «Ледавіковага перыяду» ўжо вядома, што акцёр Сяргей Жыгуноў на здымках шоу зламаў нагу, лідар гурта «Няшчасны выпадак» Аляксей Кортнеў упершыню ў жыцці стаў на канькі, а экс-удзельніца гурта «Віа ГРА» Ганна Седакова ўвогуле баіцца лёду і складаных элементаў... Што датычыцца прафесійных фігурыстаў, іх значна менш, таму імёны ўдзельнікаў на слыху: «навічкі» Кацярына Гардзеева, Аляксандр Абт, Максім Ставінскі, і «ветэраны» шоу Аляксей Ягудзін, Ірына Лабачова, Максім Марынін, Таццяна Тацьмяніна і Таццяна Наўка. Дарэчы, Наўку нам пакажуць нават двойчы па розных каналах — у «Ледавіковым перыядзе» (на АНТ) у запісу, і ў танцавальным «Еўрабачанні» (на Першым) — у прамым эфіры.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## НЕЗНАЁМКІ ПАКРЫЎДЗІЛІ ПЕНСІЯНЕРА

Чатыры жанчыны ў адной з вёсак Лепельскага раёна скралі з дома пенсіянера два медалі, 3 мільёны беларускіх рублёў, набор нажоў. Прыкмет таямнічых незнаёмых візіцёрак (як ён расказаў у міліцыі) стары не запомніў. Сказаў, што днём зайшлі да яго, і вось такая непрыемнасць здарылася. Падрабязнасці мэты візіту гасцей высвятляюцца. Узбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Спорт-тайм

## КАН ПАСТАВІЎ КРОПКУ

У Мюнхене адбыўся развітальны матч Олівера Кана, які завяршыў сваю футбольную



кар'еру. Галкіпер абараняў вароты мясцовай «Баварыі» ад атак ігракоў зборнай Германіі да 76-й хвіліны гульні, калі яму на замену выйшаў Рэнсінг. Лік адкрыла нацыянальная каманда ў першым тайме, але баварцы не дазволілі ёй перамагчы і адказалі дакладным пападаннем у вароты ў другой палове паядынку — 1:1. Галы на рахунку Трахоўскага і Клозэ. Правесці ветэрана з вялікага футбола на «Альянц-Арэну» завітала каля 70 тысяч гледачоў.

## У КАГО БОЛЬШ РОЗУМУ...

Галоўны трэнер мінскага «Дынама» Джым Х'юз пракаментаваў стартавы паспяховы матч беларускай каманды ў КХЛ, дзе яго хакеісты выйгралі ў навакузнецкага «Металурга» ў авертайме (5:4). «Гэты паядынак быў вельмі інтэнсіўным, хуткім, і таму павінен спадабацца балельшчыкам, — сказаў ён. — Шчыра прызнацца, я не думаў, што ў нас будзе столькі выдаленняў, і ўсё ж мяне ўразіла першая гульня ў КХЛ». Рулявы сапернікаў Барыс Міхайлаў ацаніў вынік стартавага матча так: «У каго больш розуму, той і перамагае. Гэта новая ліга. Тут няма дэбютантаў, усе змагаюцца за выжыванне. Тым больш цяпер, на старце сезона, усе каманды ў добрай фізічнай форме. У «Дынама» дастаткова вопытных ігракоў, якія гуляюць у абароне рацыянальна і граматна».

Дарэчы, учора «Металург» зноў экзаменаваў дынамаўцаў. Матч завяршыўся з лікам 5:2 на карысць расіян.

## У БАТЭ НАВІЧОК-ЛЕГІЯНЕР

Склад чэмпіёнаў Беларусі на правах вольнага агента папоўніў малады грузінскі паўабаронца з дубля тбіліскага «Дынама» 21-гадовы Лаша Дзеканасідзэ. Легіянер ужо дазаяўлены для ўдзелу ў вышэйшай лізе нацыянальнага футбольнага першынства і ў Лізе чэмпіёнаў.

## ДРАКОН-ЧЭМПІЁН

Пераможцам кантынентальнага першынства па кікбоксінгу WBKF у вагавай катэгорыі да 81 кілаграма стаў Аляксандр Svіцін з Віцебска. Тытул дастаўся беларусу, які з'яўляецца фіналістам Кубка свету-2004, чэмпіёнам Еўропы-2002, на рынгу ў Маскве на «турніры чатырох». У фінальным баі наш Дракон (менавіта так празвалі Свіціна) перамог украінца Паўла Харчанку па ачках (3:0).

## «ДАГАВАРНЯКІ» РАСКРЫТЫЯ?

На чэмпіянаце свету па футболе-2006 у Германіі былі дагаворныя матчы. Аб гэтым паведаміў у сваёй кнізе «Дагаварняк» англійскі журналіст Дэклан Хіл. Ён перакананы, што на першынстве планеты былі спланаваныя вынікі не менш чым чатырох гульняў, у тым ліку чвэрцьфінальнай сустрэчы Італія — Украіна (4:0). Прадстаўнік СМІ сцвярджае, што сіндыкат падпольных ставак Бангкока аказаў уздзеянне на футбалістаў зборных Ганы, Эквадора і Украіны. Хіл піша, што перад матчамі групавой стадыі Італія — Гана (2:0), 1/8 фіналу Бразілія — Гана (3:0) і 1/4 фіналу Італія — Украіна (4:0) яму паведамілі дакладныя вынікі гэтых паядынкаў.

Дарагога і любага сыночка **Віктара Васільевіча МІХАЙЛОЎСКАГА** з г. Жодзіна віншую з днём нараджэння. Жадаю моцнага здароўя, даўгалецця і ўсіх зямных даброт.

**Мама,** *в. Такаўшчына.*

# ЛІГА ЧЭМПІЁНАЎ: ЦЯПЕР І НАШ ФАРМАТ

**Барысаўскі БАТЭ — першы ў гісторыі Лігі чэмпіёнаў беларускі клуб, які ў гэтым годзе прадставіць краіну сярод 32 удзельнікаў асноўнага этапа гэтага самага папулярнага еўрапейскага клубнага турніру. Прычым у першай жа сустрэчы барысаўчан чакае самы тытулаваны клуб Лігі чэмпіёнаў — мадрыдскі «Рэал», які дзевяць разоў выйграваў трафей. Вось некаторыя цікавыя факты з больш чым паўвекавой гісторыі гэтых спаборніцтваў.**

Першы розыгрыш самага прэстыжнага еўрапейскага трафея стартаваў праз месяц пасля першага Кангрэса УЕФА, які адбыўся 2 сакавіка 1955 года ў Вене. Цікава, што ідэя аб арганізацыі «Кубка Еўропы» належала зусім не футбольнаму саюзу.

## ФРАНЦУЗСКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

У той час, як члены нованароджанага футбольнага саюза былі азадачаныя арганізацыяй міжнародных спаборніцтваў з удзелам зборных, рэдактар французскай спартыўнай газеты L'Equipe Габрыэль Ана выказаў ідэю аб стварэнні клубнага турніру еўрапейскага маштабу. Матчы новага турніру Ана разам са сваім калегам Жакам Феранам прапанаваў праводзіць у сераду ўвечары.

## СТАРТ «СПОРТЫНГА»

Паводле агавораных арганізатарамі правілаў, удзел у розыгрышы чэмпіёнаў асобных краін спачатку не быў абавязковым. Каманда L'Equipe палічыла, што да ўдзелу ў турніры больш выгадна запрашаць найбольш папулярныя клубы. На сустрэчы прадстаўнікоў шаснаццаці ўдзельнікаў дэбютнага розыгрышу 2 і 3 красавіка 1955 года рэгламент L'Equipe знайшоў адзінагалосную падтрымку. У дэбютным матчы новага турніру «Спортынг» і «Партызан» забілі адзін аднаму ў Лісабоне па тры мячы. У сустрэчы ў адказ у Белградзе перамогу з лікам 5:2 святкавалі югаславы, якія і прайшлі ў наступны раўнд.

## ДАМІНАВАННЕ «РЭАЛА»

Першыя пяць трафеяў дасталіся мадрыдскаму «Рэалу». Іншым клубам пасля таксама ўдаваліся захапляльныя серыі — «Аякс» і «Баварыя», напрыклад, выйгравалі «кубак з вялікімі вушамі» па тры разы запар. Аднак казаць пра чыё-небудзь доўгатэрміновае дамінаванне ў самым прэстыжным Еўракубку не даводзіцца. Так, амстэрдамцы пасля ўдарнага адрэзку ў пачатку 70-х свайго чацвёртага тытула чакалі 22 гады, а перамога «Рэала» ў 1998 годзе стала першым трыумфам мадрыдцаў за папярэднія 32 гады. Баварцы ж у 2001 годзе перарвалі 26-гадовае чаканне чацвёртага трафея, перамогшы ў Мілане па пенальці.

## МЕРСІСАЙДСКІЯ ВАРОТЫ

Чатыры перамогі «Ліверпуля» ў перыяд з 1977 па 1984 год заслугоўваюць асобнага ўпамінання, паколькі былі дасягнуты чатырма практычна рознымі складамі. У 2005 годзе чырвоная мерсісайдская зорка зноў узышла на еўрапейскім небасхіле. У неверагодным па напалу пачуццяў фінальным паядынку супраць «Мілана» англічане здолелі адгуляць тры мячы і схіліць шалі на свой бок у серыі пенальці.




## ДОШКА ГОНАРУ

Самай тытулаванай камандай у гісторыі Лігі чэмпіёнаў УЕФА застаецца яе трохразовы пераможца «Рэал». Калі браць у разлік і Кубак чэмпіёнаў, то ў скарбонцы «каралеўскага клуба» дзевяць перамог. За ім з шасцю тытуламі ідзе «Мілан», у актыве «Ліверпуля» пяць перамог, у «Баварыі» і «Аякса» — па чатыры. «Расанеры» свой апошні трафей выйгралі ў кампаніі 2002/03, стартаваўшы з трэцяга раўнда кваліфікацыі і завяршыўшы турнір серыяй пенальці ў фінальным матчы супраць «Ювентуса».

## ЗМЕНА ФАРМАТУ

Пераломным момантам у развіцці турніру прынята лічыць сезон 1992/93, калі на змену Кубку чэмпіёнаў прыйшла Ліга чэмпіёнаў. Да стадыі плэй-оф у розыгрыш дадаўся групавы этап, апрабаваны за год да таго. Рост папулярнасці прывёў да таго, што лік удзельнікаў асноўнай сеткі турніру з часам вырас з 8 да 32. Матчы Лігі чэмпіёнаў праводзяцца па аўторках і серадах.

**Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# ШАХМАТЫ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА*

**КОНКУРС РАШЭННЯЎ**

**Заданне № 7**



Мат за 3 хады (6+9).

**Заданне № 8**



Мат за 4 хады (4+1).

**ПРАВЕРЦЕ СВАЕ АДКАЗЫ**

Прыводзім рашэнні першых заданняў конкурсу, апублікаваных 9 жніўня.

**Заданне № 1.** 1. Фh1! ~~ Ke4 2. Ф:e4x; 1. ... f5 2. Фh8x; 1. ... Kpf5 2.Фh5x; 1. Фa8? Kpf5!

**Заданне № 2.** 1. Лbb5! ~~ 1. ... Лc4 2. c3x, 1. ... Лc5 2. c4, 1. ... Лd3 2. cdx,1. ... Л:c2 2.C:c2x, 1. Лdb5? Лb3!, 1. Лb8? Лc5!

Адказы даслалі нашы актыўныя ўдзельнікі — Юрый Бандарэнка (Магілёў), Віктар Быкаў, Сяргей Гурыновіч, Мікалай Янучок (Мінск), Міхаіл Балянкоў (Рагачоўскі раён), Анатоль Прынеслік (Віцебск), Алег Бадзюкоў (Круглянскі раён), Валерый Лук'янчык (Талачынскі раён), Аляксандр Марцуль (Шчучынскі раён) і іншыя.

**ПАТАВЫЯ КАМБІНАЦЫІ**

Становішча, калі кароль пры сваім ходзе не знаходзіцца пад шахам, але кожнае яго перамяшчэнне на дошцы будзе пад ударам фігуры саперніка, а ўсе іншыя фігуры і пешкі яго колеру пазбаўлены рухомасці, называецца патам.

Пат можа быць ідэальным, люстраным, правільным, чыстым, эканамічным. Пазіцыя, дзе ні адзін з бакоў не мае магчымасці зрабіць ход, носіць назву двухбаковага пату.

Пат — даволі моцны тактычны прыём і разам з тым каварны і нечаканы.

Напрыклад, у партыі П. Керас — Р. Халмоў [белыя: Kpg1, Фf6, пп. a4, f2, f3 (5), чорныя: Kph6, Фh3, пп. g6, h7 (4)] чорныя падставілі свайго ферзя пад бой: 1. ... Фg4+! 2. Kph2 (калі 2. gf — пат!) 2. ... Фh5+ 3. Kpg2 Фg4+ (зноў той жа прыём) 4. Kpf1 Ф:a4 і белыя пагадзіліся на нічыю.

Усё ж у практычнай гульні пат — з'ява даволі-такі рэдкая. Яна рэдкая таксама і ў задачнай кампазіцыі. А вось у эцюднай кампазіцыі патавыя ідэі маюць надзвычай шырокі попыт.

Прыводзім два прыклады.

У. БРОН («Шахматный листок», 1928 г.). Белыя : Kpd1, Ce4, Kg5, пп. b6, e7 (5). Чорныя: Kpc4, Лg4, Ch5, Kh2 (4). Белыя пачынаюць і робяць нічыю.

1. e8Ф Л:g5+ 2. Kpd2!! Kf1+ 3. Kpc2 Ke3+ 4. Kpd2 Л:e8 5. b7 Kf1+ 6. Kpc2 Лg8 і цяпер патавая камбінацыя: 7. Cd5+! Kp:d5 8. b8Ф Cg6+ (8. ... Ca4+ 9. Kpc1 Л:b8 — люстраны пат) 9. Kpc3 Л:b8 — ідэальны люстраны пат.

А. ТРОІЦКІ («Новое время», 1895 г.). Белыя: Kpg4, Лd5, п. h2 (3). Чорныя: Kpf8, Cd2, п. g2 (3). Нічыя.

1. Лf5, Kpe7 2. Лe5 Kpd6 3. Лe1! C:e1 4. Kph3 g1Ф (Л) — пат. Калі 4. ... g1K, то 5. Kpg2 Ke2 6. Kpf1. Другі варыянт: 1. ... Kpg7 2. Kph3! (2. Лg5+? C:g5 3. Kph3! g1K!+ і выйграюць чорныя). 2. ...g1Ф 3. Лg5+ Ф:g5 — пат. Гэта першае адлюстраванне тэмы двайнога пата.

Гэты эцюд быў прысвечаны першаму чэмпіёну свету В. Стэйніцу. Цікава прывесці ўспаміны аўтара эцюда: «Я да гэтага часу памятаю, як ажывіўся стары Стэйніц, калі я паказаў яму свой твор. Гэта было ў час матча паміж Стэйніцам, Ласкерам, Пілсберы і Чыгорыным. Стэйніц звярнуў увагу іменна на тое, што ў эцюдзе атрымліваюцца тры патавыя сітуацыі».

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 11 (33)

## КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА ПРАБЛЕМАХ АСАБЛІВА АХОЎНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ ПРОЙДЗЕ Ў БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ

III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Эколага-эканамічны механізм захавання біялагічнай разнастайнасці асабліва ахоўных тэрыторый» пройдзе 5-6 верасня ў нацыянальным парку «Белавежская пушча», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў сектары па сувязях з грамадскасцю Беларускага рэкламна-інфармацыйнага агенцтва Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Сваім вопытам у галіне развіцця і захавання біяразнастайнасці запаведных тэрыторый падзеляцца амаль 30 вучоных з Беларусі, Расіі і Украіны. У ходзе канферэнцыі плануецца разгледзець механізмы фінансавання нацыянальных паркаў у розных краінах, абмеркаваць новыя падыходы кіравання асабліва ахоўнымі тэрыторыямі.

**Святар. Паэт. Патрыёт**

# СВОЙ УСІМ ДОБРЫМ ЛЮДЗЯМ

«Узрост — 18, рост — 2 арш. 5 вяр., валасы — русыя, вочы — блакітныя(...), асаблівыя прыкметы — няма». Гэта — радкі з дакумента, выдадзенага ў 1908 годзе прызыўніку заходне-беларускай вёскі Барані былога Свянцянскага павета. Маладому хлопцу так і не давялося служыць у царскім войску, яму была прызначана іншая місія: паступіць у Віленскую Рымска-каталіцкую Епархіальную Семінарыю.

Шкада, што ў прыпісное пасведчанне запісвалі толькі вонкавыя характарыстыкі. У іншым выпадку ў графе «асаблівыя прыкметы» абавязкова напісалі б: адданы хрысціянін; аматар літаратуры...

Напэўна, ніхто і не здагадваўся, што гэты малады беларус (у будучым каталіцкі святар) ужо праз чатыры гады напіша па-беларуску свой першы верш, а крыху пазней — дарасце і да зборніка.

«Першы верш «На імяніны майго пробашча» напісаў — добра запомніў гэты дзень — 23 кастрычніка 1912 года. І як не запомніць, калі не па-польску (дагэтуль і такі «грашок» меў) выказаў свае думкі, а па-беларуску, — успамінаў пазней у сваім дзённіку малады хлопец. — У пачатку наступнага ж года некалькі твораў прапанаваў рэдакцыі газеты «Беларус». Адзін з іх, «Прад Богам», быў надрукаваны. Гэта абрадавала, акрыліла. У далейшым вырашыў выбраць літаратурны псеўданім. Падшукваў розныя варыянты, а спыніўся ці не на самым простым — Казімір Сваяк. Свой усім добрым людзям. Такі, як усе. Ды і навошта сябе з народа вылучаць? З ім трэба жыць, а не цурацца яго».

Сваяк Казімір — ён жа — жыхар в. Барані Стаповіч Канстанцін. Святар. Паэт. Патрыёт.

Сваяк — адзін з пачынальнікаў духоўна-ірацыянальнай плыні ў заходнебеларускай паэзіі, а асаблівасць яго творчасці — у спалучэнні містычнага і інтуітыўна-экстатычнага ўспрыняцця свету. Так вызначаюць творчасць паэта літаратары. Але Казімір Сваяк быў вядомы не толькі паэзіяй. Культурна-асветніцкая праца ў святара таксама была багатая: арганізацыя лекцый па беларусазнаўстве, беларускіх настаўніцкіх курсаў, адкрыццё беларускіх школ, стварэнне беларускага гуртка «Хаўрус сваякоў» (суполка моладзі, якая ўваходзіла ў гурток, чытала даклады па культуры і гісторыі, наладжвала канцэрты і спектаклі). У маладога паэта было яшчэ столькі планаў...








Пражыў Казімір Сваяк 36 вёснаў... Сухоты. CONTRA SPEM SPERO[1]. **Нават польскі Закапанэ не ўратаваў беларускага мастака слова ад віленскіх могілак Роса.**

Слаўнага беларускага паэта і філосафа я ўзгадаў, наведаўшы нядаўна вёску Засвір у Мядзельскім раёне. Сюды, у аднаўленую парафію, малады святар прыехаў у 1920-ым. Шэсць гадоў засвірскія парафіяне мелі магчымасць паслухаць касцёльныя казанні на сваёй, роднай мове.

Шкада, не захаваўся сёння той драўляны ганак, прыбудаваны да касцёла, на прыступках якога любіў сядзець паэт, «ціха напяваючы любімыя мелодыі, абдумваючы і дапісваючы пад натхненнем свае вершы...»[2]. Шкада, што ў кляштары, у якім жыў паэт, сёння расце трава і кусты вербалозу.

У спадчыну ад той засвірскай пары засталіся толькі руіны кляштара, малюнкі Драздовіча (мастак сябраваў з паэтам і часта гасцяваў у яго, робячы замалёўкі мясцовасці) і маленькая кніга вершаў з назвай «Мая ліра»[3].

Узгадалася гэта пасля наведвання выставы ў засвірскім касцёле, прысвечанай Сваяку і сузірання адмысловай шыльды на касцёльнай сцяне — «Казімір Сваяк. Працаваў у гэтым касцёле(...). «Стараўся быць чыстай і простай мыслі».

Аналагічныя памятныя шыльды былі ўсталяваны ва ўсіх беларускіх святынях, дзе працаваў Канстанцін Стаповіч: акрамя Засвіра — у Камаях і Клюшчанах.

Ініцыятыва зыходзіла ад Іаланты Валуевіч з Астравеччыны, далёкай сваячкі паэта, адной з найбольш актыўных даследчыкаў жыцця і творчасці Казіміра Сваяка.

Як расказала сама жанчына, у в. Барані (роднай вёсцы Стаповіча), у хаце паэта, якая насуперак часу захавалася, хутка пачне сваю працу адмысловы музей Казіміра Сваяка. Акрамя гэтага, асобнай кнігай плануецца і выданне збору лепшага, што напісаў паэт: яго вершы, апавяданні, нарысы, драмы, разважанні, артыкулы. У новую кнігу будзе ўключана перапіска паэта, рэдкія фотаматэрыялы (напрыклад, унікальны фотаздымак 1915 года, на якім малады паэт разам з уласна арганізаваным хорам парафіян у 40 чалавек), а таксама публіцыстыка навукоўцаў і даследчыкаў асобы Стаповіча.

Тут вельмі дарэчы ўзгадваюцца словы сябра паэта, каталіцкага святара Адама Станкевіча, які ў 1931 годзе ў сваёй кнізе «Казімір Сваяк: нарысы аб ягонай ідэалогіі. У пятыя ўгодкі смерці» пісаў: «Пасмертная спадчына Сваяка агулам даволі значная. Многа з твораў яго ўжо вышлі друкам і сталіся ўласнасцю беларускага грамадзянства і народу агулам, а многія яшчэ ляжаць спакойна ў рукапісах і чакаюць на свайго выдаўца». І дадаючы, адзначаў: « (...) толькі тады можна будзе намаляваць сапраўды поўны духоўны вобраз паэта з усімі яго асаблівасцямі, калі ўсе творы Сваяка ў цэласці пакажуцца свету».

Сёлета, калі да 120 гадавіны з дня нараджэння Казіміра Сваяка застаецца два гады, хочацца шчыра верыць, што словы Адама Станкевіча стануць прарочымі і ў хуткім часе мы яшчэ пачуем пра несправядліва забытага беларускага паэта. Свайго ўсім добрым людзям.

**Ілья ЛАПАТО.**

[1] Праціў надзеі надзеюся (лац.). Надпіс у запісах паэта з яго дзённіка «Дзея маёй мыслі, сэрца і волі».

[2] З анатацыйнага подпіса Язэпа Драздовіча да карціны «Сваякоў ганак».

[3] Адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў Казіміра Сваяка.







**Тры паркавыя скульптуры — «Пушкін», «Жураўлі» і «Трубач» — упрыгожылі цэнтр Наваполацка напярэдадні 50-гадовага юбілею горада.**

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛТА.

## АРТЫСТЫ— НА ЧЭМПІЯНАЦЕ СВЕТУ

Прадстаўнікі нашай краіны ў другі раз возьмуць удзел у першынстве планеты па футболе сярод артыстаў эстрады, тэатра, кіно і тэлебачання «Арт-футбол-2008», які адбудзецца з 9 па 16 верасня ў Новарасійску і Геленджыку. Акрамя каманды Беларусі «Арт-Старс», удзел у турніры бяруць яшчэ 11 зборных. Першы матч у групе B беларусы правядуць супраць карэйцаў 11 верасня. Сапернікамі «Арт-Старс» таксама сталі румыны.

Асаблівасць заключаецца ў тым, што ў склад каманды можа ўваходзіць адзін чалавек любой сферы дзейнасці. Паводле ўмоў чэмпіянату, сярод гульцоў могуць быць толькі два ветэраны футбола (у беларускай дружыне гэта гуляючы трэнер Анатоль Алейнікаў і галкіпер Андрэй Канапелька), а астатнія павінны мець дачыненне да артыстычнай прафесіі і даказаць гэта пры дапамозе прадастаўленых аўдыё- і відэазапісаў, матэрыялаў у СМІ. Нашу краіну прадстаўляць: артыст тэатра «Хрыстафор» Анатоль Длускі, спявак Сяргей Мінскі, кампазітар і выканаўца Альберт Скараход (капітан каманды).

**Ірына ПРЫМАК.**

**Ведай нашых!**

# «І не трэба ніякіх слоў»

«У вёску Магіліцы я прыехаў, каб сустрэцца не з інвалідам, а мастаком і паэтам». З такіх слоў наш карэспандэнт Сымон Свістуновіч пачынаў артыкул «Плыць па небе — сінім бродам», змешчаны ў газеце «Звязда» 25 ліпеня — параўнальна нядаўна.

Але ж герой публікацыі Анатоль ГАЛУШКА помніцца чытачам не толькі па гэтай прычыне. Многіх (мы ўпэўнены) не маглі не ўразіць пейзажы прыкаванага да ложка мастака, яго — вершы...

Днямі што-кольвечы з іх, па прапанове нашага карэспандэнта, Анатоль Мікалаевіч прыслаў у рэдакцыю. «Зусім хутка, у верасні, у Івацэвічах я плану правесці мастацкую выставу, — напісаў ён ва «ўступным слове». — Побач з кожнай карцінай там будзе невялічкі верш-прысвячэнне... Але ж, як мне здалося, дык і без карцін гэтыя вершы маюць сэнс, з'яўляюцца самадастатковымі».

Зазначым, што так здалося не толькі аўтару, а таму...

## Анатоль ГАЛУШКА

### КАБ...

*Каб не скончыўся род*
*і не зніклі імёны,*
*За месца пад сонцам,*
*за пядзю зямлі*
*Змаганне вядуць*
*маладзенькія клёны...*
*Іх продкі — таксама змаганне вялі.*

### ЗОЛАК

*Па вузкай кладачцы, на зорцы,*
*Пакуль не высахла раса,*
*Пайду на луг. І там — да сонца*
*Звіні, спявай, мая каса!*

### МЕТАМАРФОЗА

*Апошні сонечны прамень*
*З-за хмары вызірнуў раптоўна —*
*І стаў, адразу ж, лес —*
*чароўным,*
*Загадкавым, як свет і цень.*

### КАШТОЎНЕЙ!

*Напэўна і крылаў не трэба —*
*Замяніць іх думак палёт.*
*Ну што тое сіняе неба?*
*Каштоўней —*
*духоўны ўзлёт.*

### НА СВІТАННІ

*Струменіць неба свет ружовы*
*На сіні лес, на паплавы.*
*Пачаўся дзень — прыгожы, новы —*
*І хмары ў прошласць адплылі.*

### БЭЗ

*І зноў за акном*
*цёплы вецер-гарэза*
*Гайдае галінкі*
*духмянага бэзу.*
*Гараць, нібы свечкі —*
*блакітна-ружовым —*
*Прыгожыя кветачкі*
*полымем новым.*

### ТАКІ СВЕТ

*Па-над возерам сонным і ціхім*
*Прагучаў ці то стогн, ці то крык?*
*Толькі свету — якое ліха?*
*Ён да стогну і крыку... прывык.*

### НА ПАЛЯВАННІ

*Жыве першабытны звычай*
*І мужчынскую грэе кроў —*
*Пасядзець ля агню...*
*Са здабычай*
*І не трэба ніякіх слоў.*

### ПАКУЛЬ ЖЫВЫ

*Жыццё, як вада —*
*сцячэ,*
*між далоняў пральецца,*
*Зруйнуе ў пыл*
*і дубоў векавыя камлі...*
*Не згаснуць*
*бы ў цемры!*
*Няхай успамін застанецца —*
*Жывы чалавек,*
*пакуль помняць яго на зямлі.*

## На конкурс апавяданняў

**Генадзь Аўласенка — лаўрэат нашага конкурсу мінулага года. Настаўнік. Выкладае заалогію ў дзвюх вясковых школах. Адна знаходзіцца за шэсць кіламетраў ад г. Чэрвеня, дзе Генадзь жыве, другая — за дваццаць. Амаль адзіны транспарт вясковага настаўніка — веласіпед. І нічога — як гэта ні горка гучыць — дарога і транспарт спрыяюць творчасці і фантазіі. Добраму чалавеку, вясёламу і кампанейскаму, сапраўднаму творцу, усе цяжкасці толькі на карысць. Лепшае пацвярджэнне гэтаму — яго новае апавяданне.**

**Віктар КАЗЬКО.**

## Генадзь АЎЛАСЕНКА

# МАЛЕНЬКІЯ ЧЫРВОНЫЯ ЧАЛАВЕЧКІ

Першай у кабінет увайшла дзяўчынка. Яна спынілася каля дзвярэй, паглядзела на псіхатэрапеўта і моўчкі яму ўсміхнулася. Той таксама ўсміхнуўся ў адказ і хацеў нават штосьці сказаць дзяўчынцы, але ў гэты самы час у кабінет увайшла жанчына, па ўсім бачна, яе маці.

— Добры дзень, доктар! — нясмела прамовіла яна і, узяўшы дзяўчынку за руку, падвяла яе да стала, за якім сядзеў псіхатэрапеўт. Той паказаў жанчыне на крэсла, і жанчына паслухмяна на яго апусцілася. Дзяўчынка засталася стаяць побач.

Увесь той час, пакуль псіхатэрапеўт праглядаў гісторыю хваробы і іншыя паперы, якія ляжалі перад ім на стале, і маці, ды і сама дзяўчынка нават не варухнуліся. Маці сядзела, напружана выпрастаўшыся, яе вялікія заплаканыя вочы з трывогай і адначасова з надзеяй сачылі за кожным рухам чалавека ў белым халаце, які сядзеў насупраць. Дзяўчынка ж, наадварот, разглядала псіхатэрапеўта спакойна і нават з нейкай асаблівай цікаўнасцю.

— Ну што ж... — псіхатэрапеўт адсунуў усе паперы крыху ўбок і праз акуляры ўважліва паглядзеў на дзяўчынку. — Цябе Дашай завуць?

— Дашай, — дзяўчынка зноў усміхнулася. — А вас?

— А мяне — Сяргей Фёдаравіч! — псіхатэрапеўт памаўчаў крыху: — Не трэба мяне баяцца, Даша.

— А я і не баюся! — дзяўчынка паглядзела на маці, сустрэлася з яе трывожным позіркам і дадала: — Гэта мама чамусьці вас баіцца!

Жанчына раптам гучна ўсхліпнула і, апусціўшы галаву, пачала хуценька выціраць вочы вялікай сіняй насоўкай.

— Так... — псіхатэрапеўт задуменна забарабаніў пальцамі па паліраванай паверхні стала. — Скажы, Даша, і як даўно ты іх бачыш?

— З мінулага года! — адказала за дзяўчынку маці, нервова камечачы насоўку. — З таго самага часу, як...

Яна змоўкла, не дагаварыўшы.

— З таго часу, як бабулі стала дрэнна! — закончыла фразу дзяўчынка. — Але ты памыляешся, мамачка! Я бачыла іх раней, толькі ўвесь час неяк здалёк. А ў той дзень я ўпершыню ўбачыла іх у нашай кватэры. Ля бабулінага ложка...

Маці зноў усхліпнула і хацела штосьці ці то дадаць, ці то проста запярэчыць, але псіхатэрапеўт жэстам яе спыніў.

— І як яны выглядалі? — спытаў ён дзяўчынку. — Яны вялікія?

Дзяўчынка засмяялася.

— Яны зусім маленькія! — сказала яна. — І смешныя. А яшчэ яны вельмі чырвоныя, зусім як... як...

— Як морква? — паспрабаваў падказаць доктар, але дзяўчынка толькі адмоўна затрэсла галавой. — Ці, можа, як суніцы?

— Яны проста чырвоныя, і ўсё! — дзяўчынка зноў засмяялася. — І мяккія. Як пластылін. І я з імі размаўляла, а яны сказалі мне, што прыйшлі па бабулю. Чаму ты плачаш, мамачка? — дзяўчынка павярнулася да маці і пяшчотна пагладзіла яе па шчацэ. — Яны сказалі мне, што бабулі там будзе добра!

Жанчына раптам ускочыла з крэсла і, прыціснуўшы насоўку да вачэй, таропка выбегла з кабінета. Дзяўчынка нейкі час глядзела на прыадчыненыя дзверы, потым села на месца маці і зноў павярнулася да псіхатэрапеўта.

— Мама не верыць, што я іх бачу, — сказала яна, крыху сцішыўшы голас. — Яна думае, што я ўсё гэта толькі прыдумляю. А вы мне верыце? — раптам спытала яна псіхатэрапеўта. — Ці таксама лічыце, што я хлушу?

— Ну, зразумела ж, я так не лічу! — сказаў псіхатэрапеўт, крыху сумеўшыся пад гэтым ясным і даверлівым дзіцячым позіркам. — Я не лічу, што ты хлусіш, але... ведаеш, часам бывае, што чалавек раптам пачынае бачыць тое, чаго ў сапраўднасці няма. Гэта называецца...

— Галюцынацыяй? — перабіла псіхатэрапеўта дзяўчынка. — Мама і аб гэтым мне казала! Толькі яны не галюцынацыя, гэтыя чырвоныя чалавечкі! Яны сапраўдныя...

У гэты час у кабінет вярнулася жанчына. Яна паглядзела на дачку і, не падыходзячы да стала, апусцілася на самы край кушэткі, якая стаяла каля сцяны. Насоўку жанчына па-ранейшаму нервова камячыла ў далонях.

— Ну што ж... — псіхатэрапеўт уздыхнуў і пачаў хуценька запаўняць нейкі чысты бланк. Потым ён адклаў ручку ўбок і зноў падняў вочы на дзяўчынку. — Скажы, а потым... ты іх бачыла потым? Пасля таго, калі...

Ён змоўк, не ведаючы, як лепш закончыць фразу.

— Пасля таго, калі бабуля памерла? — здагадалася дзяўчынка. — А як жа! Я іх часта сустракала потым на вуліцы, праўда, ніколі зблізку. А потым яны зноўку наведаліся да нас. Гэта было, калі захварэла цёця Рая...

— Мая сястра! — падала голас жанчына. — Яна жыве з намі.

— Жыве? — псіхатэрапеўт уважліва паглядзеў на жанчыну. — Дык яна... паправілася?

— Ну, так! — жанчына сцвярджальна кіўнула. — У яе быў рак, прытым у самай запушчанай форме, а потым... потым яго раптам не стала.

— Як не стала? — спытаў псіхатэрапеўт. — Быў і не стала?

Жанчына зноў кіўнула.

— Урач, які лячыў яе, сказаў, што гэта вельмі падобна на цуд! І што ён бы ніколі не паверыў, што такое наогул магчыма... не паверыў, калі б сам не лячыў яе, калі б хто-небудзь іншы расказаў яму гэтую гісторыю...

— Проста я папрасіла чалавечкаў не чапаць цёцю Раю! — сказала дзяўчынка. — Я растлумачыла ім, як сумна мне будзе без цёці Раі...

— І яны паслухаліся? — з нечаканай цікаўнасцю спытаў псіхатэрапеўт.

Дзяўчынка кіўнула.

— Яны заўжды цябе слухаюцца?

Дзяўчынка паціснула плячамі.

— Не ведаю, я іх больш ні аб чым не прасіла. Я сказала ім, каб не чапалі цёцю Раю, і яны адразу ж зніклі... А ведаеце, — яна зноў сцішыла голас, — тут, у вашай бальніцы, іх вельмі шмат! Нават у гэтым кабінеце!

— Што? — псіхатэрапеўт міжволі агледзеўся па баках. — Ну, ты і фантазёрка!

Ён стрымана засмяяўся, але засмяяўся толькі ён адзін і таму амаль адразу ж змоўк. Дзяўчынка глядзела на псіхатэрапеўта неяк вельмі ўжо сур'ёзна і ўважліва, а яе маці наогул на яго не глядзела. Яна глядзела на дачку з дрэнна прыхаваным спалохам.

— І іх тут шмат? — нечакана нават для сябе самога спытаў псіхатэрапеўт і, не чакаючы адказу, дадаў: — Што ім ад мяне трэба?

— Нічога! — дзяўчынка зноў паціснула плячамі. — Яны проста чакаюць...

— Чакаюць чаго?

Дзяўчынка не адказала.

— Чаго чакаюць?! — павысіў голас псіхатэрапеўт. — Прызнайся, што ты ўсё гэта прыдумала! Прыдумала, так?!

— Яны просяць вас не крычаць на мяне! — ціха сказала дзяўчынка. — Ім гэта не падабаецца!

— Ах, ім гэта не падабаецца! — устаўшы з-за стала, псіхатэрапеўт шпарка падышоў да акна, спыніўся каля яго, нейкі час бяздумна глядзеў уніз. — Не падабаецца... скажыце, калі ласка!

Дзяўчынка таксама ўстала з крэсла і, падышоўшы да псіхатэрапеўта, асцярожна дакранулася да яго далоні сваімі маленькімі пальчыкамі.

— Хочаце, я папрашу іх знікнуць? — ціха сказала яна.

— А?! — псіхатэрапеўт неўразумела павярнуўся да дзяўчынкі, іх позіркі сустрэліся. — Што?!

— Яны сказалі мне, што ў вас вельмі зношанае сэрца, — гэтак жа ціха дадала дзяўчынка. — І што ў вас ужо было некалькі мікраінфарктаў. Я, праўда, не ведаю, што гэта такое, але... нічога! Я папрашу іх пакінуць вас у спакоі, — прагаварыла яна ўжо гучней. — Не ведаю, паслухаюць яны мяне ці не... але ж паспрабаваць можна! Калі вы гэтага вельмі хочаце...

У гэты час шырока расчыніліся дзверы і ў кабінет увайшла медсястра.

— Сяргей Фёдаравіч, вы не забыліся на нараду? — падкрэслена гучна спытала яна, непрыязна зірнуўшы пры гэтым у бок жанчыны. Тая адразу ж спешна ўзнялася з кушэткі. — Між іншым, да яе пяць хвілін засталося!

— Я памятаю!

Псіхатэрапеўт замітусіўся, выцягнуў з шуфлядкі стала нейкія паперы, імкліва пачаў іх перагортваць, адбіраючы патрэбныя. Не звяртаючы больш аніякай увагі ні на дзяўчынку, ні на яе маці, ён заспяшаўся да выхаду і толькі каля самых дзвярэй азірнуўся. Жанчына нерухома стаяла каля дзяўчынкі, абдымаючы яе рукой за плечы.

— Ведаеце, я зусім забыўся пра гэтую нараду! — ён змоўк на імгненне, нібыта аб чымсьці разважаючы. — Пачакайце мяне ў калідоры, добра?

— Можа, нам лепш прыйсці заўтра? — нясмела прапанавала жанчына.

— Не, не! Пачакайце! — псіхатэрапеўт паглядзеў на гадзіннік. — Я доўга не затрымаюся... пастараюся не затрымацца доўга...

Ён выйшаў. Медсястра памарудзіла крыху, нецярпліва чакаючы, пакуль жанчына з дзяўчынкай таксама пакінуць кабінет.

— Дык нам пачакаць? — спыталася ў яе жанчына.

Нічога не адказаўшы, медсястра змерала жанчыну халодным позіркам, потым павярнулася і павольна пайшла прэч. Яна рухалася па калідоры, а жанчына глядзела ёй услед, і ў яе позірку па-ранейшаму дзіўна перапляталіся трывога і надзея, надзея і трывога...

Потым дзяўчынка нясмела тарганула маці за руку.

— Пойдзем дамоў, мамачка! — ціха прагаварыла яна.

— Дамоў? — жанчына нерашуча паглядзела на дачку. — Але ж доктар... ён прасіў нас пачакаць, пакуль вернецца...

— Ён не вернецца!

— Не вернецца?

Жанчына нахілілася, яе вялікія змучаныя вочы апынуліся раптам зусім побач з яснымі блакітнымі вачыма дзяўчынкі.

— Чаму ён не вернецца?

Не адказваючы, дзяўчынка толькі моўчкі паціснула плячамі.

— Гэта яны сказалі табе аб гэтым?

Дзяўчынка кіўнула.

Дзесьці ў глыбіні калідора пачуліся раптам нечыя ўсхваляваныя галасы, двое мужчын у белых халатах, спяшаючыся прабеглі каля жанчыны з дзяўчынкай. У руках аднаго з мужчын былі насілкі.

— Гэта з Сяргеем Фёдаравічам дрэнна! — паведаміла дзяўчынка маці. — Сэрца не вытрымала. І якраз каля ліфта. Але дарэмна яны так спяшаюцца... яму ўжо не дапамагчы. Куды ты, мамачка?!

Жанчына выпрасталася і нечакана пабегла па калідоры ўслед за мужчынамі. Дзяўчынка таксама бегла за ёй, але як ні старалася, усё роўна не паспявала. І толькі за паваротам, калі жанчына спынілася, дзяўчынка змагла дагнаць яе. І адразу ж ухапіла за руку.

Каля ліфта і сапраўды сабралася шмат людзей, пераважна ў белых халатах, але некаторыя былі і без іх. Псіхатэрапеўт нерухома ляжаў на падлозе, тварам уверх, адна з жанчын толькі што зрабіла яму ўкол... побач з ёй санітары таропка разварочвалі насілкі...

— Калі б я папрасіла іх там, у кабінеце... — нечакана гучна прагаварыла дзяўчынка. — А зараз іх ужо позна прасіць...

— Дык яны што, і сапраўды існуюць?! — голас жанчыны раптам спалохана задрыжаў і сарваўся. — Іх тут шмат?!

Дзяўчынка кіўнула галавой.

— І што яны робяць зараз?

Дзяўчынка раптам весела засмяялася.

— Скачуць, дражняцца, паказваюць мне языкі. А адзін з іх толькі што паглядзеў на цябе, мамачка!

— На мяне?! Ён паглядзеў на мяне?!

У дрыжачым голасе жанчыны быў жах, самы сапраўдны жах.

— Ён што, і цяпер на мяне глядзіць?!

Дзяўчынка зноў сцвярджальна кіўнула. Потым яна прыўзнялася на дыбачкі, абняла аберуч маці за шыю і моцна-моцна пацалавала яе ў шчаку.

— Не бойся, мамачка! — прашаптала яна жанчыне на самае вуха. — Няхай глядзіць! Цябе я ім не аддам! Бо мне без цябе будзе сумна! Вельмі сумна!

І яна зноў пацалавала жанчыну ў шчаку.

*г. Чэрвень.*

# «ПРЫСЛУХОЎВАЕМСЯ ДА ЎСІХ ПРАПАНОЎ НАШЫХ СЛУХАЧОЎ...»

**4 верасня радыёстанцыя «Мінская хваля» адзначыць свой дзень нараджэння, ужо чацвёрты. Сённяшні госць «Звязды» — дырэктар тэлерадыёвяшчальнага прадпрыемства «Мінская хваля» Ігар ГАНЧАРУК.**

***— Ігар Сяргеевіч, як бы вы абазначылі крэда «Мінскай хвалі»?***

— Гэта радыё сталічнага рэгіёна, якое забяспечвае слухача аб'ектыўнай, разнастайнай і цікавай інфармацыяй. Мы працуем дваццаць чатыры гадзіны ў суткі, без выхадных. 90 працэнтаў насельніцтва Мінскай вобласці зараз мае магчымасць слухаць «Мінскую хвалю». У хуткім часе вяшчанне будзе наладжана паўсюль. У радыёстанцыі ёсць стабільнасць, шмат добрых напрацовак і, самае галоўнае, шырокая зваротная сувязь.

***— Ці вялікі творчы калектыў, які забяспечвае вяшчанне?***

— Калектыў невялікі, аднак надзвычай працаздольны, таленавіты — каля 20 журналістаў. Мы вельмі ўважліва прыслухоўваемся ў першую чаргу да ўсіх парад, заўваг і прапаноў слухачоў. І менавіта дзякуючы слухачу ў нас ствараюцца новыя перадачы і праекты. Вось і ў новым сезоне ў эфіры з'явіцца шмат навацый. Ужо звыкла на пачатку кожнай гадзіны будуць гучаць навіны. Атрымаюць трывалую прапіску новыя інфармацыйна-аналітычныя, забаўляльныя праграмы, павялічыцца выпуск спартыўных навін. Больш сучаснай, адметнай стане музычная афарбоўка нашых перадач. Па шматлікіх просьбах радыёслухачоў павялічваем працягласць і частотнасць у сетцы вяшчання канцэртаў па заяўках...

***— Якія перадачы «Мінскай хвалі» самыя рэйтынгавыя, папулярныя?***

— Найбольш рэйтынгавыя перадачы — перш за ўсё тыя, якія выходзяць у прамым эфіры, пабудаваныя на непасрэднай сувязі са слухачом, на інтэрактыве. Да ліку рэйтынгавых можна аднесці праграму «Дарэчы». Яна адметная тым, што паведамленне навін сталічнага рэгіёна адбываецца ў больш вольнай форме, у «нефармальным» выглядзе: гэта і аўтарскія меркаванні адносна тых ці іншых падзей, свабодная манера вядзення, да месца бывае таксама і гумар, іронія. Думаю, слухачоў зацікавіць і новы праект «Шчаслівая нядзеля» — перадача, пабудаваная на непасрэдным кантакце, дыялогу са слухачом. Сэнс такі: нягледзячы на цяжкасці жыцця, няварта апускаць рукі — усе складанасці можна і трэба перамагаць-пераадольваць.

***— Ці часта гучыць беларуская мова ў эфіры?***

— У Беларусі няшмат беларускамоўных FM-станцый. На нашай хвалі таксама пераважае рускамоўнае вяшчанне. Хоць сюжэты, звязаныя з культурай, гісторыяй, краязнаўствам у новым сезоне будуць часцей гучаць па-беларуску: усе журналісты добра ведаюць родную мову. Ды і сам я раней узначальваў беларускамоўную радыёстанцыю «Сталіца», люблю і паважаю родную мову. Абмяркоўваецца пытанне, каб **беларуская мова шырэй выкарыстоўвалася ў нашым інфармацыйным вяшчанні**.

***— Дзень беларускага пісьменства пройдзе 7 верасня ў Барысаве, адным з буйных гарадоў сталічнага рэгіёна. Ігар Сяргеевіч, магчыма, у гэты дзень вяшчанне будзе весціся на беларускай мове?***

— На свяце будуць працаваць нашы журналісты, у прамым эфіры падрабязна раскажам слухачам пра ўсе падзеі і мерапрыемствы. Абавязкова — на беларускай мове.

**Уладзімір СТАЛОВІЧ.**

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



## Усміхнёмся!

**Жонка — мужу:**

**— Нягоднік! Чаму, калі мы сварымся, ты ўвесь час маўчыш?!**

☺

Калі вы чакаеце гасцей і раптам заўважылі на сваім касцюме пляму, не засмучайцеся. Гэта папраўна. Напрыклад, плямы ад сланечнікавага алею лёгка выводзяцца бензінам. Плямы ад бензіну лёгка здымаюцца растворам шчолачы. Плямы ад шчолачы знікаюць ад воцатнай эсэнцыі. Сляды ад воцатнай эсэнцыі трэба пацерці сланечнікавым алеем.

Ну, а як выводзіць плямы ад сланечнікавага алею, вы ўжо ведаеце.

☺

**Мужчынская прымаўка «Каханне прыходзіць і сыходзіць, а есці хочацца заўжды» па-жаночаму гучыць так «Мужы прыходзяць і сыходзяць, а ўсё, што ў хаце, тое маё».**

☺

У аўтобусе:

— Малады чалавек, вы выходзіце?

— Ну, раз вы запрашаеце...



Здароўе на талерцы

# НІ ДНЯ БЕЗ ПАЧАТКА!

Адварыць пачатак кукурузы, абсыпаўшы соллю, і з'есці адным махам — задавальненне, знаёмае з дзяцінства. Хтосьці любіць кукурузу малочнай спеласці, хтосьці — больш спелую, з насычанымі і крыху жарсткаватымі зярняткамі. Выдатныя смакавыя ўласцівасці кукурузы прызнаныя ва ўсім свеце. У многіх нацыянальных кухнях прысутнічаюць свае стравы з гэтай расліны. Напрыклад, у Італіі з яе робяць паленту, а румыны і малдаване ганарацца сваёй кашай — мамалыгай. Бразільцы вараць пахкае піва і робяць гарэлку, а амерыканцы навучылі ўвесь свет жаваць поп-корн і кукурузныя шматкі.

Кукуруза змяшчае камедзь (высокамалекулярныя вугляводы, якія валодаюць абвалакальнай уласцівасцю), вітаміны групы В, вітамін Е, калій, фосфар, магній, жалеза, цынк. З зародкаў раслін выраблююць кукурузны алей, які запавольвае працэс старэння ў арганізме, а ненасычаныя тлустыя кіслоты, якія ўваходзяць у яго склад, здольныя паніжаць узровень халестэрыну ў крыві. Кукурузныя рыльцы павышаюць згусальнасць крыві і выкарыстоўваюцца як мача- і жаўцягонны прэпарат, кровасьпынальны сродак, таксама яны незаменныя пры халецыстыце, халангіце і гепатыце.



### КУКУРУЗА АДВАРНАЯ

Пачаткі кукурузы ачысціць ад лісця, варыць у салёнай вадзе прыкладна 30 хвілін і падаць гарачымі са сметанковым маслам і скрылікамі лімона.

### КУКУРУЗА ПАДСМАЖАНАЯ

Пачаткі кукурузы (лепш цукровай) ачысціць ад лісця, разрэзаць удоўж і падсмажыць на рашотцы ў гарачай духоўцы. Падаваць гарачымі, змазаўшы палавінкі маслам.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Лечымся без лекаў

# Яблычны воцат — на здароўе!

**Даказана, што яблыкі — эфектыўны сродак для прафілактыкі і лячэння атлусцення, яны зніжаюць засваенне тлушчаў, валодаюць нізкай каларыйнасцю, а наяўнасць у іх соляў калію садзейнічае вывядзенню з арганізма лішкаў вадкасці. Лічыцца, што ўсе карысныя ўласцівасці яблыкаў практычна без страт пераходзяць у яблычны воцат (маецца на ўвазе той, які прыгатаваны не фабрычным спосабам, а натуральны прадукт з добрых яблыкаў). Таму ўжо шмат стагоддзяў ён выкарыстоўваецца народнай медыцынай для лячэння многіх немачаў.**

● Яблычны воцат — натуральны спальвальнік тлушчу. *Каб пазбавіцца ад лішняй вагі,* яго варта прымаць у два прыёмы (2—3 ч. лыжкі на шклянку вады): па паўшклянкі за 30 хвілін да яды і непасрэдна перад ядой, а таксама — на ноч (1—2 ч. лыжкі на шклянку вады).

● Воцат прымяняецца і *для лячэння боляў у горле*. Некаторыя лекары рэкамендуюць паласкаць горла растворам — 1 ст. лыжка воцату на шклянку цёплай вады. Іншыя гатуюць сіроп супраць кашлю: злучаюць роўныя часткі мёду і яблычнага воцату і старанна размешваюць да поўнага растварэння мёду.

● *Пры гіпертаніі* карысна штодзень выпіваць па шклянцы вады з растворанымі ў ёй 2 ч. лыжкамі яблычнага воцату.



● *Ад моцнай стомленасці ў целе* дапамагаюць воцатныя расціранні: развядзіце 2 ст. лыжкі воцату ў шклянцы халоднай вады. Разатрыце растворам усё цела, заадно і цела памасіруеце.

● *Пры частай адрыжцы* народная медыцына рэкамендуе падчас яды прымаць наступную сумесь: 1 ст. лыжка воцату на шклянку вады + 1 ч. лыжка мёду.

● *Ад «расстройства» страўніка*, калі няма належных таблетак пад рукой, дапаможа наступны напой: 3 ст. лыжкі воцату развядзіце ў шклянцы вады. За дзень трэба выпіць 3 шклянкі.

● *Пры высокай тэмпературы, дрыжыках* змяшайце 1 частку гарэлкі і 1 частку яблычнага воцату. Намачыце ў растворы шарсцяныя наскі, адзеньце іх на ногі, ляжце ў пасцель і ўхутайцеся коўдрай.

● *Пры варыкозным расшырэнні венаў* змачыце сурвэткі ў неразведзеным яблычным воцаце, абгарніце імі ногі, зверху ўхутайце махровым ручніком. Трымайце кампрэс 30 хвілін.

● *Пры апёку* апрацоўваць пашкоджаную паверхню скуры неразведзеным воцатам.

● *Каб пазбавіцца ад барадавак*, прыгатуйце часночны воцат: ачысціце 3 зубкі часнаку і заліце 3—4 шклянкамі яблычнага воцату. Настойвайце 2 тыдні. Халодны кампрэс з прыгатаванага воцату прыкладайце да пашкоджаных участкаў скуры.

● Ванны з дабаўленнем яблычнага воцату цудоўна *здымаюць сверб пры экзэме, псарыязе, нейрадэрміце*. Прымаць ванну трэба 5—10 хвілін.

● *Пазбавіцца ад натоптыша* дапаможа хлебны акрайчык, змочаны ў яблычным воцаце, і прыкладзены на ноч да ступні ў выглядзе кампрэсу.

● Праціранне скуры растворам яблычнага воцату *пазбавіць твар ад прышчыкаў*. А паласканне валасоў воцатным растворам зробіць цуды з ломкімі, пасечанымі валасамі.

● Яблычны воцат — *для бадзёрасці*: штодзень раніцай выпівайце шклянку вады, развёўшы ў ёй 1 ст. лыжку воцату і 1 ч. лыжку мёду.

***Увага! Ужыванне яблычнага воцату ўнутр не рэкамендуецца пры гастрыце і павышанай кіслотнасці страўнікавага соку.***

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.23 | 19.52 | 13.29 |
| Віцебск — | 6.11 | 19.44 | 13.33 |
| Магілёў — | 6.13 | 19.43 | 13.30 |
| Гомель — | 6.12 | 19.37 | 13.25 |
| Гродна — | 6.39 | 20.07 | 13.28 |
| Брэст — | 6.42 | 20.05 | 13.23 |

**Месяц**

***Першая квадра.***

***Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

**Іменіны**

***Пр.*** *Аляксея, Апанаса, Васіля, Гаўрылы, Івана, Іларыёна, Ісака, Макара, Міхаіла, Фёдара.* ***К.*** *Ліліяны, Разаліі, Ружы, Майсея.*







## 4 верасня

**1925 год** — заснавана Беларуская сялянска-рабочая грамада, масавая легальная рэвалюцыйна-дэмакратычная арганізацыя працоўных Заходняй Беларусі. Дзейнічала да 1927 года.



**1882 год** — у Нью-Ёрку вынаходнік Томас Эдысан уключыў першае ў свеце камерцыйнае электрычнае асвятленне — усяго тады налічвалася 85 платных кліентаў.




***«Праўда іншы раз гнецца, але ніколі не ламаецца і ўсплывае паверх хлусні, як масла — паверх вады».***

**Мигель дэ Сервантэс (1547—1616), іспанскі пісьменнік.**

Ну і ну!

## АКУМУЛЯТАРА Ў АЎТО НЕ БЫЛО

Угоншчык чужога прыватнага аўто ў Полацку не мог, канешне, ведаць, што ў машыне, якую ён спрабаваў скрасці, няма акумулятара. «ВАЗ-21013», што належыць пенсіянеру, стаяў на вуліцы Свярдлова ля дома гаспадара. Зламыснік узламаў замок дзвярэй і трапіў у машыну. На аўто адсутнічала сігналізацыя. Потым «перавязаў» правады запалення і... Машына трывала стаяла на месцы. Міліцыянеры Дэпартамента аховы і ДАІ затрымалі няўдачлівага ўгоншчыка. Ім аказаўся 21-гадовы мясцовы жыхар — беспрацоўны, раней судзімы за крадзеж. Узбуджана крымінальная справа.

## СКРАЎ КАНЯ І З'ЕЎ?

У Лепельскім раёне ля вёскі Зялёны Востраў невядомы з загарадзі, якая ахоўвалася вартаўніком, скраў каня. Пра гэта кіраўніцтва мясцовай гаспадаркі паведаміла ў міліцыю. Праз некалькі дзён супрацоўнікі раённага аддзела міліцыі недалёка ад загарадзі знайшлі астанкі каня. У гаспадарцы страту ацанілі ў 1,4 мільёна рублёў. Канакраду, калі яго знойдуць, прыйдзецца адказваць за ўчыненнае злачынства.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# КЛЁВА!



Практыка

## ПРОСТА ПАЙДЗІЦЕ ЯК-НЕБУДЗЬ НА СУДАКА

«Проста пайдзіце як-небудзь...» Лёгка сказаць! Іншаму рыбалову гэтая рыба наогул ніколі не траплялася. Хіба толькі выпадкова. Але мы паспрабуем вам дапамагчы і сёння пойдзем на судака.

**Залатыя правілы:**

● Судак любіць мутныя, багатыя ежай вадаёмы; у рэчцы яго злавіць лягчэй, чым у возеры.

● Улетку судак лепш за ўсё бярэцца ўвечары і ўначы на мелкаводдзі, а зімою — апоўдні на глыбокай вадзе.

● Судак любіць пераменлівае надвор'е, калі сонечнае святло змяняецца воблачнасцю.

● На вялікія прынады ловяць буйнога судака, але не ў вялікай колькасці; на маленькія прынады бярэцца дробны, але шмат.

● Калі судак бярэцца, дык, як правіла, заходаў на прынаду бывае таксама шмат.

**Рыбалоўная скрыня**

● Спінінг даўжынёй 2,70—3,00 м з тэстам 10—40 г і цвёрдай вяршынькай.

● Сярэдняй велічыні безынерцыённая катушка.

● Не менш 150 м манафільнай лёскі дыяметрам 0,25 мм з малой расцяжымасцю і яркай афарбоўкай (жоўтай, зялёнай).

● Круглыя джыг-галоўкі для твістараў вагой 5—20 г з вострым, не занадта кароткім кручком.

● Твістар з двума хвосцікамі да 10 см і сіліконавыя рыбкі да 15 см. Афарбоўка прынады: грузілы-галоўкі — чырвоныя, твістары і сіліконавыя рыбкі — белыя, зялёныя, жоўтыя і чырвоныя.

Такім чынам, вы хочаце злавіць судака. Неабавязкова многа і неабавязкова буйных. Галоўнае, каб узяўся ваш першы судак. Лепш за ўсё лавіць свайго першага судака ў мутнай вадзе. Калі вашы спробы злавіць яго на сваім мясцовым вадаёме аказаліся няўдалымі, то, магчыма, яго там зусім мала, і калі ў вас сапраўды сур'ёзныя намеры, едзьце ў выхадныя дні на вялікую раку.

**Наперад, да ракі!**

На рэках мноства выдатных месцаў для рыбалкі: перамычкі, каменныя насыпы, порты... Паспрабуйце тут злавіць першага судака. Набярыцеся цярпення і старанна шукайце, але не дзесьці далёка, а ў некалькіх метрах ад сваіх ног. Большасць судакоў палююць прама на камянях. У канчатковым рахунку, узнагарода прыйдзе да вас у выглядзе першай рыбы, а там і другія возьмуцца.

**Твістар у падарунак**

У якасці прэзента для судака на сваю першую сустрэчу з ім вазьміце штучную прынаду. Лепш за ўсё лавіць на мяккія пластыкавыя. Іх можна набыць па невялікім кошце і да таго ж зэканоміць час на лоўлю жыўца. На маленькія твістары і сіліконавыя рыбкі памерам ад 7—10 см бярэцца большасць рыбаў. Падрыхтуйце белы твістар або сіліконавую рыбку з чырвоным грузілам-галоўкай. На іх судака ловяць ва ўсіх нямецкіх вадаёмах, і ў вас таксама ўсё атрымаецца.

**Без вертлюжка**

Прывяжыце твістар вузлом «клінч» (гл. малюнак) да асноўнай лёскі. Вертлюжок лепш не выкарыстоўваць, бо ён парушае прамы кантакт лёскі і прынады. Акрамя таго, твістары перамяшчаюцца па вадзе прама і не скручваюць лёску. Сталёвы ланцужок таксама перашкаджае ажыўленай гульні сіліконавай прынады. Яго варта выкарыстоўваць, мабыць, толькі на вадаёмах, дзе шмат шчупака.

**Цвёрдае вудзільна, цвёрдая лёска**

Для свайго першага эксперыменту вазьміце шрацінку ў якасці грузіла. Яна хутка тоне і пры ступеньчатай праводцы пастаянна падскоквае над дном. У месцах з нармальным цячэннем вагі ў 10—15 г будзе дастаткова. Судак амаль заўсёды бярэцца каля самага дна. Калі прынада занадта лёгкая, вы можаце не дасягнуць сваёй мэты. Вазьміце спінінг даўжынёй не больш трох метраў, па магчымасці, з цвёрдай вяршынькай, бо яна дазволіць адчуць кожную атаку гэтага драпежніка, хутчэй зрабіць падсечку, а значыць, і злавіць першага судака.

На маленькую безынерцыённую катушку наматайце жоўтую або зялёную, можна флюарэсцэнтную, лёску дыяметрам 0,25 мм. Дзякуючы светлай афарбоўцы лёску лепш відаць, дзе яна праходзіць у вадзе і дзе знаходзіцца твістар. Такім чынам вы можаце добра кантраляваць яго візуальна. Прадавец рыбалоўнага магазіна ахвотна парэкамендуе вам манафільную лёску з малой расцяжымасцю, якая дазволіць стварыць аптымальны кантакт з прынадай.

**Вольны стыль праводкі**

Лепш весці прынаду вельмі павольна, чым хутка. Цягніце свой твістар па грунце, дайце яму паскакаць на малых або вялікіх прыступках. Толькі сачыце за тым, каб ён не занадта высока падымаўся ад дна. І рашуча падсякайце нават пры самым нязначным нацяжэнні лёскі. Судак часцей за ўсё бярэцца вельмі асцярожна.

**Вуду ўверх**

Судака нярэдка ловяць каля звалаў або ўзвышшаў. Тут, натуральна, бывае досыць шмат зачэпаў. Іх будзе менш, калі прыпаднімаць уверх кончык вудзільна. Прыпаднятым кончыкам вы зможаце прымусіць сіліконавую прынаду слізгаць па камянях да вашых ног. І наперад — на першага судака! Выкарыстоўвайце простыя парады і вы дасягнеце свайго! Дарэчы, да з'яўлення твістараў і сіліконавых прынад, судак сярод спінінгістаў лічыўся рыбай амаль няўлоўнай. Раней можна было б параіць вам паспрабаваць лавіць на жыўца, што магло стаць вельмі сумным заняткам. Пры лоўлі ж на твістар вы вельмі хутка заўважыце, што паступова вывучылі шмат розных месцаў для рыбалкі. І навучыліся лавіць не толькі судака.

**Калі — чым — на якой глыбіні?**

*Студзень*

Перспектывы лоўлі ўмераныя — на буйную прынаду натуральнай афарбоўкі — лавіць на вельмі вялікай глыбіні.

*Люты*

Перспектывы лоўлі дрэнныя — на буйную прынаду натуральнай афарбоўкі — лавіць на глыбіні.

*Сакавік*

Перспектывы лоўлі добрыя — на светлую прынаду сярэдняга памеру — лавіць на сярэдняй глыбіні.

*Красавік*

Перспектывы лоўлі выдатныя — на прынаду сярэдняга памеру вельмі яркай афарбоўкі — лавіць на мелкаводдзі.

*Май*

Перспектывы лоўлі выдатныя — на каляровую прынаду сярэдняга памеру — лавіць на мелкаводдзі.

*Чэрвень*

Перспектывы лоўлі выдатныя — на светлую прынаду малога памеру — лавіць на сярэдняй глыбіні.

*Ліпень*

Перспектывы лоўлі добрыя — на прынаду натуральнай афарбоўкі і малога памеру — лавіць на працягу дня на глыбіні, увечары — на плыткаводдзе.

*Жнівень*

Перспектывы лоўлі добрыя — на прынаду натуральнай афарбоўкі і малога памеру — лавіць на працягу дня на глыбіні, увечар — на мелкаводдзі.

*Верасень*

Перспектывы лоўлі выдатныя — на прынаду натуральнай афарбоўкі і сярэдняга памеру — лавіць на сярэдняй глыбіні.

*Кастрычнік*

Перспектывы лоўлі добрыя — на прынаду натуральнай афарбоўкі і сярэдняга памеру — лавіць на глыбіні.

*Лістапад*

Перспектывы лоўлі ўмераныя — на прынаду натуральнай афарбоўкі і вялікага памеру — лавіць на глыбіні.

*Снежань*

Перспектывы лоўлі ўмераныя — на прынаду натуральнай афарбоўкі і вялікага памеру — лавіць на вельмі вялікай глыбіні.

Мінімальная даўжыня судака вагаецца ад 35 да 50 см. Нераст судака ў паўднёвых вадаёмах пачынаецца прыкладна з сярэдзіны красавіка, а ў паўночных — з сярэдзіны мая.







**СЯМ'Я ТВІСТАРАЎ**

*Лоўля судака на штучныя прынады, сапраўды, вельмі простая. Але часам адбываецца блытаніна ў паняццях.*

1. Вузел для твістара. Са слімой яшчэ мацнейшы.

2. Твістар з адным хвосцікам — гэта прататып усіх пластыкавых прынад. Яго можна было б назваць сіліконавым чарвяком.

3. Нават такая вялікая сіліконавая рыбка поўнасцю змяшчаецца ў пашчы судака; у горшым выпадку яна толькі пакамячыцца. Дарэчы, атрутна-зялёны колер — гэта проста клас!

4. Сіліконавую прынаду ў форме рыбкі завуць вібрахвастом Shad.

5. Судака ловяць на чырвоныя і жоўтыя джыг-галоўкі.





# ДУБ




**Дуб —** самае шаноўнае дрэва ў культуры ўсходніх славян. Дуб сімвалізаваў моц, крэпасць і мужнасць, быў надзелены станоўчым пачаткам. Дуб — сімвал устойлівасці, бо з'яўляўся воссю сусвету. Дзякуючы моцнай драўніне дуб стаў таксама сімвалам бессмяротнасці і даўгалецця. У адным з паданняў распавядаецца, што да з'яўлення злакавых культур старажытныя людзі выкарыстоўвалі ў ежу плады маладога дрэва — жалуды. У хрысціянстве дуб стаў сімвалам веры і дабрадзейнасці. Згодна з адным з паданняў, Ісуса Хрыста распялі на крыжы, які быў зроблены з дуба.

● Першыя ўспаміны пра ўшанаванне дуба датуюцца X—XII стагоддзямі. У працах Канстанціна Багранароднага ідзе гаворка аб тым, як нашы продкі — росы — здзяйснялі ахвяраванні каля разгалістага дуба.

● У культуры ўсходніх славян дуб выступаў дрэвам сусвету, касмічным дрэвам. У фальклорных тэкстах (казках, паданнях, замовах) дуб, які стаіць на востраве пасярод акіяна, на гары і г.д., азначаў цэнтр свету і сам свет. На працягу шматлікіх стагоддзяў дуб захаваў сваю значнасць і святасць як месца адпраўлення як народных, так і хрысціянскіх абрадаў. Нашы продкі раілі: ***«Если у тебя болит спина, прислонись к дубу, он тебе поможет. Прикоснись ладонями к его теплой шершавой коре, получишь силу от него непомерную. Испей воды у источника близ дуба лесного. Разуменье дадут девы вещие, что живут на том дубе. Но не трогай змея, спящего у корней его, не буди без надобности его необузданную силу. Жизнь будет счастливой если своим свадебным поездом трижды объедешь одиноко стоящий дуб».***

● Дуб заўсёды быў сімвалам мужчынскага пачатку. Пры ўваходзе ў хату жаніха, калі нявеста жадала, каб у яе нарадзіўся хлопчык, яна ціха казала: «Каля двара дубочкі, а ў хаце сыночкі».

● Бабка-павітуха павінна была абрэзаць пупавіну пасля нараджэння хлопчыка на дубовай дошцы, каб ён рос такім жа моцным, як дуб.

● Пасля купання хлопчыка ваду вылівалі пад дуб, тым самым жадаючы, каб дзіця было такім жа моцным.

● Дуб павінен быў змадэляваць жыццё і лёс дзіцяці. На Палессі існаваў звычай пасля нараджэння дзіцяці саджаць дуб. Часам дуб саджала само дзіця. Па тым, як расце дрэва, набірае моц, прадказвалі будучае дзіцяці. Калі дуб сох, гэта прадказвала цяжкае захворванне або смерць таго, у гонар каго было пасаджана дрэва.

● Знахары выкарыстоўвалі дуб як сімвал мужчынскага пачатку і бярозу як сімвал жаночага пачатку, каб аб'яднаць пару: неабходна было напаіць абаіх адварам са шчэпак ці травы, якую назбіралі на месцы, дзе разам раслі дуб і бяроза.

● Дуб выкарыстоўвалі і ў пахавальнай абраднасці. Справа ў тым, што нашы продкі выраблялі з драўніны дубу калодзежы, а пазней і крыжы, і труну. Адсюль і такія выразы, як «даць дуба», «адубець», «глядзець у дуб».

● У культуры ўсходніх славян распаўсюджана павер'е, што дуб, які расце каля хаты, у агародзе, «выжывае» са свету гаспадара хаты, г.зн. як толькі дуб вырасце, набярэ моц, з гаспадаром здарыцца няшчасце — дуб забярэ яго жыццёвую моц.

● Катэгарычна забаранялася саджаць дуб з жалудоў: «хто хоча мець у садзе і пры сядзібе дубовае дрэва, той не павінен вырошчваць яго з жолуда, а саджаць гатовае, таму што такі чалавек будзе жыць толькі да таго часу, пакуль дуб, які расце з жолуда, не падымецца да вышыні росту гэтага чалавека».

● З далёкіх часоў у народзе існавала катэгарычная забарона на зруб і спільванне дубоў. Лічылася, што любыя дзеянні (пілаванне, ламанне голля, нарыхтоўка сухога голля на дровы, абдзіранне кары з дрэва) могуць наклікаць няшчасце на гэтага чалавека, а часам і на ўсіх, хто жыве з ім побач.

● На Беларусі казалі, што спілаваны дуб плача крывавымі слязамі.

● Паўсюдна лічылася, што кінутая і спаленая ў печы галіна дуба можа выклікаць пажар.

● Калі стары дуб падаў, яго пакідалі гніць у лесе: ніхто не адважваўся прывезці яго на свой падворак.

● У той жа час лічылі: «хто будзе спаць на дубовых дошках, той будзе даўгавечны і здаравенны, як дуб».

● У народнай культуры дуб звязвалі і з Перуном — Богам-грамавержцам. Лічылася, што ў першую чаргу маланка і гром б'юць у дуб. Таму ў час навальніцы забаранялася знаходзіцца пад дубам, а таксама саджаць дуб у непасрэднай блізкасці ад хаты.

● У той жа час у народзе лічылі, што дом, пчальнік і іншыя гаспадарчыя пабудовы лепш за ўсё захаваюць ад маланкі невялікія крыжы, зробленыя з драўніны дубу, у які калісьці трапіла маланка, ці галінкі ад такога дуба.

● Дуб — магутны энергетычны донар, якога шырока выкарыстоўвалі ў народнай медыцыне. Каб «зняць» з дзіцяці такія цяжкія захворванні, як эпілепсія, рахіт, бяссонніца, дзіця «цягнулі праз дуб» — шчыліну, якая ўтваралася пасля ўдару маланкі, дупло, карэнне ці проста голле. Пасля гэтага шчыліну ці галлё неабходна было звязаць, аб'яднаць. З цягам часу, калі дрэва «зарастала», хвароба пакідала дзіця. На дубе неабходна было пакінуць якую-небудзь рэч дзіцяці, адзенне.

● Наяўнасць на дубе жалудоў набліжае яго да пладовых дрэў. Магічныя дзеянні супраць бясплоднасці праводзілі каля пладовых дрэў, у тым ліку і каля дуба. Жанчына павінна была пралезці ў шчыліну ў дубе, каб зацяжарыць.

● Каб спыніць дзіцячую смяротнасць у сям'і ці паставіць на ногі цяжка хворае дзіця, у ствол дуба (дупло ці спецыяльна зробленую шчыліну) клалі валасы ці пазногці хворага і нітку, якой яго мералі. Пасля гэтага шчыліну забівалі. Лічылася, калі дзіця вырасце вышэй за гэту рысу, яно пазбавіцца ад хваробы.

● Да дуба ішлі ў дзень летняга сонцастаяння. У народзе існавала павер'е: калі ў гэты дзень моўчкі пацерці правай рукой кару дуба, на працягу года дуб будзе ахоўваць цябе ад хваробаў.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.407 Індэкс 63850. Зак. № 4831. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12